беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Мінску штотыдзёва

НАША НІВА

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

выходзіць у панядзелкі

№ 11 (49)
27 траўня 1996 г.
панядзелак

ТЭЛЕПРАГРАМА

БІРЖА ПРАЦЫ

ПРАВЫ РЭВАНШ

ПРАВЫЯ КАНСЭРВАТАРЫ ЗАХАДУ ЯДНАЮЦЦА СУПРАЦЬ РАСЕЙСКАГА ЭКСПАНСІЯНІЗМУ

У Празе 11–12 траўня адбылася ўстаноўчая канфэрэнцыя міжнароднай арганізацыі Новая Атлянтычная Ініцыятыва (НАІ), якая сабрала вядомых лідараў палітычнага, эканамічнага й культурнага жыцьця краінаў Паўночнае Амэрыкі, Заходняе й Цэнтральнае Эўропы.

Удзельнікі дэкляравалі сваёй мэтай забесьпячэньне дэмакратычных традыцыяў ды прынцыпаў вольнага рынку ў пэрыяд "пасьля халоднай вайны". Ладзілі канфэрэнцыю пераважна прадстаўнікі кансэрватыўнага правага кірунку палітычнага істэблішмэнту.

"Голас папярэджаньня не аднойчы гучаў з чэскага боку, — заявіў прэзыдэнт Чэхіі Гавэл на адкрыцьці сходу. — Прыгадаем толькі верасень 1938 году, калі Зьвяз Чэскіх Пісьменьнікаў папярэджваў сусьветнае грамадзтва пра небясьпеку палітыкі саступкаў патрабаваньням Гітлера. Сёньня, пакуль яшчэ ня позна, дэмакратычныя ўлады павінны ўтварыць у Эўропе новы грамадзкі лад, які будзе адлюстроўваць агульныя карані ды спадчыну розных культураў, прынцыпы дэмакратыі, роўнасьці і правоў чалавека". Гэты новы лад, на думку чэскага прэзыдэнта, мае на увазе трансатлянтычную повязь Паўночнае Амэрыкі з Эўропай, паколькі ў іх глыбокія агульныя сувязі на цывілізацыйным узроўні.

У прыватнасьці, Гавэл заклікаў да пашырэньня NATO на ўсход і да пераразьмеркаваньня задачаў Паўночна-Атлянтычнага Зьвязу ў посткамуністычным сьвеце. Пры гэтым, аднак, прэзыдэнт Чэхіі адзначыў неабходнасьць сапраўднага партнэрства NATO з Расеяй ды выказаў пажаданьне, каб заклік да новай трансатлянтычнай ініцыятывы не напаткаў лёс маніфэсту чэскіх пісьменьнікаў 1938 году, на які адрэагавалі толькі тыя, хто ня меў уплыву на сусьветную палітыку.

У сваёй прамове перад удзельнікамі НАІ амэрыканскі сэнатар Кіл таксама падкрэсьліў агульную эўраамэрыканскую традыцыю павагі правоў ды годнасьці чалавека. Кангрэсмэн адзначыў, што хаўрусовыя дачыненьні Эўропы і Паўночнае Амэрыкі трэба ўмацоўваць, абмяжоўваючы пашырэньне сродкаў масавага зьнішчэньня ды будуючы сыстэму антыракетнай абароны.

Варта зацеміць, што некаторыя прадстаўнікі ЗША імкнуліся зьвесьці гутарку да абмеркаваньня праблемаў непашырэньня ядравай зброі. Але спрэчкі вакол NATO ня сьцішваліся ні на хвіліну.

Большасьць выступоўцаў турбавала пытаньне: які кошт давядзецца заплаціць за пашырэньне EU (Эўразьвязу) ды NATO, якім коштам абыходзіцца Эўропе дарагоўля працоўнай сілы і сацыяльных праграмаў заходніх краінаў? Адзначалася, што галоўным крокам да ліквідацыі цяперашніх супярэчнасьцяў павінна стаць аб'яднаньне Эўропы, стварэньне зонаў вольнага гандлю паміж EU а NAFTA (Паўночна-Атлянтычнай Зонай Вольнага Гандлю), гэта значыць — адмова ад ізаляцыянізму ды рух насустрач адзін аднаму.

Працяг на старонцы 4

5 ГАДОЎ ЯЗДЫ

Марылася пра гэта даўно. Яшчэ калі існавала імпэрыя...

У траўні 1991-га, пасьля цэлага году падрыхтоўкі і адмыслова для гэтага зьдзейсьненых пярэбараў у Вільню, дзе ў пачатку стагодзьдзя выходзіла газэта-папярэдніца, першы нумар новае "Нашай Нівы" нарэшце быў сабраны. Пісаўся ён у Вільні, Менску і Горадні, макетаваўся ў Менску, а друкаваўся ў Баранавічах.

Пасьля было шмат пераздаў, гарадоў, адрасоў. Безь перабольшаньня газэта рабілася і робіцца на колах.

А тады, сонечным травеньскім днём, Баранавічы сустрэлі нашу брыгаду парадам. Грымеў аркестар, маршавалі дзяўчаты ў трыко й караценькіх спаднічках, порстка выкрочвалі фізкультурнікі. Калі мы пад'ехалі да друкарні, проста на нас зь неба паляцелі парашутысты. Сярод усеагульнага мажору нашыя высілкі выглядалі амаль блюзьнерствам. Баранавічам — 120 гадоў!

З таго часу агульны мажор не супадае з танальнасьцю нашае працы.

Частку здымкаў у нумар давялося занесьці ў бліжэйшае фотаатэлье, каб зь іх зрабілі пазытывы, якіх не рабілі ў друкарні. Супрацоўнікі атэлье былі, мякка кажучы, зьдзіўленыя. Друкар-украінец прыняў нас за палякаў і моцна напінаўся гаварыць папольску.

Баранавічы праводзілі нас сьвяточным салютам, які грымеў аднекуль з-пад Літоўскага лесу.

У Менску ў Доме літаратара тымі днямі адбываўся Першы міжнародны кангрэс беларусістаў. Упершыню за доўгія гады ў Беларусь прыехалі тыя, хто ўсё жыцьцё насіў Беларусь у сэрцы. Мы сыпяшаліся. Спэцыяльна для прэзэнтацыі тысяча асобнікаў "НН" выйшла на адмысловай белай паперы.

Раніцою мы прывезьлі газэту ў зусім тады яшчэ новы будынак музэю Багдановіча.

Першыя асобнікі былі раздадзеныя каля помніка Багдановічу, дзе адбылася ўрачыстасьць з нагоды ўгодкаў ягонае съмерці. Пасьля газэту пабачылі ў Доме літаратара. 27 траўня 1991 году "Наша Ніва" адрадзілася.

Тады яшчэ існаваў СССР. Беларусяй яшчэ кіраваў ЦК КПБ, яшчэ не было войнаў у Югаславіі, Чачэніі, а ў Вільні ўжо была новая "Наша Ніва". Тады нас у Вільні было дастаткова. Хапала нам і ілюзіяў, і мараў. Адна мара зьдзейсьнілася — мы існуем ужо цэлых пяць гадоў...

Сяргей Харэўскі

Беларусь – Украіна

ПАРВАНЫЯ СУВЯЗІ

Пасьля ўсталяваньня рэжыму А.Лукашэнкі ў адносінах Беларусі з Украінай настала пара застою, а пасьля арышту ўкраінскіх грамадзянаў у Менску паміж былымі "рэспублікамі-сёстрамі", крый Божа, і ўвогуле пачнецца "халодная вайна"...

У мінулую сераду на пытаньні карэспандэнта "Нашай Нівы" Алега Дашкевіча адказаў першы сакратар пасольства Ўкраіны ў Рэспубліцы Беларусі Ўсевалад Колотій.

"НН": Спадар сакратар, што Вы ведаеце пра лёс грамадзянаў Украіны, арыштаваных падчас падзеяў 26 красавіка?

У.К.: Учора я сустракаўся са сьледчым Новікавым і пракурорам Менску Купрыянавым. Грамадзяне Ўкраіны абвінавачваюцца па-

Працяг на старонцы 2

КРУГЛЫ СТОЛ

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГІСТОРЫЯ СУСЬВЕТНАГА МАСТАЦТВА



1996 год адзначаны для культуры Беларусі падзеяй, якая стратэгічна паўплывае на разьвіцьцё гуманістыкі — зьявіўся першы інтэгральны курс гісторыі сусьветнага мастацтва: кніга Барыса Лазукі "Гісторыя мастацтваў".

Напрыканцы сваёй кніжкі ў сьпісе літаратуры Барыс Лазука ня змог прапанаваць аніводнае беларускае кніжкі пра небеларускае мастацтва. Гэта адэкватна адлюстроўвае сытуацыю. Увогуле, у беларускім мастацтвазнаўстве практычна не было традыцыі аналізу і, нават, рэпрэзэнтацыі замежнага мастацтва. Адлік такой традыцыі можна весьці з гэтага тому. Беларускі матэрыял тут прадстаўлены як частка сусьветнае культурнае спадчыны.

Да таго ж, кніга Барыса Лазукі зацьверджана ў якасьці навучальнага дапаможніка.

Выхаду "Гісторыі мастацтваў" прысьвечаны круглы стол спэцыялістаў-рэцэнзэнтаў у гэтым нумары "НН" на старонках 3 і 22.

навіны 1-м сказам.....

СПАД ВЫТВОРЧАСЬЦІ. Аб'ём прамысловай вытворчасьці ў Беларусі ў студзені-красавіку 1996 г. склаў 98,9 працэнта ў параўнаньні з адпаведным пэрыядам летась.

ВАКЦЫНАЦЫЯ. Пачынаючы з 13 траўня падчас масавай вакцынацыі супраць дыфтэрыі былі прышчэпленыя блізу 2.5 млн. чалавек. Вакцынацыя працягнутая да 31 траўня.

П'ЮЦЬ. Паводле зьвестак Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя беларускае насельніцтва спажывае на душу па 25 літраў сьпіртнога ў год замест нармальных 8. Беларусь перакрочыла рысу генэтычнае рызыкі.

УПІЛІСЯ. Нягледзячы на заклікі старшыні Магілёўскага аблвыканкаму да патрыятызму праз ужываньне выключна мясцовых напояў, Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод апынуўся на мяжы спыненьня. Прычына — затаварваньне неспажытай гарэлкай.

ВЫМІРАНЬНЕ. У Менску ў першым квартале сёлетні паказчык сьмяротнасьці аказаўся большым за леташні, а колькасьць навароджкаў паменшала на 5.8 працэнтаў.

ЗАБАСТОЎКА. У Магілёве ў знак пратэсту супраць чыноўніцкага "беспрадзелу" баставалі 50 камэрцыйных крамаў ды шапікаў.

ЗАБАСТОЎКА-2. У Нямеччыне з прычыны затрымак заробку ды спробаў урэзаць сацыяльныя выдаткі забаставалі працаўнікі камунальных службаў, сьмецяры, паштальёны ды іншыя бюджэтнікі.

БУНТ. У Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы за таго, што даўна не плацілі грошай, узбунтаваліся жаўнеры сталічнага гарнізону.

ПРЫРОСТ ВЫТВОРЧАСЬЦІ. Паводле меркаваньня Сусьветнага банку сёлета ў Расеі чакаецца прырост вытворчасьці, а ва Ўкраіне — у 1997 г.

РЭТРА. У Горадні, зусім як у старыя часы, пры працоўных калектывах адноўленыя саветы прафіляктыкі ды камісіі барацьбы з п'янствам.

НЯМА ДУРНЫХ. Латвія, Літва ды Эстонія адмовіліся ад прапановы Расеі далучыцца да СНГ.

Травеньскія дыскусіі

Прыкмета часу – аднаўленьне міжкантынэнтальных ідэалягічных дыскусіяў. Пік прыпаў на травень. Ці наш травень толькі фіксуе тэндэнцыю да ўзрастаньня напружанасьці?

У першай палове месяца адзін з найбуйнейшых амэрыканскіх палітолягаў Зьбігнеў Бжэзінскі агучыў сваё бачаньне пэрспэктываў Расеі. Сёньня гэтая дзяржава паводле асноўных эканамічных характарыстык займае ў сьвеце з 27 да 39 месца: паводле вытворчасьці працы, аб'ёму выпрабленай прадукцыі на чалавека, эфэктыўнасьці сельскай гаспадаркі... Паводле гэтых паказчыкаў Расея ня тое што ня звышдзяржава, але наагул разьвіцьцёвая краіна. Уплывовы патэнцыял Расеі экстэнсіўна сумарны – сваё значэньне маюць колькасьць насельніцтва й сыравінныя рэсурсы. Але калі браць пад увагу гэтыя паказчыкі, дык Расея ўжо саступае такім новым эканамічным гігантам як Бразылія, Індыя, Мэксыка. І калі названыя краіны – звышдзяржавы XXI ст., дык роля Расеі ўжо ў бліжэйшай пэрспэктыве – гэта роля другаснай дзяржавы зь вялізнаю тэрыторыяй ды вялізнымі сацыяльнымі праблемамі. Спробы мадэрнізацыі там ня мелі вялікага посьпеху.

Ужо ў сярэдзіне траўня ў Маскве прагучала вельмі жорсткая рэакцыя на выказваньні З.Бжэзінскага. На кангрэсе Асацыяцыі прамыславікоў і вытворцаў першы тэму супрацьстаяньня закрануў Аркадзь Вольскі. Галоўная ідэя выступу – абсалютная непрымальнасьць таго, што рэальна Расея ўжо не зьяўляецца звышдзяржаваю. Апроч эмоцыяў у беларуса Вольскага, калі ён бараніў прывідны вобраз Расеі, не было ніякіх аргумэнтаў. Гэта важны ўрок – патасная ідэя звышдзяржавы настолькі важная для расейскае сьвядомасьці, што аргумэнты ў прынцыпе не прадугледжваюцца. Аркадзь Вольскі назваў лічбы, якія прывёў З.Бжэзінскі. Назваў з абурэньнем, але не абвергнуў. Прэм'ер-міністар Расеі падтрымаў гэты крытычны патас.

Між тым, З.Бжэзінскі ўзяў лічбы з афіцыйнай справаздачы ААН пра вынікі 1995 г. А агучыў ён свае тэзы ў тым ліку на ўстаноўчай канфэрэнцыі Новай Атлянтычнай Ініцыятывы ў Празе. Сынхронныя ў часе дыскусіі ў Празе і Маскве сьведчаць пра тое, што адначасова з пошукам новага месца Эўропы ў сёньняшнім сьвеце адбываюцца спробы Расеі ідэалягічна замацаваць свае ранейшыя пазыцыі.

Для Праскай канфэрэнцыі НАІ наўмысна за правобраз быў узяты Эўрапейскі кангрэс 1949 году, які зарганізаваў Уінстан Чэрчыль. У 1949 было закладзенае новае вылічэньне Эўропы – ідэя эўрапейскай інтэграцыі, якая ўвасобілася ў структурах Эўрапейскага Зьвязу й Рады Эўропы. Цяпер жа адбываецца новая трансфармацыя, выкрышталізоўваецца новая канцэпцыя Эўропы – Атлянтызм, паводле якой Эўропа й Паўночная Амэрыка ўяўляюць сабою цэльны культурны, эканамічны, палітычны гіпэррэгіён. Гэта досыць жорсткая канцэпцыя, таму што ўсталёўвае палітычныя рамкі далучнасьці да антлянтычнай цывілізацыі.

Для Сярэдняй Эўропы гэта азначае ўваходжаньне ў Эўрапейскі Зьвяз і NATO. Ілюзіяў нэўтралітэту ў сёньняшняй Эўропе не застаецца. Дакладней, месца для гэткіх ілюзіяў не пакідаюць. Такім чынам, Новая Атлянтычная Ініцыятыва – гэта кампраміс: Заходняя Эўропа й Паўночная Амэрыка прызнаюць вынікі працэсаў эмансыпацыі Сярэдняй Эўропы, але выстаўляюць свае патрабаваньні да яе. Выбар для Беларусі звужаецца – альбо зьнікненьне пад далоняй Расеі, альбо прыняцьце цывілізацыйных правілаў Атлянтызму.

З гледзішча інтарэсаў Беларусі падсумуем вынікі траўня 1996-га:

– афармляецца новая дактрына нашай цывілізацыі – Атлянтызм; праблема нацыянальна-культурнай ідэнтычнасьці складнікаў гэтай цывілізацыі яшчэ будзе ўзьнятая;

– Расея трухлее;

– але вэрбальна застаецца агрэсіўнаю, што можа ўвасабляцца ў рэальную палітыку.

Алег Дзярновіч

Краіна

НАСЕЛЬНІЦТВА. Міністэрства статыстыкі падало апошнія зьвесткі пра колькасьць жыхароў у гарадах Беларусі. На пачатак году былі наступныя лічбы: Менск – 1700 тысяч, Гомель – 512, Магілёў – 367, Віцебск – 365, Горадня – 302, Берасьце –293, Бабруйск – 227, Баранавічы – 172, Барысаў – 153, Ворша – 134, Пінск – 130, Мазыр – 108, Салігорск ды Ліда – па 101 тысячы жыхароў. Гэта паказчыкі для буйнейшых (з насельніцтвам звыш 100 тыс.) гарадоў. Сярод меншых карціна такая: Наваполацак ды Маладэчна – па 97 тысяч, Полацак – 87, Сьветлагорск – 76, Рэчыца – 71, Жлобін – 69, Слуцак – 63, Слонім – 53, Жодзіна – 60, Кобрын – 52 тысячы чалавек.

ЖЫТЛО. Кабінэт міністраў сваёй пастановай №623 унёс асобныя зьмены ў правілы карыстаньня жылымі памяшканьнямі. Цяпер грамадзяне пры адсутнасьці на месцы сталага жыхарства тэрмінам болей за 10 дзён вызваляюцца ад аплаты за камунальныя паслугі й газ. Вызваленьне ад аплаты робіцца пры ўмове, што ў вас дома няма лічыльнікаў вады й газу і пры наяўнасьці дакумэнтаў (даведак, імянных праязных дакумэнтаў і г.д.), што пацьвярджаюць вашую адсутнасьць. Для тых, хто выяжджае за мяжу, такім пацьверджаньнем будуць адзнакі пра перасячэньне мяжы. Усе гэтыя дакумэнты трэба пасьля вяртаньня прадставіць у свой ЖЭС. Калі вы плянуеце зьехаць болей як на 3 месяцы, то пра гэта трэба загадзя пісьмова папярэдзіць ЖЭС. Новыя правілы не датычаць аплаты за кватэрную плошчу, ацяпленьне, тэлефон, радыёкропку, калектыўную антэну. Для даўжнікоў указ прадугледжвае адключэньне вады й газу.

ЖАХІ РЫНКАВАГА САЦЫЯЛІЗМУ. Місія Сусьветнага Банку (СБ) на працягу месяца вывучала эканоміку Беларусі. Паводле вынікаў была падрыхтаваная справаздача. Як сказаў галоўны экспэрт штаб-кватэры СБ Джон Хансэн, у Беларусі ёсьць драматычныя сьведчаньні развалу эканомікі. У гандлёвым дэфіцыце краіна дасягнула ўзроўню самых бедных краінаў сьвету, што маюць найбольшы зьнешні доўг. Толькі сёлета ў першым кварталe ён быў роўны гадавому леташняму. Палова банкаў краіны церпіць страты. Беларускія прадпрыемствы ўсё менш канкурэнтаздольныя, іх фінансавае становішча істотна пагаршаецца. Амаль усе экспартэры таксама церпяць страты. Джон Хансэн лічыць, што прычыны гэтага – зьніжэньне эфэктыўнасьці працы прадпрыемстваў, палітыка гандлёвых партнэраў ды неадпаведны абменны курс валютаў. Ён лічыць, што палітыка ў галіне абменнага курсу – самая істотная прычына зьніжэньня канкурэнтаздольнасьці.

«ХРУШЧОБЫ». Апроч свайго непрывабнага выгляду ды бытавых нязручнасьцяў, асноўным недахопам «хрушчобаў» была іх неэфэктыўная цеплаізаляцыя. У большыні ўсіх такіх дамоў у ацяпляльны сэзон на вуліцу выходзіць да 60-65% цеплавой энэргіі. Асабліва там, дзе батарэі замураваныя ў сьцяну. Таму вырашана зрабіць захады для пакрыцьця такіх дамоў спэцыяльнай цеплазьберагальнай ізаляцыяй.

У гэтай справе нам дапамогуць немцы. Яны вылучылі дзеля правядзеньня экспэрымэнтальных работ 300 тыс. дойчмарак. Да пачатку ацяпляльнага сэзону ў Менску плянуецца пакрыць адзін з дамоў на праспэкце Пушкіна адмысловымі цеплаізаляцыйнымі панэлямі. Гэта дазволіць жыхарам удвая меней плаціць за ацяпленьне, бо ў абноўленым доме на абагрэў будзе выдаткоўвацца ўдвая меней энэргіі. У залежнасьці ад вынікаў экспэрымэнту будзе вырашаны лёс яшчэ больш за 20 тыс. «хрушчовак» па ўсёй Беларусі.

ВОГНЕННАЯ ВАДА. Аказваецца КГБ можа ня толькі паляваць на паэтаў, а спэцпадразьдзяленьне «Альфа» – дубасіць дэманстрантаў. Як паведаміла газэта «Зьвязда», нядаўна ўправа КГБ у Гарадзенскай вобласьці правяла даволі буйную апэрацыю. Чэкісты разам з «альфаўцамі» штурмам узялі офіс расейскай фірмы, што знаходзілася ў гарадзенскім гатэлі «Турыст» і мела склад на базе «Белбакалея». Чаму давялося штурмаваць офіс, ды яшчэ ў гатэлі, не паведамляецца. Але КГБісцкі чын сказаў, што апэрацыя праводзілася з мэтаю спыненьня незаконнай дзейнасьці камэрцыйных структураў, што асьмеліліся ня выканаць указ прэзыдэнта за нумарам 120. Былі затрыманыя 8 чалавек. Арыштавана блізу 2 млн. літраў амэрыканскага сьпірту «Роял», для перавозкі якога спатрэбілася 6 некалькі дзясяткаў вагонаў. Першая партыя на 10 грузавіках ужо была гатовая для адпраўкі ў Расею, каб там ператварыцца ў «Рускую» ды «Маскоўскую» гарэлку. Кошт затрыманага сьпірту склаў недзе 4 млн. даляраў. Калі пералічыць гэта на душу насельніцтва, то на кожнага жыхара нашай краіны прыпадзе па 200-грамовай шклянцы сьпірту.

МАШКАРА. Многія раёны Беларусі патрапілі пад нашэсьце машкары. Зафіксавана ўжо некалькі выпадкаў гібелі свойскай жывёлы. Асабліва церпяць ад гэтай навалы коні ды каровы. Машкара набіваецца жывёле ў дыхальныя шляхі, закупорваючы іх і тым самым выклікаючы сьмерць ад удушэньня. А ўкусы мошак вядуць да адмысловага захворваньня, што выклікае ў жывёлаў ацёкі падскурнай клятчаткі ды лёгкіх. Церпяць ад жамяры і людзі.

Спэцыялісты тлумачаць такі наплыў машкары надзвычай спрыяльнымі ўмовамі для іх размнажэньня – гарачым надвор'ем пасьля моцных дажджоў. Найбольш актыўныя мошкі ўвечары – ад 17-ай да 22-й гадзіны. Чакаецца, што праз пару тыдняў уся гэтая поскудзь павінна зьнікнуць сама сабою.

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік

заснаваны ў 1906,
адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец
рэдактар
адказны сакратар
мастацкі рэдактар
навіны
рэдактар дадатку "Інфарматар"
макет
мантаж
набор
стыліст
карэктура
пры ўдзеле
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі
(тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Падпісны індэкс 63125

НАША НІВА

Павал Жук
Сяргей Дубавец
Алег Дзярновіч
Сяргей Харзўскі
Уладзімер Бараніч
Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
Іна Жызьнеўская
Тацяна Чуйвід
Антон Кузьміч
Сяргей Сматрычэнка
Сяргея Шупы
Зьміцер Бартосік

Тэл./факс 36-76-75

ПАРВАНЫЯ СУВЯЗІ

Працяг са стар. 1

сьледчым Новікавым і пракурорам Менску Купрыянавым. Грамадзяне Ўкраіны абвінавачваюцца паводле арт. 186(3) і 188(1) КК РБ. Пракурор паведаміў мне, што сьледзтва, магчыма, будзе закончана ў сярэдзіне чэрвеня. Усе ўкраінцы цяпер знаходзяцца ў ізалятары часовага ўтрыманьня.

"НН": Ці сустракаліся Вы зь імі?

У.К.: Ад самага пачатку сьледчы запэўніў мяне, што для сустрэчы з грамадзянамі Ўкраіны ніякіх праблемаў ня будзе. Аднак пасьля мне ў катэгарычнай форме сказалі, што пракурор дазволу не дае...

"НН": На якой падставе?

У.К.: Ніякія падставы названыя не былі. Мне рэкамэндавалі зьвярнуцца ў МЗС РБ. Што я і зрабіў учора, падрыхтаваўшы адпаведную ноту.

"НН": Як Вы думаеце, ці гэты выпадак прывядзе да абвастрэньня адносінаў паміж Беларусяй і Ўкраінай?

У.К.: Міждзяржаўныя адносіны не павінны парушыцца. Мы імкнемся ўсе пытаньні ў абароне інтарэсаў сваіх грамадзянаў вырашаць канструктыўна, так, каб гэта ніякім чынам не адбілася на нашых узаемаадносінах.

"НН": Што, па-Вашаму, стала прычынай катэгарычнай адмовы пракурора?

У.К.: Яшчэ з 26 красавіка, калі я стаў займацца справай затрыманьня нашага народнага дэпутата Юрыя Тымы ў Баранавічах, я адчуў нейкую "працяжку". Мы ставім пытаньне, праходзіць дастаткова працяглы час, з горам папалам атрымваем адказ. І увесь час гэта цягнецца, цягнецца... Няма канструктыўнага дыялёгу. Хоць я ня бачу ніякіх сур'ёзных прычынаў для таго, каб адмовіць мне ў сустрэчы. Ёсьць консульскі статут Украіны, распрацаваны на падставе Венскай консульскай канвэнцыі, дзе зусім выразна напісана, што я маю права праводзіць сустрэчу з затрыманымі і арыштаванымі ўкраінскімі грамадзянамі.

"НН": У чыёй усё ж кампэтэнцыі гэтае пытаньне — МЗС ці МУС? Калі я ў справе арыштаваных украінцаў зьвяртаўся ў МУС, мяне адпраўлялі ў МЗС, а адтуль назад, у МУС...

У.К.: Наколькі я разумею гэтую сытуацыю, рашэньне залежыць ад кіраўніцтва генэральнай пракуратуры Беларусі. Прынамсі, так мне сказалі ў пракуратуры Менску.

"НН": Тое, што затрыманыя грамадзяне Ўкраіны належаць да арганізацыі УНА-УНСО, мела нейкае вызначальнае значэньне ў паводзінах беларускага боку?

У.К.: Афіцыйна мне заявілі, што ўзбуджаная справа — чыста крымінальная. Але потым адзін з супрацоўнікаў пракуратуры ўсё ж прызнаў, што яна мае вельмі выразную палітычную афарбоўку. Што тычыцца мяне як консульскага работніка, то для мяне неістотна, да якой палітычнай арганізацыі гэтыя грамадзяне належаць. Яны найперш грамадзяне Ўкраіны, і мой сьвяты абавязак бараніць інтарэсы грамадзянаў Украіны.

"НН": Да гэтага моманту адносіны Ўкраіны і Беларусі складаліся невыразна. Яны быццам былі, быццам не былі... Як вы думаеце, што будзе цяпер?

У.К.: Адносіны сапраўды былі млявыя. Беларусь больш зарыентаваная на Расею, на эканоміку Расеі. А адносіны з Украінай, нягледзячы на тое, што мы вельмі актыўна стараемся іх палепшыць, на вялікі жаль, не на жаданым узроўні.

"НН": Гэта значыць, беларускі бок аддае поўную перавагу Расеі?

У.К.: Без сумневу. Але і адносіны з Украінай таксама маглі б быць значна больш актыўныя. У сфэры эканомікі найперш. У нас шмат агульнага, Украіна мае свае магчымасьці. Украінскія прадпрыемствы і прадпрымальнікаў цікавіць цэлы шэраг відаў прадукцыі, якія выпрабляюцца ў Беларусі. Але, на жаль, многія пытаньні — цэнаўтварэньня, напрыклад, ці падаткаў — зусім не адладжаныя. Скажам, купляць беларускі трактар за 14 тыс. даляраў... Прабачце, які ўкраінскі калгас зможа гэта зрабіць? І калі беларуская лядоўня каштуе каля 400 даляраў, то можна трошкі падкапіць і набыць Samsung.

Але тут, напэўна, ёсьць яшчэ і схаваны бок. Рэч у тым, што паміж камэрцыйнымі структурамі Ўкраіны і Беларусі цудоўныя адносіны і йдзе вельмі актыўная праца. Паводле маіх неафіцыйных зьвестак існуе 300 сумесных прадпрыемстваў, а паводле афіцыйных — лічаныя. Напрыклад, цяпер вырашалася пытаньне зборкі аўтамабіля "Таўрыя" ў Беларусі, хаця б для інвалідаў. Але пакуль, на жаль, як я зразумеў, дарогу перабег "Форд". Ці будзе "Форд" у Беларусі — гэта пытаньне. Дай Бог, каб ён быў. Але і ад "Таўрыі" ня варта было адмаўляцца, хоць бы з гледзішча цэнаўтварэньня.

"НН": Якая рэакцыя грамадзкасьці Ўкраіны на інцыдэнт з арыштам украінцаў у Менску?

У.К.: Наколькі мне вядома, у пасольства Беларусі ва Ўкраіне ідзе вельмі шмат лістоў, тэлефонныя званкі, праводзіліся пікеты. Увага вельмі вялікая. Ды і мне тут тэлефануюць беларускія людзі. Напрыклад, кажа: "Я проста чалавек, я ведаю, што ў ізалятары на Валадарскага 2 знаходзяцца грамадзяне Ўкраіны. Скажыце, як мне перадаць ім прадуктовую пасылку?" Такіх званкоў толькі за сёньня было дзясяткі два. Гэта ня нейкая арганізаваная кампанія. Проста людзі хочуць дапамагчы. Яны падтрымваюць гэтых грамадзян.

"НН": Як Вы думаеце, улады Беларусі настроеныя вырашыць справу жорстка?

У.К.: Паводле маіх неафіцыйных зьвестак, ёсьць намер максымальна выкарыстаць актыкулы абвінавачаньня — да трох гадоў пазбаўленьня волі.

"НН": Калі такое адбудзецца, як на гэта будзе рэагаваць украінскі бок?

У.К.: Не станоўча. Людзі былі пакараныя ў адміністратыўным парадку, адсядзелі ад 8 да 15 сутак, каму колькі вызначыў суд, а цяпер атрымваецца за тое самае, але ўжо паводле Крымінальнага кодэксу.

"НН": Ці існуе магчымасьць, каб справу арыштаваных украінцаў перадалі ўкраінскаму боку?

У.К.: Не, гэта адназначна. Адно пасьля рашэньня суда на хадайніцтва ўкраінскага боку іх могуць для адбыцьця пакараньня перадаць Украіне.

"НН": А якая рэакцыя з-за межаў Беларусі і Ўкраіны?

У.К.: Я магу меркаваць толькі з аднаго. Да мяне зьвярталіся прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі Ўкраіны, Беларусі, Балтыі, Нямеччыны і г.д., але ад сродкаў масавай інфармацыі Расеі ніводнага пытаньня не паступала. Гэта ў пэўнай ступені характарызуе агульную сытуацыю.

Першая беларуская гісторыя мастацтваў

1996 год адзначаны для культуры Беларусі падзеяй, якая стратэгічна паўплывае на разьвіцьцё гуманістыкі — зьявіўся першы інтэгральны курс гісторыі сусьветнага мастацтва. Таму — спачатку пра зьяву.

Напрыканцы сваёй кніжкі ў сьпісе літаратуры Барыс Лазука ня змог прапанаваць аніводнае беларускае кніжкі пра небеларускае мастацтва. Гэта адэкватна адлюстроўвае сытуацыю. Увогуле, у беларускім мастацтвазнаўстве практычна не было традыцыі аналізу і, нават, рэпрэзэнтацыі замежнага мастацтва. Адлік такой традыцыі можна весьці з гэтага тому. Беларускі матэрыял тут прадстаўлены як частка сусьветнае культурнае спадчыны.

Да таго ж, кніга Барыса Лазукі зацьверджана ў якасьці навучальнага дапаможніка. Маюцца пэўныя дыдактычныя якасьці: ва ўсім тэксьце дадзеныя спасылкі на тэрміны, разгорнуты й падрабязны слоўнік якіх знаходзіцца ў канцы кнігі; ужо згадваўся сьпіс літаратуры.

Нейкая насьцярожанасьць узьнікае паступова, падчас азнаямленьня з кнігаю. Першаю трапляе на вока недастатковая выверанасьць подпісаў пад ілюстрацыямі. Напрыклад, у тэксьце імя аўтара «Ляакаону» перадаецца паводле ўсходняй традыцыі як Афінадор, а подпіс пад ілюстрацыяй перадае імя скульптара больш традыцыйна — Атэнадор. Можа, тут праявілася не карэктарская памылка, а сьветапоглядная падвоенасьць — з розных крыніцаў бярэцца рознае напісаньне, а нацыянальны дыскурс не ўсталёўваецца.

Але асобныя памылкі — гэта дэталі ў параўнаньні з канцэптуальнымі хібамі ў падмурку апісаньня гісторыі мастацтва — у дэфініцыях і пэрыядызацыі. Найперш выклікае нязгоду разгляд мастацтва Эўропы пасьля XVI ст. не паводле стыляў альбо паводле цывілізацыйнага падыходу, а па стагодзьдзях: «Мастацтва Заходняй Эўропы XVII ст.», «Мастацтва Беларусі XVII ст.», Мастацтва Заходняй Эўропы XVIII ст.», «Мастацтва Беларусі XVIII ст.». Такі падзел цалкам вынікае з савецкай, а яшчэ глыбей — з расейскай традыцыі пэрыядызацыі расейскага мастацтва.

Кампраміс дапушчаны зь беларускім мастацтвам. Яно ўжо не падмяняецца тэрмінам «старажытнарускае мастацтва», але вынаходзіцца новы эўфэмізм «Мастацтва старажытных зямель Беларусі» — тэрмін невыразны й навукова некарэктны, ім ахопліваецца пэрыяд да канца XVI ст. Гэта працяг масквацэнтрычнай канцэпцыі пазьбяганьня стыляў, якіх не было ў Расеі. Усё ж здаецца, што ў дыдактычных мэтах найбольш плённы параўнаўчы мэтад вывучэньня сусьветнага мастацтва, калі мастацтва сваёй краіны не заганяецца ў рэзэрвацыю, а прысутнічае як раўнацэннае зьява ў сусьветным мастацтве. Паводле такога прынцыпу прыклады да сыстэмных агульнастылёвых зьяваў падаюцца з розных нацыянальных мастацкіх традыцыяў, у тым ліку зь беларускае.

Тым ня менш, блёк пра беларускае мастацтва дастаткова прымальны ў тым сэнсе, што можа выклікаць плённыя дыскусыі.

Адносна іншых заўвагаў — здаецца, я зразумеў вытокі трываласьці савецкіх традыцыяў агляду мастацтва ў беларускай «Гісторыі мастацтваў». Гэткае вынікае з фундамэнтальных паглядаў на самое мастацтва. Барыс Лазука цалкам паўтарае Марксаву тэзу пра тое, што мастацтва — гэта «ўвасабленьне рэчаіснасьці ў плястычных, зрокавых формах». Пры такім падыходзе застаецца няшмат месца ўласна для самога мастацтва.

Той жа матэрыял, які апісвае аўтар, маніфэстуе пра іншае — пра асобу творцы. Узьнікае двухсэнсовасьць. У такім разе адно з выйсьцяў — абаперціся на аўтарытэт, на традыцыю. Самая даступная сёньня ў Беларусі традыцыя — савецкая.

І вось «Гісторыя мастацтваў» балянсуе паміж савецкімі прынцыпамі й канфліктам зь імі.

Алег Дзярновіч

Генадзь Сакалоў-Кубай

Кніга-неспадзяванка

Наша культура знаходзіцца ў такой стадыі разьвіцьця, дакладней, у такой ступені заняпаду, што амаль любое наша выданьне з гісторыі мастацтва, культуры, мае статус «упершыню», а аўтары адпаведна называюцца «першапраходцамі», «піянэрамі», для якіх нарыхтаваныя толькі станоўчыя ацэнкі з агаворкамі накшталт «але гэтыя недахопы не зьніжаюць вартасьць выданьня»...

«Гісторыя мастацтваў» Б.Лазукі, паводле анатацыі, — «першае ў нашай дзяржаве выданьне гісторыі беларускага і сусьветнага мастацтва на беларускай мове, матэрыял якога прызначаны для выкарыстаньня ў школе». Падрыхтаваны матэрыял «з улікам новых досьледаў у галіне гісторыі і мастацтвазнаўства». Ужо гэтых намераў выдаўцоў і самога факту выхаду кнігі з друку дастаткова, каб лічыць выхад «Гісторыі мастацтваў» падзеяй. А свой скептыцызм я грунтую на наступным.

На мой погляд, сёньня ў нашай краіне няма спэцыяліста, які б адзін у сьціслыя тэрміны мог якасна падрыхтаваць настолькі складаную рэч, выканаць працу, якая б задаволіла і выкладчыкаў, і навучэнцаў — у мэтадычным пляне, і навукоўцаў — тэарэтычным узроўнем, сучасным поглядам на працэсы і зьявы мінуўшчыны. Дадамо — падрыхтаваць без шырокага абмеркаваньня ў прафэсійным асяродзьдзі. А менавіта так і здарылася. Кніга-неспадзяванка.

У якасьці ўзору для параўнаньня я прапаную блізкае характарам эстонскае выданьне «Кніга пра мастацтва для моладзі» (1984).

Структура дапаможніка наступная: Уводзіны, 11 разьдзелаў гісторыі мастацтва, Слоўнік тэрмінаў і Сьпіс літаратуры. Слоўнік тэрмінаў без ілюстрацыяў, даволі падрабязны. Яго адметнасьць — уключэньне спэцыфічных беларускіх тэрмінаў побач з эўрапейскімі і расейскімі. Слоўнік тэрмінаў эстонскай «Кнігі...» праілюстраваны 85 малюнкамі, схемамі, красьлюнкамі.

Сьпіс літаратуры ўключае практычна толькі расейскамоўныя савецкія выданьні пасьляваеннага часу. Тут няма кніг па-ўкраінску і па-польску, якімі шыкора карыстаюцца беларускія гісторыкі мастацтва. Няпоўна прадстаўлена літаратура пра беларускае мастацтва. Эстонская «Кніга...» сьпісу літаратуры не дае. Затое мае індэкс імёнаў — Слоўнік мастакоў, якія згадваюцца ў тэксьце. Затым у «Кнізе...» разьмешчаны 4 мапы: Мэсапатамія, Эгіпэт, Грэцыя, Эўропа, — з указаньнем асноўных цэнтраў мастацтва. Завяршаюць «Кнігу...» тры ілюстраваныя табліцы, дзе ў храналёгіі паказаныя пэрыяды гісторыі мастацтва.

Наконт канцэпцыі ў анатацыі «Гісторыі...» заяўлена: «беларускае і сусьветнае мастацтва». Насамрэч, гэта традыцыйная трыяда савецкіх часоў: «замежнае, расейскае, беларускае». На мой погляд, аптымальная структура для такога дапаможніка: замежнае, нацыянальнае і мастацтва нашых суседзяў, а гэта, апрача Расеі, — Украіна, Польшча, Літва, Латвія. Праўда, матэрыял пра Ўкраіну ў «Гісторыі...» ёсьць, але гэта толькі Кіеў у, як вы самі здагадаліся, разьдзеле «Старажытна рускае мастацтва». Між тым, удалыя прыклады прапанаванай намі канцэпцыі ёсьць у новых падручніках гісторыі Беларусі, напрыклад, у кнізе Г.Штыхава для 10 клясы (1994).

Што да згадкі пра «ўлік новых дасьледаваньняў», то гэта звычайны блеф, што пацьвердзіла пэрыядызацыя матэрыялу. У анатацыі сказана, што «гісторыя мастацтва разглядаецца ў адпаведнасьці з мастацкімі стылямі». Насамрэч аўтар паўтарае заганную традыцыю савецкай школы, якая, у сваю чаргу, абапіралася на традыцыі пэрыядызацыі расейскага мастацтва. Вытокі гэтай зьявы наступныя: візантыйскі стыль, які прыйшоў да ўсходніх славян разам з хрысьціянствам, дамінаваў у расейскім мастацтве да канца XVII ст. Адна з прычынаў — культурная самаізаляцыя з XIV-XV ст. У выніку Масковію глыбока не закранулі ня толькі раманіка, готыка, рэнэсанс, але й барока, якое шырока на прафэсійным узроўні пачынаецца фактычна з XVIII ст. і пераважна ў Пецярбурзе і навакольлі.

Візантыйскі стыль, таксама як раманіка і готыка, — гэта стыль сярэднявечча (V-XV ст.). Такім чынам, гісторыя мастацтва пацьвярджае, што дапятроўская Масковія існавала ў прасторы дарэнэсансавай культуры, гэта значыць, сярэднявечча. Ужо ў XIX ст. быў сканструяваны тэрмін «древнерусский стиль» — этнахраналягічны гібрыд — сынонім візантыйскага стылю, які ўжываецца для вызначэньня прафэсійнага мастацтва на тэрыторыі ўсходніх славянаў XI-XIII ст. і Маскоўскай Русі XIV-XVII ст. Гэта адпавядае імпэрскай ідэалёгіі Расеі, бо ў выніку такой тэрміналягічнай маніпуляцыі мастацтва Ўкраіны й Беларусі аказвалася «древнерусским». Адначасова зручна маскуюцца 200 гадоў «затянувшегося средневековья» Масковіі. Не дадумаліся ж французы раманскі і гатычны стылі назваць старажытнафранцускімі, хоць аргумэнтаў для гэтага мелі больш чым дастаткова.

Вэрмэер Дэльфцкі. У майстэрні мастака.

Але вернемся да пэрыядызацыі. Пазастылёвая пэрыядызацыя ці то паводле марксісцкіх «грамадзка-палітычных фармацыяў», ці то шляхам мэханічнага падзелу часу на стагодзьдзі пазбаўляе беларускую мастацкую культуру яе эўрапейскасьці, прыналежнасьці да агульнага эўрапейскага сьвету на працягу ўсёй паўтаратысячагадовай гісторыі беларускага этнасу.

Пэрыядызацыя мастацтва, якое прынята называць «замежным», таксама эклектычная. А што з пэрыядызацыяй у эстонскай «Кнізе...»? Яна наступная: уводзіны, дагістарычнае мастацтва, мастацтва Мэсапатаміі, Эгіпту, эгейскае, грэцкае, этрускае, рымскае, раньнехрысьціянскае, візантыйскае, старарускае (даніна палітычным абставінам), мастацтва мэравінгаў і каралінгаў, раманскае, гатычнае, рэнэсансу, барока, ракако, клясыцызму, рамантызму, рэалізму, імпрэсіянізму, постімпрэсіянізму, югендстыль (у расейскамоўнай традыцыі звычайна — мадэрн), сымбалізм, новае мастацтва (фавізм, экспрэсіянізм, кубізм, футурызм, сюррэалізм, абстракцыянізм, поп-арт), наівізм, скульптура XX ст., архітэктура XX ст., савецкае мастацтва. Заўважым — не сацрэалізм, а больш дакладна, бо нават афіцыйнае савецкае мастацтва асабліва ў 60-я гады ўжо не ўяўляла сабою адзінага цэлага.

Возьмем для азнаямленьня некалькі раздзелаў «Гісторыі...». Напрыклад, — раманскае мастацтва. Характар выданьня (вучэбны дапаможнік) патрабуе найперш лягічнай структура артыкула, канструктыўнага і яснага выкананьня матэрыялу, прынцыповага адбору прыкладаў, імёнаў, датаў, твораў. Зусім відавочна, што ў аўтара атрымалася хутчэй кніга для пазакляснага чытаньня, чым дапаможнік. Вось некалькі паказальных недахопаў і недакладнасьцяў. У якасьці прыкладу раманскай архітэктуры прыведзены горад-крэпасьць Каркасон — клясычны прыклад архітэктуры готыкі. Нельга не заўважыць і такія «разынкі» як каталіцкая рэлігія» (С.73), «культавы храм» (С.75)...

Як жа прадстаўлены Беларускі матэрыял? Паводле аб'ёму і колькасьці ілюстрацыяў, можна лічыць, прыстойна: каляровых 105 (з 253), чорнабелых 108 (з 397), разам — каля траціны, а сярод каляровых — каля 40%. Але падбор ілюстрацыяў, у прыватнасьці ў разьдзеле «Мастацтва Беларусі ад старажытнасьці да канца XVI ст.» непрадуманы. Запомніць і пераказаць школьніку, гімназісту матэрыялы пра археалягічныя культуры, на наш погляд, немагчыма. Дарэчы, тэкст гэтага разьдзелу яшчэ больш сумбурны, перагружаны, ёсьць недакладныя дэталі (напрыклад, узыход на княскі прастол у Наваградку Міндоўга датуецца 1230 годам, хоць у дапаможніках для школ указана, што гэта адбылося ў 1240 г.). Ні ў тэксце, ні ў ілюстрацыях ня зроблены адпаведны акцэнт на факце будаўніцтва Сафійскага сабору ў Полацку. Не пазначаны нават год будаўніцтва, указана толькі стагодзьдзе.

У разьдзеле «Мастацтва Беларусі XIV-XVI ст.» вялікае месца займае пераказ палітычнай гісторыі, але выканана гэта не зусім кваліфікавана, без уліку ўжо напрацаванага матэрыялу ў тых самых школьных падручніках, у дзіцячай энцыкляпэдыі «Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі» У.Бутрамеева. Вось, дарэчы, у каго трэба павучыцца проста і ясна гаварыць пра складаныя рэчы.

Лазука Б.А. Гісторыя мастацтваў: Вучэбны дапаможнік. — Менск: Беларусь, 1996. — 400 с.: іл. Наклад 15000. ISBN 985-01-0045-1. Кошт 82200

Падсумоўваючы беларускія матэрыялы зьвярну ўвагу на тое, што не прагучала на старонках дапаможніка, але павінна быць. Гэта, перш за ўсё, Вільня, як культурны і мастацкі цэнтар беларусаў. Цяжка зразумець, чаму ў актыў беларускага мастацтва XIV-XVIII ст. уключаецца графіка, манумэнтальная скульптура, выкананая ў Вільні, або якая там знаходзіцца, і не ўключаецца станковы жывапіс (некаторыя творы толькі прыгадваюцца), зусім ня згадваецца архітэктура, нават помнікі праваслаўных храмаў, манумэнтальны жывапіс (а манумэнтальны жывапіс беларускіх майстроў, выкананы ў Польшчы, пададзены). Віленскія помнікі мастацтва — арганічная частка шэрагу культураў. Сярод іх, бяспрэчна, і беларуская. Літоўскія мастацтвазнаўцы ўключаюць беларускія помнікі манумэнтальнай архітэктуры, станковага жывапісу і іншыя ў гісторыю мастацтва Летувы. І гэта нармальна, бо мастацкая культура ВКЛ — зьява амаль непадзельная. Дасьледаваць працэс разьвіцьця, напрыклад, архітэктуры, партрэта і іншых жанраў у сёньняшніх адміністрацыйных межах нельга.

Наконт формы напісаньня асабовых імёнаў. Сьледам за некаторымі беларускімі мастацтвазнаўцамі аўтар паўтарае небеларускія формы, ператвараючы партрэтаваных, большасьць зь якіх — вядомыя беларускія дзеячы, у іншаземцаў: Кшыштаф замест Крыштаф, Катажына замест Катарына, Анджэй замест Андрэй... Увогуле мова кнігі відавочна перакладная, часта сустракаюцца невыразныя доўгія сказы, адчуваецца незавершанасьць і пасьпешнасьць фармулёвак.

«Гісторыя...» — безумоўнае асабістае дасягненьне аўтара. Быў выкананы калясальны аб'ём работы. Выкананая ў Беларусі ўпершыню, праца паказала рэальны ўзровень нашай культуры. Менавіта культуры. Бо побач з асобай аўтара трэба бачыць і калектыў рэдакцыі і рэдактара Г.Пармон. Навуковага рэдактара няма. Незразумела, якую ролю выконвалі доктар філялягічных навук, прафэсар Г.Мезенка, кандыдат пэдагагічных навук, дацэнт В.Селівон, пэдкалектыў гімназіі №1 г. Віцебска, супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Т.Зайцава і Л.Кірухіна, якім аўтар выказвае шчырую падзяку. Сярод усіх пералічаных пэрсонаў і калектываў адсутнічаюць спэцыялісты асноўных навуковых арганізацыяў краіны: Аддзелу выяўленчага мастацтва і Музэю Старажытнабеларускай Культуры Акадэміі Навук Беларусі, Нацыянальнага Мастацкага Музэю, Катэдры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай Акадэміі Мастацтваў...

Перш чым брацца выказваць заўвагі, кожны раз задаеш сабе пытаньне, а ці не нашкодзіць гэта аўтару і разам з тым агульнай справе? Ці слушна мяне зразумеюць? Але трэба быць шчырым. І, выказаўшы заўвагі, я, тым ня менш, раю бібліятэкарам, студэнтам набыць гэтую кнігу і сам карыстаюся ёю.

P.S. Кніга выйшла тыпова «беларускім» накладам — 15 тыс. асобнікаў. На 10 млн. беларусаў. Эстонская «Кніга пра мастацтва для моладзі» мае 30 тысячаў асобнікаў на 1 млн. эстонцаў (другое выданьне). Гэта значыць, што дапаможнік ня трапіць нават ва ўсе тыя навучальныя ўстановы, для якіх ён прызначаны. Так што пэрспэктыва на перавыданьне — «пашырэньне і палепшанае» — у нас ёсьць. Праўда, мне вядома, што выдавецтва рыхтуе пераклад «Гісторыі...» на расейскую мову. А гэта значыла б зьнішчыць самую галоўную якасьць кнігі.

Працяг «круглага стала» на стар.22

Працяг са стар. 1

ПРАВЫ РЭВАНШ

Прэм'ер-міністар Чэхіі Клаўс падкрэсліў у сваім выступе, што трансатлянтычная супольнасьць пасапраўднаму можа быць аб'яднаная ня столькі чыньнікам супольных ворагаў, колькі супольнымі ідэямі ды традыцыямі свабоды, дэмакратыі і рынкавае эканомікі. Ён папярэдзіў пра небясьпеку ізаляцыянізму і падкрэсліў, што Эўропа ды Паўночная Амэрыка маюць агульную культурную спадчыну лібэралізму, якую НАІ будзе імкнуцца захаваць для наступных генэрацыяў паабапал Атлянтычнага акіяну.

Ключавую прамову на канфэрэнцыі зрабіла адна зь яе ініцыятараў спадарыня М.Тэчар. Яна нагадала, што ў мінулым Захад непадрыхтавана-бясьсільна стаяў ў баку, калі свабода культурнага і таленавітага чэскага народу была задушаная дзьвюма пачварнымі таталітарнымі сыстэмамі: нацыянал-сацыялісцкай Нямеччынай ды камуністычнай Расеяй. Прамоўца засьцерагла ад паўтору мінулых памылак і заклікала быць аб'яднанымі, гатовымі ды ўзброенымі перад будучымі ворагамі.

Як падкрэсьліла М.Тэчар, ні абяцанкі сусьветных лідараў, ні гарантыі міжнародных арганізацыяў не дапамаглі Чэхаславаччыне, калі туды рушылі нацысцкія танкі. Галоўнае, на яе думку, — моцная сувязь паміж дэмакратычнымі краінамі ды вайсковая моц. У якасьці прыкладу Тэчар адзначыла, што распад камуністычнае сыстэмы быў дасягнуты не ААН, не Сусьветным Банкам ці ЭЭС, а толькі аб'яднанымі заходнімі дзяржавамі пад лідарствам ЗША ды з дапамогай сьмелых дысыдэнтаў-патрыётаў у краінах Усходняга блёку.

Найбольш вострыя словы свайго выступу былы лідар кансэрватыўнае партыі Вялікабрытаніі пакінула для сацыялістаў і камуністаў. Тэчар зганіла палітыку сацыялізму і адзначыла, што ў шмат якіх краінах Эўропы кіслы прысмак ягонага плёну яшчэ занадта адчувальны.

Там, дзе сацыялізм пакінуў самыя глыбокія сьляды — у краінах былога СССР, на думку Тэчар, — "мы назіраем не заходняга стылю дэмакратыю ды вольныя рынкі, а толькі карупцыю, некантраляваныя дзеяньні ўладаў, гангстэрызм, паўсюдны брак даверу і выхаванасьці. Камунізм пачаўся з тэрору ды масавых забойстваў, а скончыўся дробнай карупцыяй, непрадуктыўнасьцю, жахлівым сэрвісам, хамствам і эгаізмам. Сацыальная пустэча, што ўзьнікла пасьля заняпаду камунізму, — ня глеба для пераходу да рынкавай эканомікі".

М.Тэчар заклікала да палітыка-эканамічнае інтэграцыі Паўночнай Амэрыкі й Эўропы і да пашырэньня NATO на ўсход. Яна заявіла, што ўплыў пасьпяховай амэрыканскай эканамічнай палітыкі ў стане пераканаць багата якія посткамуністычныя краіны пазбавіцца ад урадавага кантролю за эканомікай ды непатрэбнага рэгуляваньня прамысловасьці.

Баранэса Тэчар завяршыла сваю прамову на праскім кангрэсе НАІ наступнымі славамі: "Я была ў Празе ўпершыню шэсьць гадоў таму назад, калі яшчэ панавалі сьвежыя ўспаміны пра сьмяротныя сутаргі камунізму. Радасьць нацыянальнага вызваленьня была такой салодкай! Перавод Вацлава Гавэла з дысыдэнцкага зьняволеньня ў прэзыдэнцкі палац сыгналізаваў ня столькі новую эпоху, колькі новы сьвет — той сьвет, дзе сьціплыя, сьветлыя ды шчырыя атрымаюць у спадчыну Зямлю. Мы, на Захадзе, дасягнулі вялікай перамогі ў халоднай вайне, але нельга забываць, ЗА ШТО МЫ ВАЯВАЛІ. Мэта нашае канфэрэнцыі — нагадаць нам пра гэтую задачу і ажыцьцявіць яе нанова. Вясна ў Празе — адпаведны час ды месца дзеля гэтага".

Праскую заяву "Атлянтычных прынцыпаў" сярод іншых падпісалі: былыя прем'ер-міністры Вялікабрытаніі ды Галяндыі Тэчар і Любэрс, сэнатар кангрэсу ЗША ад штату Арызона Кіл, якія ўзялі на сябе практычныя каардынацыйныя функцыі. Галоўны рэдактар амэрыканскага аналітычнага часопісу правага кірунку National Review Дж.О`Салівэн заявіў на заключным паседжаньні, што штаб-кватэра Новай Атлянтычнай Ініцыятывы будзе разьмяшчацца ў ЗША.

Вадзім АЛЕКСАНДРОВІЧ

P.S. Утварэньне НАІ можна разглядаць як спробу рэакцыі правых колаў Захаду на новыя рэваншысцкія настроі расейскай эліты, якая яўна спадзяецца на выкананьне патаемных пратаколаў пра падзел сфэраў уплыву, падпісаных ў час вашынгтонскага візыту Б.Ельцына напрыканцы 1994 г. Такім чынам, "сьвядомы беларускі мільён", які не прымае інтэграцыі з усходнім душком (паводле дактрыны грачовых — "создания мощной российско-белорусской военной группировки на территории Белоруссии"), можа разьлічваць на падтрымку сілаў, што ініцыявалі запачаткаваньне НАІ.

Вільня

Андранік Антанян:

Пятніца. Сыноптыкі ці пагражалі ці абяцалі пахаладаньне. Абяцанкі-цацанкі. Ад сьпёкі няма дзе схавацца. За дзень выжлукціў літры два мінэралкі. Задуха. Хоць бы ветрык які падзьмуў.

У Рэспубліканскай бібліятэцы адкрыцьцё выставы «Беларускі школьны друк у Вільні 1915-44». Падрыхтаваў яе настаўнік беларускай гімназіі Сяргей Вітушка. Кніжкі, фотаздымкі, атэстаты выпускнікоў. Усё пад шклом. Кніга пачынае для мяне йснаваць толькі з таго моманту, як я магу да яе дакрануцца.

Тут бібліятэка. Манія зьбіраньня-захаваньня. Я патрапіў сюды амаль выпадкова. На стэндах кнігі Ластоўскага, Аляхновіча, Гарэцкага. Не якіясь там рэпрынты выдавецтва «Навука і тэхніка». Карціць пагартаць.

Урачыстае адкрыцьцё. Публікі няшмат. Старэйшае пакаленьне, як мае быць, ходзіць з задаволенымі тварамі, пагладжвае бароды, моладзь носіцца зь недарэчнымі тут бел-чырвона-белымі сьцягамі й ліхаманкава фатаграфуецца на іх тле.

На тле Пушкіна здымаецца сямейка... «Пабочныя» людзі разгублена совающца ўздоўж стэндаў. Нармальнае беларускае сьвята. Два беларускія прамоўцы Лявон Луцкевіч і Аляксей Анішчык кажуць сьпічы. Як заўсёды караценька, хвілін на сорак.

Прыехалі тэлевізійшчыкі першага каналу. Публіка ажывілася. Непаўналеткі са Зьвязу Беларускай Моладзі Віленшчыны пачалі лезьці ў кадар ды набівацца на інтэрвію. Рэпартэры іх, відаць, любяць. Што ні акцыя, то скандал, то правакацыя. Заўсёды ёсьць пра што распавесьці гледачам і чытачам. Ну й гэтым разам не абышлося без запашкі, дакладней, млявага мардабою. Лідар ЗБМВ В.Савянкоў атрымаў «поўху» ад С.Вітушкі за зьдзек з нацыянальнага сьцягу. Удавацца ў дэталі не было ахвоты. Працягу канфлікт ня меў. Сьпёка...

Зь бібліятэкі праспэктам пайшоў на Зарэчча. На Катэдральным пляцы і ў Парку Моладзі мора (на мясцовы капыл) паліцыі. Чапляюцца да людзей, што сядзяць на лавачцы, п'юць піва ды паляць у цяньку цыгарэты. Аказваецца, што выйшла нейкая пастанова гарадзкое ўправы аб забароне расьпіваньня піва й курэньня (іншы алькаголь на вуліцы піць забаронена наагул і даўно) менавіта на гэтым пляцы ды ў гэтым парку. Гэткі правобраз «Зоны Цноты». У мяне асабіста людзі, якія ня паляць, выклікаюць падозраньне. Ад іх заўсёды трэба чакаць якой-небудзь непрыемнасьці, асабліва ў выпадку прыходу іх да ўлады. Ленін — не курыў, Гітлер — не курыў і курцоў ненавідзеў, во й «первы й ядзінствянны» прэзыдэнт Беларусі таксама ня паліць. Ёсьць пра што задумацца...

Беларуская амбасада ў Літве — самы папулярны аб'ект у віленскіх пікетоўшчыкаў. Ад 25 сакавіка гэтага году пачынаючы, пад гэтымі вокнамі прайшло аж чатыры пікеты. Супрацоўнікі амбасады адмахваюцца ад удзельнікаў гэтых акцыяў на старонках дзьвюх дахадзяжных расейскіх газэтаў «Вечерние Новости» ды «Эхо Литвы», сумарны наклад якіх не складае й сямі тысячаў асобнікаў. Раней самай папулярнай амбасадай для пікетаў была Кітайская, каля якой патрабавалі пакінуць у спакоі тыбетцаў. Наступны пікет каля прадстаўніцтва «краіны дубовага ліста» пройдзе на наступным тыдні з ініцыятывы ваенізаванай патрыятычнай арганізацыі. Літоўскія нацыяналісты лічаць, што з боку Беларусі сыходзіць пагроза для сувэрэнітэту Літвы.

Полацак

Алесь Аркуш:

16.05. Семдзесят гадоў таму (11-га траўня) у Полацку адбылася вечарына Янкі Купалы. Ладзіла яе мясцовая філія «Маладняка». Разам з паэтам прыехалі старшыня саўнаркаму Язэп Адамовіч і наркам асьветы Антон Баліцкі. Ня цяжка ўявіць, што гэта была за імпрэза. Вясна, кветкі, процьма народу, беларуская мова (у тым ліку і з вуснаў першых асобаў рэспублікі). 1926 год. Яшчэ працягваецца дзяржаўная палітыка беларусізацыі. Адамовіч і Баліцкі — яшчэ ня ворагі народу.

Праз семдзесят гадоў у Полацкім музэі беларускага кнігадрукаваньня Менскі музэй Я.Купалы і міжнародны фонд яго імя наладзілі купалаўскую сустрэчу. Прыехалі «музэйшчыкі-купалаўцы» С.Панізьнік, А.Хатэнка, Ф.Ваданосава, бард А.Камоцкі. У залі — купка інтэлігенцыі, студэнты. Мясцовыя ўлады мерапрыемства праігнаравалі — сьцеражонага бог сьцеражэ. Імпрэза пачалася з расейскамоўнай песьні пра Купалу — напэўна, тутэйшая ініцыятыва. Затым былі купалаўскія вершы ў выкананьні Антаніны Хатэнкі, песьні Камоцкага, аповеды пра дачыненьні песьняра з Полацкам — у 1916 годзе Іван Луцэвіч праходзіў вайсковую службу ў дарожна-будаўнічым атрадзе ў суседняй Баравусе-1, менавіта ў Полацку ён пазнаёміцца з Паўлінай Мядзёлкай. Сябры студэцкага клюбу «Княжыч» з Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту прасьпявалі купальскія песьні. Самымі крамольнымі словамі былі вершы самога Купалы. Далі Бог, за такія радкі сёньня можна патрапіць проста ў камэру да Славаміра Адамовіча.

17.05. На наступны дзень з раніцы на вакзале Баравуха-1 адбылося адкрыцьцё мэмарыяльнай табліцы з наступным тэкстам: «Тут у 1916 г. служыў старшым рабочым дарожна-будаўнічага атрада Варшаўскай акругі шляхоў зносін беларускі паэт Янка Купала». Перш чым прышрубаваць табліцу да сьцяны вакзалу Сяргею Панізьніку давялося абтэлефанаваць дзясяткі чыноўнікаў і цярпліва прасіць дазволу. Ня ўсе разумелі, пра што йдзе гаворка, некаторыя, страхуючыся, адсылалі вышэй-вышэй. На адкрыцьці табліцы прысутнічаў сам начальнік міліцыі Полацкага раёна. Забароненых сьцягоў не было, крамольных прамоваў таксама. Толькі вершы. Пра прэзыдэнцкі загад аб невыкарыстаньні вершаў Купалы падчас грамадзскіх мерапрыемстваў у полацкай міліцыі ня чулі, таму адкрыцьцё прайшло без надзвычайных здарэньняў.

Затым пісьменьнікі і музэйшчыкі зрабілі выправу на Вернядзьвіншчыну. Старая назва Верхнядзьвінску — Дрыса, а герб места — Пагоня. Таму змагацца з узброеным вершнікам у гэтым невялічкім гарадку ня так проста. Начальнік мясцовага лясгасу Павал Івашчанка сядзіць у працоўным кабінэце пад гербам свайго гораду й ня бачыць у гэтым ніякай крамолы. «Чаму мы мусім адмаўляцца ад сваёй спадчыны?» да таго ж ён чытае пераважна беларускамоўныя газэты (у тым ліку й «Нашу Ніву»). Ён адвёз нас у свой славуты дэндрарый. Каля 320 відаў дрэваў і кустовых расьлінаў з усяго сьвету знайшлі тут сабе другую радзіму. Вялікі сусьвет у мініятурах — як сотні народаў, моваў, звычаяў. І з гэтай шматаблічнасьці складаецца прыгажосьць.

ВЭРНІСАЖ

Рэзка павышанае майстэрства

17 траўня ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыцьцё выставы Дзяніса Раманюка «Мроі».

Выстава былога вучня Беларускае Акадэміі Мастацтваў, адлічанага за непасьпяховасьць чатыры гады таму, які працягнуў сваё навучаньне ў Віленскай Мастацкай Акадэміі і завяршыў яго з посьпехам, прыцягнула натуральную цікавасьць і колішніх ягоных настаўнікаў, і сёньняшніх калегаў.

Адмыслова прадуманая экспазыцыя, дзе выстаўленыя тры работы «менскага» пэрыяду за 1990 год і паэтапна раскрываецца працэс «літуанізацыі», яскрава дэманструе розные мэтодыкі навучальнага працэсу ў Менску і Вільні. Віленскую школу найперш характарызуе поўная індыфэрэнтнасьць да сюжэту, з аднаго боку, і максымальная патрабавальнасьць да тэхналягічнае дасканаласьці, з другога. Гэты спосаб акадэмічнага навучаньня, як сьведчыць выстава Раманюка, можа быць вельмі прадуктыўным. Па-першае, вучань зь Менску мусіў адставіць кан'юнктурны этнаграфізм, а, па-другое, рэзка павысіць сваё прафэсійнае майстэрства, засвоіць складаныя тэхналягічныя працэсы. Нізка «Хімэры», якая была выпускной працай Дзяніса Раманюка ў Вільні — відавочнае пацьверджаньне ягонае прафэсійнае сталасьці, дзе часам празьмерная «мэханічнасьць» дэманструе бездакорнае валоданьне тэхнікай шаўкаграфіі, адной з найбольш складаных у каляровай графіцы. Зрэшты, менавіта гэта й патрабавалася ад выпускніка. Працы самастойнага «пераходнага» пэрыяду, распачатыя яшчэ ў Вільні, зьдзіўляюць ўжо нечаканаю ў такім узросьце пранікнёнасьцю і ўважлівай сузіральнасьцю прыроды. Напрыклад, сэрыя «Каране», ў якой нечакана пераломваецца трывіяльнае сьцьверджаньне пра нашую роднасьць з прыродай. Упершыню Раманюк-графік рэпрэзэнтуе і свае захапленьні іншымі відамі мастацкае дзейнасьці — фота і інсталяцыяй. Посьпех акцыі быў відавочны. Нашыя чытачы, якім добра знаёмыя, малюнкі і здымкі даўняга супрацоўніка «НН» Дзяніса Раманюка, ня зьдзівяцца таму, што на адкрыцьці выставы прысутнічалі амаль уся рэдакцыя тыднёвіка, а таксама выдатныя фотамайстры, мастакі, журналісты, выкладчыкі. Для тых, хто хоча пазнаёміцца бліжэй з творчасьцю Дзяніса, адчуць подых віленскага паветра, паведамляем, што выстава працягнецца да 5 чэрвеня. Мусіце пасьпець.

Сяргей Харэўскі



Дзяніс Раманюк. Фота Цімура Грыба

Сьвет

РАСЕЙСКАЯ МАФІЯ. У Нью-Ёрку адбываецца суд над 55-гадовым Вячаславам Іваньковым (Япончыкам). ФБР называе яго хросным бацькам расейскай мафіі. Ён абвінавачваецца ў вымагальніцтве 3.5 млн. даляраў у нью-ёркскай кансальтынгавай фірмы «Саміт Інтэрнэшнл», што належыць былым савецкім грамадзянам. Але насамрэч Япончык, як ў свой час Аль Капонэ, займаўся нашмат больш разнастайнай «дзейнасьцю». Следчыя маюць зьвесткі пра ягоны ўдзел у хабарніцтве, адмываньні грошай ды замоўных забойствах у розных краінах сьвету.

Амэрыканская прэса піша, што расейскія мафіёзі зрабіліся самай страшнай праявай арганізаванай злачыннасьці, пакінуўшы далёка ззаду вядомую «Коза Ностру». Італьянцы звычайна не выходзілі за межы гандлю наркотыкамі ды зброяй, азартных гульняў ды прастытуцыі. А расейскія злодзеі бяруцца за ўсё, што прыносіць грошы. У дадатак расейскія мафіёзі добра адукаваныя ды звыклыя да дзейнасьці ва ўмовах татальнага пашпартнага кантролю.

КІТАЙСКІЯ ПАДРОБКІ. Кітайцы працягваюць традыцыі сваіх продкаў-вынаходнікаў пораху, шоўку ды расейскай «Матрошкі». Апроч пірацкіх кампакт-дыскаў ды таннай нізкаякаснай адзежы, якой яны завалілі былы СССР, працяг на стар. 21

№ 10/96
27 траўня —
2 чэрвеня

ШТОТЫДНЁВЫ
ІНФАРМАЦЫЙНЫ
ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ
НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 16 палосаў патрэбнае інфармацыі

інфарматар НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ
ЗАБЕСЬПЯЧЭННЕ
BELARUSIAN PUBLIC
RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЁ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ

ТЭАТРАЛЬНЫ АНОНС

ГАСТРОЛІ

Яраслаўскі Акадэмічны тэатар імя Ф.Г. Волкава

З **4** да **18** чэрвеня на сцэне *Расейскага тэатру імя Горкага.*

З **7** да **21** чэрвеня на сцэне *тэатру Янкі Купалы.*

27 траўня. *Канцэртовая заля "Менск"* ў 19.00 **Дзяржаўны Акадэмічны Вялікі Тэатар — "Віртуозы Масквы"**

28 траўня. Славутая **Мантсэрат Кабалье**

29 траўня. *Дом афіцэраў*. 18.00. Артысты **МХАТ** *Станіслаў Любшын і Аляксей Жаркоў* у спэктаклі "І сьмех, і сьлёзы, і каханьне"

СПАЖЫВЕЦ

Міжнародная сыстэма гатэляў

Набліжаецца час адпачынкаў. З гэтага нумару "Інфарматар" будзе часьцей знаёміць чытачоў "Нашай Нівы" з інфармацыяй, якая можа ім спатрэбіцца падчас летніх падарожжаў.

Гэты матэрыял адрасаваны тым, хто мяркуе карыстацца паслугамі гатэляў за мяжой. Зьвесткі, зь якімі мы Вас азнаёмім, базуюцца на досьведзе 133 тысячаў кліентаў, якія даслалі свае водгукі пра гатэльнае абслугоўваньне ў спажывецкую арганізацыю ЗША. Стар. **9**

КОШТЫ НА РЭКЛЯМУ Ў ГАЗЭЦЕ "НАША НІВА" І ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ДАДАТКУ "ІНФАРМАТАР"

	"НАША НІВА"	"ІНФАРМАТАР"
Базавая стаўка ч/б	$0,5 см²	$0,4 см²
Замова ў рэклямным бюро	$0,5 см²	$0,4 см²
Замова праз тэлефон	$0,6 см²	$0,5 см²
Першая паласа	ч/б — $1 см² Колер (ня меней за 100 см²) — $2,5 см²	ч/б — $0,9 см²
Радковая рэкляма на паласе "Біржа працы"		5.000 руб. (зьмяшчаецца запар у двух нумарах)
Колер	ня меней за 50 см² — $1	ня меней за 20 см² — $1,5 см²
TV–праграма		ч/б — $1 см² колер — $1,5 см² (ня меней за 50 см²)

Замовіць рэкляму можна праз тэлефон 36-76-75 з 10.00 да 20.00 штодня, ці на адрасе: вул. Пуліхава, 29, кв. 61, да 18.00. Пры гэтых коштах ня ўлічваецца выраб арыгінал-макету.

Падпіска на газэту
"НАША НІВА"
праз пошту і "САЮЗДРУК"
індэкс 63125.

Падпісны кошт **13.000 на месяц**
39.000 на квартал
*** Прадугледжаны скідкі на колькасьць выхадаў і плошчу рэклямных абвестак**
Падпіска празь недзяржаўную сетку дастаўкі
тэлефон 29-22-10 (Цыбульскі Леанід)

Платныя прыватныя аб'явы

Тэрмінова куплю факс-апарат PANASONIC да $150 у добрым стане ці памяняю на струйны прынтэр Fujitsu Breeze 100+ (амаль новы). *Званіць на тэл. 27-83-75 з 13.00 да 17.00*

ЗДАРОЎЁ

ПРЫРОДНЫЯ АТРУТЫ

Кожны дзень на нашым стале з'яўляюцца духмяная садавіна, прывабныя сыры й кілбасы, надзвычай карысныя малочныя, мясныя стравы, стравы з гародніны. Але ці шмат хто з нас ведае, што няма аніводнага харчовага прадукту, які, апроч неабходных для нашага арганізму рэчываў, ня меў бы вялікай колькасьці непатрэбных і нават шкодных складнікаў?

Чытайце на ***стар. 8***

знаёмцеся EURONEWS

Бэз камэнтараў (No Comment)

Рэпартажы гавораць самі за сябе: найвастрэйшыя сюжэты з усяго сьвету ў неадрэдагаваным выглядзе і з сапраўдным гукам — мяркуйце самі.

Культура (Culture)

Панядзелак, серада — Артысіма (Artissimo): мастацтва

Аўторак, чацьвер — Адэон (Odeon): мастацтва скокаў і тэатар

Пятніца — Кіно (Cinema): новыя фільмы, нарысы й інтэрвію

Нядзеля — Аліса (Alice): эўрапейская моладзь — пераканаьні, цікавасьці й магчымасьці рэалізаваць сябе

Навука й грамадзтва (Science & Society)

Панядзелак — Весткі зь лябараторыяў (Labnews): апошнія дасягненьні навукі

Аўторак — Экалёгія (Ecologia): навакольнае асяродзьдзе — прадмет абмеркаваньня й вырашэньня.

Серада — Віза (Visa): для тых, хто любіць прыгоды, дасьледаваньні й адкрыцьці

Чацьвер — Здароўе (Health): пульс мэдычных досьледаў сёньняшняга дня

Пятніца — Media: погляд за кулісы міжнародных камунікацыяў

Субота — Стыль (Style): апошнія навіны сьвету моды й дызайну

Нядзеля — Alpe Adria: рэпартажы з Альпаў і Адрыятыкі

Эўропа (Europa)

Стварэньне новай Эўропы (Building the New Europe): рабочыя інстытуты, сутнасьць рашэньняў і палітычнае разьвіцьцё Аб'яднанай Эўропы. Дадатак у 23.23

Народы Эўропы (People in Europe)

Перадача адлюстроўвае стан Эўропы ад афіцыйных інстытутаў да будзённага жыцьця ўсіх народаў

Панядзелак — 90 градусаў усходняй даўжыні (90 E): у фокусе — краіны й народы Ўсходняй Эўропы

Серада — Эўрапейскі стыль (Label Europe): перадача для спажыўцоў — вось так Эўрапейскі кірмаш працуе дзеля Вас

Чацьвер — Mediterraneo: рэпартажы з краінаў Міжземнамор'я

Агенцтва **"Права й нерухомасьць"** дапаможа прадаць ці купіць кватэру ў Менску, а таксама аформіць абмен прыватных ці дзяржаўных кватэраў. Адрэса: вул. Кірава, 19, кв. 47, тэл. 224-61-87, 231-09-92 (продаж), 264-09-74 (купля), 222-27-67 (абмен).

На продаж маюцца:

Колькасьць пакояў	Вуліца	Кошт USD	Плошча агул./жыл.	Кухня	Із. пак. санвузел	Паверх Дом	Телефон Лодж./бальк.	Падлога
1	Асаналіева	12.000	34/17	9	—/асобн.	3/9ц	—/лодж.	лінол.
2	Капіноўскага	15.000	44/30	6	—/сум.	2/5п	—/балькон	драўл.
2	Уральская	15.800	44/27	6.4	2/сум.	3/4ц	тэл./балькон	драўл.
2	Казлова	26.000	60/32	8.4	2/асобн.	3/6ц	тэл./балькон	паркет
2	Кедышка	15.300	44/30	6	—/сум.	3/5б	тэл./балькон	драўл.
3	Кальварыйская	55.000	100/52	8.5	3/асобн.	4/5ц	тэл./балькон	драўл.

А таксама маюцца яшчэ болей за 200 варыянтаў для куплі.

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь
АБАНЕМЭНТ на газэту **63125**

НАША НІВА

Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму _____ (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газэту **63125**

НАША НІВА

ПВ	месца	Літэр

Кошт — падпіска _____ руб. — пераадрас. _____ руб. — Колькасьць камплектаў

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму _____ (прозьвішча, ініцыялы)

НОВЫЯ ВАКАНСІІ Й ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ Ў КРАІНЕ.



ПРАЦАЎЛАДКАВАНЬНЕ БЕЗ ЖЫТЛА

Барысаўскі рэгіянальны цэнтар занятасьці, тэл. 3-93-23. **Дактары розных спэцыялізацыяў, кіроўцы аўтамабіля катэгорыі "С"** (кантрактная служба), **фармацэўты, правізары, трактарысты, сьлесары абслугоўваньня швачнага абсталяваньня, швачкі-матарысткі, сталяры-цесьляры, малярытынкоўнікі,** спэцыялісты з вышэйшай і сярэднеспэцыяльнай чыгуначнай адукацыяй, кваліфікаваныя **мастакі.**

Жодзінскі гарадзкі цэнтар занятасьці насельніцтва, тэл. 3-45-72. **Выкладчыкі** (мужчыны з вышэйшай адукацыяй да 30 гадоў), **машыністы бульдозэра, сталяры 5 ступені, настаўнікі музыкі, ангельскае мовы.**

Лагойскі раённы цэнтар занятасьці, тэл. 5-43-59. **Трактарысты, экскаватаршчыкі, вэтурачы-нарныя дактары, заатэхнікі, вэтфэльчары, даяркі, наладнікі станкоў з ЛПК, інжынэры радыёмантажу, сталяры.**

Любанскі раённы цэнтар занятасьці насельніцтва, тэл. 5-41-34. **Жывёлагадоўцы, мэханізатары, даяркі, вэтдактары.**

Смалявіцкі раённы цэнтар занятасьці насельніцтва, тэл. 5-43-75. **Фрэзавальнікі, токары, швачкі, мэханізатары, інжынэры-мэханікі торфавытворчасьці, бугальтары, галоўныя бугальтары.**

Салігорскі рэгіянальны цэнтар занятасьці насельніцтва, тэл. 3-72-63. **Галоўныя бугальтары, швачкі вышэйшае катэгорыі, даяркі, трактарысты, жывёлагадоўцы, газаэлектразварнікі, сталяры, абмуроўнікі-футравальнікі, выкладчыкі сьлясарна-электра- і сьлясарна-станочнае справы.**

Менскі раённы цэнтар занятасьці, тэл. 51-40-82. **Галоўныя бугальтары, кіроўцы аўтамабіля, мэдычныя сёстры, электрагазазварнікі, прадаўцы, муляры, сьлесары, загадчыкі крамай.**

Мядзельскі раённы цэнтар занятасьці насельніцтва, тэл. 5-42-46. **Газаэлектразварнікі, трактарысты, даяркі, жывёлагадоўцы, будаўнікі, прараб, заг. майстэрнямі, заг. гаражамі, аграном-хімік, буфэтчыцы.**

Старадароскі раённы цэнтар занятасьці, тэл. 5-47-12. **Галоўныя вэтурачы-нарныя дактары, гал. аграном, гал. заатэхнік, гал. эканаміст, гал. энэргетык, прараб.**

Маладэчанскі рэгіянальны цэнтар занятасьці, тэл. 5-28-02. **Муляры, даяркі, трактарысты, мэханізатары, паляводы, сьлесар-рамонтнік газавага абсталяваньня.**

Капыльскі раённы цэнтар занятасьці насельніцтва, тэл. 5-57-92. **Прадаўцы, дактары, мастацкія кіраўнікі ў сельскія дамы культуры, мэтадыст клюбнае працы, даяркі, трактарысты, жывёлагадоўцы, паляводы, вэтдактары, галоўны эканаміст, галоўны доктар, машыніст катлоўні, фэльчар (заг. ФАПам), акушэрка, мэдычная сястра, токар.**

Чэрвеньскі раённы цэнтар занятасьці насельніцтва, тэл. 5-44-97. **Інжынэр-тэхнолаг сьпіртовай вытворчасьці, вэтдактары, брыгадзіры трактарнай брыгады, заатэхнік.**

ПРАПАНУЕМ ПРАЦУ З ЖЫТЛОМ

Барысаўскі раён 1. Калгас "Маяк", в. Жыцькава: **вэтдоктар** 2. Псыханэўралягічны дом-інтэрнат: **заг. дапаможнай гаспадаркі** пас. Тарасікі, мець адну спэцыяльнасьць: **аграном, заатэхнік, вэтдоктар.** 3. Саўгас "Траянаўка", 7-36-37, в. Траянаўка: **гал. інжынэр, прараб.**

Вілейскі раён 1. Калгас "Ленінскі камсамол", т. 6-11-32: **жывёлагадоўцы** (3 сям'і). 2. Калгас імя Кірава, т. 4-42-71: **жывёлагадоўцы** (3 сям'і). 3. Калгас "Чырвоны сьцяг", т. 7-41-32: **жывёлагадоўцы** (1 сям'я).

Лагойскі раён 1. В. Мяцеліца, калгас "Іскра": **даяркі,** 2 кватэры, т. 72-1-60. 1. Завод "Кобальт" г.п. Плешчаніцы, **токар, СМР 3-4 ступені, наладнік станкоў з ЛПК, хімік-тэхнолаг** – т. 71-4-56, **інжынэр-тэхнолаг радыёмантажу энэргаўчастку, рэгулявальнік радыёапаратуры.**

Любанскі раён, калгас "40 год Кастрычніку", т. 59-1-23: **вэтдоктар** – дом-сядзіба.

Смалявіцкі раён, торфа-брыкетны завод "Чырвоны сьцяг", т. 55-9-72: **галоўны энэргетык** – інтэрнат.

Стаўбцоўскі раён 1. Калгас "1-га траўня": **галоўны інжынэр;** в. Літва, т. 5-41-84: **галоўны заатэхнік, даяркі, мэханізатары.** 2. Калгас імя Пушкіна, в. Яблонаўка, т. 5-50-64: **галоўны інжынэр, галоўны вэтурачы-нарны доктар, галоўны заатэхнік.** 3. Калгас імя Я.Купалы, в. Рубяжэвічы, т. 5-44-53: **мэханізатары.**

Слуцкі раён, калгас імя Калініна, в. Мялешкі, т. 77-1-32, 77-1-42: **галоўны вэтдоктар (адукацыя вышэйшая).**

Салігорскі раён 1. Калгас "Праўда", т. 7-63-32: **даяркі, ст. энэргетык, заатэхнік.** 2. Дапаможная гаспадарка "Салагошч", т. 7-94-31: **заатэхнік.** 3. Калгас "Зара": **прараб;** в. Саковічы: **інжынэр-мэханік, ст. энэргетык, заг. майстэрні (са жніўня).**

Пухавіцкі раён 1. Калгас імя Янкі Купалы: **трактарыст, в. Гарэлец, даярка.**

Запрашаем у кавярню, што адчыняецца ў чэрвені на пр. Машэрава, 11: **намесьніка дырэктара** (адукацыя спэцыяльная, ініцыятыўны); **адміністратара** (адукацыя спэцыяльная, досьвед працы); **кухара** (4-5 ступені); **афіцыянтаў** (дзяўчыны да 25 гадоў, адукацыя спэцыяльная, прывабны вонкавы выгляд). Абавязкова мець рэкамэндацыйны ліст. Тэлефон 26-96-64.

Фірма запрашае на працу **жанчынаў ва ўзросьце 30-45** гадоў з досьведам працы на **рабочых спэцыяльнасьцях у вытворчасьці**. Тэлефон 69-01-86 (з 9.00 да 17.30).

ЗАТ "Корпак" запрашае на працу: **муляраў, друкароў, наладніка блістэрных машынаў.** Тэлефон 23-54-23.

Штотыднёваму аўтамабільнаму выданьню на сталую працу патрабуецца **прафэсійны карэктар-стыліст.** Тэлефон (0172) 31-89-05 з 9 да 18 гадз.

Установа запрашае высокакваліфікаваных **рабочых будаўнічых спэцыяльнасьцяў.** Пажадана мець замежны пашпарт. Тэлефоны: 21-40-19, 21-40-18, 21-43-07.

Аддзел ваенізаванай пажарнае службы Першамайскага раёну г. Менску запрашае на працу **кіроўцаў пажарных аўтамабіляў.** Патрабаваньні: катэгорыя "С", досьвед працы большы за 3 гады, узрост да 27 гадоў. Тэлефоны: 66-28-49, 66-26-35, 66-27-91.

Фірма запрашае на працу на выгодных умовах высокакваліфікаваных **рэклямных агентаў.** Запіс на сумоўе праз тэлефон 27-69-75 з 9 да 18.

Фірма запрашае на працу **мастака-дызайнэра** з досьведам працы на кампутары. Тэлефон 64-78-64.

Прадпрыемства запрашае на працу **камэрцыйных агентаў** продажу аргтэхнікі (пажадана мець вышэйшую адукацыю). Тэлефоны: 32-24-62, 32-63-09.

Вытворчай фірме патрабуюцца: высокакваліфікаваныя **сталяры-станочнікі.** Тэлефон 22-07-45 з 16.00 да 17.30; **архітэктар** (з досьведам працы на ПЭВМ (ACAD)); **мэнэджэр гандлёвага аддзелу.** Тэлефоны: 59-58-68, 59-58-71 з 16.00 да 17.30.

Патрабуецца **апэратар ПЭВМ**, які ўмее працаваць у Page Maker 5.0 і Corel Draw. Праца зьменная (рухомы графік). Тэлефоны: 23-63-15, 23-76-50, 23-06-98.

Менскі досьледна-экспэрымэнтальны завод тэхналягічнага абсталяваньня запрашае на сталую працу **галоўнага бугальтара** (мужчыну з досьведам працы). Нашая адрэса: г. Менск, вул. Варвашэні, 15. Тэлефон 39-48-39.

ЗАТ "БелІнфарм-Прэс" запрашае **прадаўцоў** друкарскай прадукцыі ў электрацягніках. Даем дазвол на гандаль. Тэлефоны: 43-85-40, 43-88-31.

Запрашаем на працу **аўтамаляра**. Тэлефон 44-53-92.

Менскаму заводу шасьцёрняў тэрмінова патрабуюцца: дасьведчаныя **шліхтары** апрацоўкі ўнутраных адтулінаў дэталяў, **апэратары станкоў з ЛПК.** Тэлефоны: 38-76-05, 38-76-92.

ПКА Sabrina. Прыватнае кадравае агенцтва фармуе банк зьвестак кваліфікаваных спэцыялістаў: **бугальтар сакратар-рэфэрэнт** зь веданьнем замежных моваў; **мэнэджэр продажу; камэрцыйны дырэктар.** Патрабаваньні да кандыдатаў: вышэйшая ці вышэйшая спэцыяльная адукацыя, узрост да 35 гадоў, досьвед працы ў камэрцыйных структурах ня меншы за 2 гады. Тэлефон 32-63-98.

FORTUNA. REAL ESTATE & HOLIDAY OWNERSHIP CORPORATION LIMITED СП "Фартуна. Маёмасьць і валоданьне адпачынкам" прапануе працу з пэрспэктываю росту. Сумоўе адбудзецца а 12.00 9.06.96 на адрэсе: Кастрычніцкая, 5, аўд. 108. Тэл.: (0172) 292-492.

Менскі досьледна-экспэрымэнтальны завод тэхналягічнага абсталяваньня запрашае на працу: **галоўнага бугальтара** (мужчына з досьведам працы), **эканаміста, токара, заточніка, фрэзавальніка, шліхтара.** Нашая адрэса: г. Менск, вул. Варвашэні, 15. Тэлефон 39-48-39.

АП БПМК-90 запрашае на працу: **машыніста аўтагейзэра, машыніста трактара Т-150, машыніста аўтаскрэпэра, машыніста экскаватара ЮМЗ** ("Беларусь"). Наша адрэса: г. Менск, вул. Інтэрнацыянальная, 8. Тэлефоны: 23-72-63, 20-94-78.

Рэклямнаму прадпрыемству ў аддзел вонкавае рэклямы на сталую працу патрабуецца **малады ініцыятыўны чалавек** з вышэйшай тэхнічнай адукацыяй. Тэлефон 53-21-18.

Установа запрашае на працу **намесьніка галоўнага бугальтара**. Тэлефон 69-01-86 (з 9.00 да 17.30).

Запрашаем на працу **агентаў продажу** капіявальнае тэхнікі. Запіс на сумоўе праз тэлефон 27-22-55.

Фірма запрашае на сталую працу **спэцыялістаў кодабных працаў рамонту легкавых аўтамабіляў**. Тэлефоны: 54-10-96, 54-32-57.

Запрашаем на працу **спэцыяліста вёрсткі.** Патрабаваньні: досьвед працы ў Corel Draw, Page Maker, мастацкі густ. Тэлефон 29-35-46.

Стала запрашаем **распаўсюднікаў** газэты "Здравый смысл". Зьвяртацца на адрас: г. Менск, вул. Цнянская, д. 2, корп. 2, кв. 1. Тэлефон для даведак 32-07-25.

Запрашаем да супрацоўніцтва **энэргічных супрацоўнікаў** без абмежаваньня ўзросту, якія жадаюць мець асноўны й дадатковы заробак. Тэлефон 55-26-28 (з 8 да 21 гадз.).

Прыватны прадпрымальнік запрашае маладых энэргічных людзей на працу **гандлёвымі агентамі** продажу офісных канцылярскіх тавараў. Тэлефон 37-98-61.

НП ТАА "Біясан" запрашае да супрацоўніцтва **мэдычных работнікаў** з вышэйшай адукацыяй і **выкладчыкаў.** Перавага будзе ў тых, хто вывучае "жывую этыку". Тэлефоны: 54-08-52, 70-83-28.

Установа запрашае на працу **мэнэджэраў** збыту трыкатажных вырабаў. Узрост 25-35 гадоў. Тэлефоны для даведак: 63-57-03, 63-57-04.

Фірма запрашае **таваразнаўцаацэньніка.** Патрабаваньні: адукацыя вышэйшая (пажадана эканамічная), веданьне рынкавых коштаў на ТНС, камунікабэльнасьць, адказнасьць, досьвед працы (пажадана адміністратыўнай). Тэлефон 23-54-70 (з 15 да 18).

Запрашаем **супрацоўніка** ў фірму для працы на шоп-турах са свайімі аб'ёмамі й прапановамі. Праца высокаплатная. Тэлефон 33-09-12.

Для наладкі новых тэхналягічных працэсаў і абсталяваньня Менскаму заводу шасьцёрняў патрабуюцца дасьведчаныя **наладнікі такарных, зубаапрацоўных, шліфавальных і ханінгавальных станкоў.** Заробак – 1,8 млн. руб. Праца ў 1-ю зьмену. Патрабаваньні: сярэднеспэцыяльная адукацыя. Тэлефоны: 38-76-05, 38-76-92.

СП "Тахці" запрашае на працу **інжынэраў вытворчасьці мэблі.** Патрабаваньні: адукацыя вышэйшая, досьвед працы большы за 10 гадоў. Тэлефоны: 36-83-46, 36-32-94.

Вытворчая фірма запрашае на высокаплатную працу **галоўнага мэханіка** (прамысловае абсталяваньне, мэталярэзныя станкі), **сьлесара-інструмэнтальніка 5-6 ступені**. Тэлефоны: 75-66-07, 75-50-40.

Запрашаем на працу на ўзаемавыгодных умовах **бугальтара** з досьведам працы, веданьнем юрыспрудэнцыі, з жаданьнем шмат працаваць, да 35 гадоў. Тэлефон 63-60-46.

Установе патрабуюцца: **ахоўнікі, ахоўнікі са зброяй, ахоўнікі з сабакамі.** Патрабаваньні: узрост ад 21 да 40 гадоў, рост не нижэйшы за 180 см, пажадана валоданьне сілавымі відамі спорту. Тэлефоны: 27-17-82, 27-18-75.

СП патрабуюцца: **галоўны бугальтар, камэрцыйны дырэктар, спэцыялісты маркетынгу й бугальтарскага ўліку.** Патрабаваньні: узрост да 35 гадоў, досьвед працы большы за 3 гады. Поўныя зьвесткі пра сябе й фотаздымак дасылаць да 1 ліпеня 1996 г. на адрас: 220114, г. Менск, п/с 410.

Фірма "Карпарад" запрашае на цікавую й захапляльную працу **энэргічных маладых людзей**, якія даюць паспытаць сваю моц у кампутарным бізнэсе. Запіс на сумоўе праз тэлефоны: 54-00-40, 59-63-39 з 9.00 да 17.00 і праз тэлефон 47-86-34 з 19.00 да 21.00.

Запрашаем на працу высокакваліфікаваных **рабочых будаўнічых спэцыяльнасьцяў** бяз шкодных звычак. Тэлефон 59-68-70.

Менскаму заводу шасьцёрняў на сталую працу патрабуецца кваліфікаваны **інжынэр-праграміст** (мужчына да 40 гадоў) для распрацоўкі кіроўных праграмаў на: такарных станках з ЛПК (сыстэмы 2Р22, "Электроніка НЦ-31", МС 2101-05-02), фрэзэрных з ЛПК (сыстэмы СНС-600, 2С 42-65, TNC-145C, "Памер-2Н"), сьвідравальных з ЛПК (сыстэма 2П32-3). Патрабаваньні: валоданьне пэрсанальным кампутарам з сыстэмамі аўтаматызаванага праектаваньня. Праца ў 1 зьмену. Заробак 1,5-1,7 млн. руб. Тэлефоны: 38-76-05, 38-76-92.

КУРСЫ КОС 71 І КЛЮБ "МАРА" запрашаюць на курсы **цырульніцкага майстэрства й лякарскага масажу.** Кошты значна ніжэйшыя за камэрцыйныя! Мы чакаем Вас на адрасе: г. Менск, вул. Таўбухіна, 13. Праезд: ст. мэтро "Парк Чалюскінцаў"; трал. N2, 18, 35, 38, 52, 51. Тэлефон 66-68-66.

АТ "Пушэ" запрашае да супрацоўніцтва на конкурснай аснове **дырэктара прадуктовае крамы** на вул. Прытыцкага, 60. Патрабаваньні да кандыдатаў: адукацыя вышэйшая ці сярэднеспэцыяльная, досьвед працы ня меншы за 3 гады, узрост да 40 гадоў. Зьвяртацца на адрас: вул. Альшэўскага, 24, тэлефон для даведак 59-13-16, 59-13-14.

ЗАТ "Корпак" бярэ на сталую працу: **муляраў, друкароў, наладніка блістэрных машынаў**. Тэлефон для даведак 22-54-23.

МВКП "Рытм", вул. 46-68-07. Патрабуюцца: **прадаўцы, прараб сантэхнічнага ўчастку, бляхары, сакратар-рэфэрэнт** (адукацыя вышэйшая, ангельская мова, ПЭВМ).

Прадпрыемства "Набат" запрашае на працу **распаўсюднікаў квіткоў.** Зьвяртацца на адрас: вул. Лынькова, 5а-10, тэлефон для даведак 50-68-90.

Цэнтар абслугоўваньня пэнсіянэраў возьме на працу **доктара-тэрапэўта.** Зьвяртацца: вул. Ваўпшасава, 33, тэл. 38-54-21.

ТАА "Салён у Галіны" запрашае **манікюрку-пэдыкюрку, камэрцыйнага дырэктара** (адукацыя вышэйшая, досьвед працы).

СП "Гуліта" запрашае да супрацоўніцтва **бугальтара** (досьвед працы ў грамадзкім харчаваньні); **пекара (хлебапёка); кіроўцу** з асабістым аўтамабілем (РАФ ці мікрааўтобус); **загадчыка складам** прадуктаў харчаваньня (мужчына да 50 гадоў, досьвед працы, веданьне бугальтарскага ўліку); **эканаміста** (досьвед працы ў грамадзкім харчаваньні). Звяртацца: вул. Варвашэні, 20, тэл. 39-44-39.

Прадпрыемства Менсклегаўтатранс, вул. Ціміразева, 46, тэл. 26-87-00. **Кіроўца аўтамабіля** (кат. "В", "С"). Патрабаваньні: досьвед працы ня меншы за 1 год, узрост пасьля 20 гадоў.

Санітарна-эпідэміялягічны цэнтар Міністэрства абароны, Менск-57, 9-ы км, тэл. 39-24-68. **Санітарны доктар (гігіена харчаваньня), доктар-таксыколаг, загадчык лябараторыяй (токсыкарадыялягічны аналіз), доктар (лябарант, токсыка-радыёляг).**

ВА "Менскгандальаўтатранс" бярэ на працу **кіроўцаў катэгорыяў "В", "С".** Зьвяртацца: вул. П.Броўкі, 30, тэл. 32-76-91.

Страхавая кампанія "ДДД-Інстрах", вул. Кірава, 13-256, тэл. 20-53-54. **Страхавыя агенты**

АТ "Камуні-Кэйшэн", пр. Ф.Скарыны, 117, тэл. 33-26-90. **Камэрцыйныя агенты (дылеры рэалізацыі пэйджэраў).**

КОШТЫ НА КАМАРОЎЦЫ 24.05.1996 г.

Назва прадукту	Межы коштаў	Сярэдні кошт
МЯСА		
СЬВІНІНА		
- шыя	35.000-45.000	40.000
- філе	40.000-50.000	45.000
- карэйка	28.000-35.000	30.000
- мяса бяз косткі	40.000-50.000	45.000
- ножкі	4000-7000	6000
- галава	9000-12.000	11.000
- сала	18.000-30.000	24.000
ЯЛАВІЧЫНА		
- выразка	35.000-45.000	40.000
- язык	55.000-65.000	60.000
ЦЯЛЯЦІНА		
- выразка	45.000-55.000	50.000
- мяса	28.000-35.000	30.000
- скабы	30.000-40.000	35.000
БАРАНІНА	30.000-40.000	35.000
ПТУШКА		
КУРЫ		
- кураняты бройлерныя	22.000-26.000	24.000
- кумпячкі	20.000-25.000	24.000
Індычка вэнджаная		35.000
МЯСНЫЯ ВЫРАБЫ		
Фарш "Хатні"	30.000-33.000	32.000
Тушаніна сьвіная	16.000-18.000	17.000
ЛІВЭР		
пячонка сьвіная	22.000-26.000	24.000
пячонка ялавічная	40.000-50.000	45.000
пячонка цялячая	55.000-65.000	60.000
пячонка курыная		25.200
паштэт пячонкавы ялавічны		32.000
лёгкія цяляці	8000-12.000	10.000
сэрца цяляці	22.000-27.000	25.000
страўнічкі курыныя		20.300
ВЭНДЖАНЫЯ ВЫРАБЫ		
- грудзінка	36.000-40.000	38.000
- карэйка	43.000-47.000	45.000
- паляндвіца	90.000-100.000	95.000
- шыйка сьвіная	45.000-50.000	47.000
- бэкон	50.000-60.000	55.000
- вяндліна	60.000-70.000	65.000
- карбанад сьвіны	110.000-125.000	120.000
- дымляніна	75.000-82.000	79.000
Шынка сьвіная	70.000-75.000	72.000
Балык	75.000-80.000	78.000
Філей сьвіны	80.000-90.000	85.000
Шчакавіна	30.000-35.000	33.000
Сальцісон	60.000-70.000	65.000
Кумпячок ялавічны		64.500
Рулет з індычкі	59.000-62.000	60.000
Пастрама сьвіная	88.000-90.000	89.000
Сала	25.000-35.000	30.000
ЯГАДЫ, СУШАНІНА		
- разынкі	20.000-35.000	28.000
- курага	35.000-45.000	40.000
- яблыкі сушаныя (1 кг)		6000
- чарнасьліў	15.000-20.000	18.000
- інжыр (250 г.)		15.000
- фінікі	24.000-28.000	26.000
- шыпшына	14.000-18.000	16.000
- трускаўкі сьвежыя (250 г.)		25.000
АРЭХІ І ІНШАЕ		
- семкі белыя (1 кг.)	10.000-15.000	12.000
- семкі чорныя (1 кг.)	7000-8000	7500
- міндаль	55.000-65.000	60.000
- арахіс (1 кг.)	20.000-22.000	21.000
- фундук ачышчаны (120 г.)	6000-8000	7000
- фісташкі (120 г.)	8000-12.000	10.000
- грэцкія ачышчаныя (120 г.)	9000-12.000	10.000
- какос (1 шт.)	10.000-15.000	13.000
ГРЫБЫ		
- сушаныя грыбы (300 г.)	85.000-95.000	90.000
- марынаваныя (літровы слоік)	65.000-70.000	68.000
- пячуркі (1 кг)		40000
МАРЫНАДЫ, КВАШЭНІНІ		
- журавіны марынаваныя (1 л.)	13.000-16.000	15.000
- перац марынаваны	20.000-25.000	23.000
- капуста квашаная	12.000-15.000	13.000
- чарамша (пучок)		5000
- часнык марынаваны	70.000-80.000	75.000
- лісьце вінограду	35.000-45.000	40.000
- морква марынаваная карэйская (тубік)		5000
МАЛОЧНЫЯ ВЫРАБЫ		
- малако каровінае (2 л.)	13.000-16.000	15.000
- малако казінае (1 л.)		15.000
- сыр клінковы		100.000
- масла	38.000-45.000	40.000
- сьмятана (1 л.)	9000-11.000	10.000
- тварог		7.000
- тварог (тлусты)	16.000-20.000	18.000
- брынза	90.000-110.000	100.000
- сулугіні	90.000-110.000	100.000
- маргарын (250 г.)		5600
- маянэз (250 г.)		5300
МЁД		
- грэчкавы (1 л.)	65.000-75.000	70.000
- кветкавы малінава-ліпавы	58.000-64.000	60.000
- травеньскі	58.000-60.000	59.000
- у сотах	115.000-125.000	120.000
- праполіс (1 г.)		2000
СМАЖАНЫЯ ВЫРАБЫ		
Дранікі		3100
Чабурэкі		2600
Смажні		3400
ЯЙКА		
Курынае	10.000-11.000	105.000
КАЎБАСНЫЯ ВЫРАБЫ		
- сардэлькі сьвіныя	27.000-30.000	28.000
- каўбаскі паляўнічыя	55.000-65.000	60.000
- сасіскі малочныя	33.000-35.000	34.000
- сасіскі вэнджаныя	33.000-35.000	34.000
- салямі	53.000-58.000	55.000
- сыравэнджаная каўбаса	100.000-130.000	115.000
- вараная каўбаса	30.000-45.000	40.000
- пальцам пханая	80.000-90.000	85.000
- купаты	40.000-45.000	43.000
ГАРОДНІНА		
- гарбуз (1 кг.)	10.000-12.000	11.000
- бульба	3000-4000	35.000
- цыбуля	3000-4000	3500
- сьв. зялёная цыбуля (пучок)	5000-8000	6000
- морква	5.000-10.000	7.000
- рэдзька	10.000-12.000	11.000
- рэдзькаўка (радыска) (350 г.)		15000
- кабачок	11.000-12.000	11.500
- баклажаны	32.000-60.000	45.000
- перац сьвежы (папрыка)	45.000-60.000	50.000
- хрэн (пучок, 150 г.)	4000-6000	5000
- капуста	7000-10.000	8000
- часнык	35.000-45.000	40.000
- салата	13.000-17.000	15.000
- памідоры	20.000-30.000	25.000
- гуркі	11.000-25.000	17.000
- буракі	3000-5000	4000
- пятрушка (100 г.)	2.000-3.000	5.000
- кукуруза марынаваная (500 г.)		12.000
- гарошак зялёны (слоік 420 г.)		8500
- фасоля	12.000-14.000	13.000

ВУГОРСКІ ПАМІДОРНЫ КАНЦЭНТРАТ
(30 - 32%)
Бочкі па 200 кг
TIM-imex Sp. z o.o., Kraków,
ul. Mazowiecka 25
тэл./факс (012) 33-47-50,
33-45-36, 33-44-55

Назва прадукту	Межы коштаў	Сярэдні кошт
РЫБА ДЫ МОРСКІЯ ПРАДУКТЫ		
- шпроты гарачага вэнджаньня	30.000-40.000	35.000
- гарбуша салёная	30.000-35.000	33.000
- гарбуша халоднага вэнджаньня	50.000-60.000	55.000
- кета халоднага вэнджаньня	90.000-100.000	95.000
- скумбрыя халоднага вэнджаньня	35.000-40.000	37.000
- скумбрыя слабасалёная		28.000
- селядцы	20.000-25.000	22.000
- крэвэткі сьвежамарожаныя (1 кг.)		120.000
- асятрына	320.000-340.000	330.000
- камса салёная		20.000
- ікра чырвоная (140 г.)	70.000-80.000	75.000
- ікра чорная (100 г.)	125.000-135.000	130.000
- камбала (сьвежамарож.)	19500	
- пячонка траскі (300 г.)	25.000-28.000	27.000
- шчупак сушаны (60 см.)	70.000	85.000
- шчупак сушаны (70 см.)	100.000	
- салака	14.000-18.000	16.500
ТРАВЫ Й ПРЫПРАВЫ		
корань салодкі (100 г.)	3000-5000	
аер	3000-5000	
ядловец	3000-5000	
кмен	3000-5000	
чыстацел	3000-5000	
сафара	3000-5000	
мак	10000	
сьвятаяньнік	3000-5000	
любіста	3000-5000	
падбел	3000-5000	
аніс	3000-5000	
каляндра	3000-5000	
ваўчкі	3000-5000	
мэліса	3000-5000	
сухацьвет	3000-5000	
ЦУКЕРКІ ДЫ ІНШЫЯ СЛОДЫЧЫ		
"Суфле"		80.000
"Грыльяж"		80.000
"Сталічныя"		80.000
"Сюрпрыз"		80.000
"Сьліва"		80.000
Халва (1 кг)		25.000
Чучхэла (арэхі ў абалонцы з гранатавага соку) (1 шт)		10.000
ІНШЫЯ ПРАДУКТЫ ДЫ ТАВАРЫ		
Макарона (0,5 кг)		5.500
Мука (1 кг)		6.000
Цукар (1 кг)		7.000
Грэчка (1 кг)		9.000
Рыс (1 кг)	11.000-12.500	
Вехаць з морскай капусты	18.000-20.000	
Туалетная папера		2.500
Гарох		8.000
КВЕТКІ		
- фрэзія (букет з 7 шт.)	16.000-20.000	23.000
- гвазьдзікі (1 шт.)	4.000-8.000	8.000
- калы (1 шт.)	8.000-20.000	23.000
- ружы (1 шт.)	15.000-45.000	43.000
- архідэя (1 шт.)	90.000-200.000	130.000
- касачы (1 шт.)	10.000-13.000	12.000
- ліпея (1 шт.)	35.000-45.000	40.000
- гэрбэры (1 шт.)	12.000-15.000	13.500
- рамонкі (галінка)	2000-3000	2500
- гіяцынт	35.000-45.000	40.000
- актурыюм	15.000-25.000	23.000

НАСЕНЬНЕ

НАЗВА	АДЗІНКА ВЫМЯРЭНЬНЯ	КОШТ
Пятрушка бэрлінская	(5 г.)	500
Бакложан дыямэнт	(2 г.)	700
Кроп	(10 г.)	500
Чабор	(1 г.)	500
Ісоп	(1 г.)	1000
Кукуруза (цукровая)	(10 г.)	300
Гарбуз мозалёўскі	(10 г.)	900
Патысоны	(5 г.)	800
Мэлён (дыня)	(5 г.)	400
Кавун	(10 г.)	600
Перац падарунак Ташкента	(2 г.)	1600
Шчоўе	(10 г.)	500
Рэвень	(2 г.)	300
Шпінат	(10 г.)	700
Гарох Альфа	(50 г.)	800
ЧАСНЫК ЯРАВЫ	(1 кг)	23000
АГУРКІ		
Верасьнёўскія	(1 г.)	5400
Пірэнта	(3 г.)	2500
Лібэла	(3 г.)	2900
Зграбныя	(3 г.)	1100
Дэкан	(3 г.)	1100
Фэнікс	(3 г.)	1100
Ева	(3 г.)	1100
Шуромскія	(10 г.)	1700
Зазуля	(3 г.)	9200
Маратон	(1 г.)	3200
МОРКВА		
Нанцкая	(5 г.)	2000
Ласінаастроўская	(5 г.)	1500
Залацістая, паверхневая (ЗША)	(5 г.)	1300
КАПУСТА		
Браўндшвэйская (позьняя)	(2 г.)	800
Пераможца (сярэдняя)	(2 г.)	800
Цюркіз (позьняя)	(2 г.)	1400
Брусэльская, кальрабі	(1 г.)	500
Квяцістая	(1 г.)	800
Браколі	(3 г.)	1200
БУРАКІ		
Сталовыя бардо	(10 г.)	1800
Кармавыя жоўтыя	(200 г.)	7000
Цукровыя	(20 г.)	800
РЭДЗЬКАЎКА (РАДЫСКА)		
Ультра	(5 г.)	600
Чырвоная зь белым кончыкам	(10 г.)	700
РЭДЗЬКА		
Чорная	(5 г.)	700
Зімняя белая	(5 г.)	700
Рэпа, рэдзька летняя адэская	(5 г.)	700
ПАМІДОРЫ		
Раніца (раньнія)	(1 г.)	900
Пэрсэй (раньнія)	(1 г.)	900
Сонечны, вясёлка	(2 г.)	1600
Ляна (раньнія супэр)	(1 г.)	900
Шаганэ (цяплічныя)	(0,1 г.)	2700
Вэрліёка (цяплічныя)	(0,1 г.)	3400
Стрыж, ірок (цяплічныя)	(0,1 г.)	1100
Перамога (эліта)	(1 г.)	1400
Даходная (эліта)	(1 г.)	1500
Валгаградзкія	(2 г.)	1600
Нота (сярэднераньнія)	(1 г.)	900
КАБАЧКІ		
Белаплодовыя	(10 г.)	1500
Цукіні (залацістыя)	(5 г.)	800
САЛАТА		
Майская, Нансан	(5 г.)	700
Пэкінскія	(2 г.)	400
ЦЫБУЛЯ		
Цыбуля сеянка	(0,5кг)	8000
Чарнушка штутгарцкая	(10 г.)	7200
КВЕТКІ Й ТРАВА		
Газонная трава	(500 г.)	32.000
Астра		
Мадэлен	(2 г.)	900
Півонепадобная сумесь	(1 г.)	1700
Гіянт	(1 г.)	1700
Бальзаміна	(2 г.)	300
Матыёла	(2 г.)	2300
Гадэцыя	(1 г.)	900
Наготкі	(5 г.)	800
Гвазьдзікі		
Турэцкія	(1 г.)	600
Шабо	(1 г.)	1900
Тагетас (аксаміт.)	(1 г.)	1500
ЎГНАЕНЬНІ		
Комплексныя ўгнаеньні	(3к г.)	15000
Амафос	(0,4к г.)	3200
Медны купарвас	(200 г.)	10000
Борная кісьліна	(50 г.)	4800
Комплексныя азотна-фасф.	(1 ампула)	8.500
Сульфат амону	(0,4кг)	1500
Супэрфасфат	(3кг)	17000
Калійныя зь мікраэлемэнтамі	(1 ампула)	8.500
Каль магнэзу	(1 ампула)	8.500
Амонавая кісьліна	(1 ампула)	8.500
Стымулятар росту расьлінаў	(1 ампула)	9.000
Тытунёвы пыл	(500 г.)	4.000
НАБОР ЎГНАЕНЬНЯЎ		
пад таматы		7000
пад гуркі		7000
пад моркву		4100
пад парэчкі		4000

Прыродныя атруты

Кожны дзень на нашым стале з'яўляюца духмяная садавіна, прывабныя сыры й кілбасы, надзвычай карысныя малочныя, мясныя стравы, стравы з гародніны. Але ці шмат хто з нас ведае, што няма аніводнага харчовага прадукту, які, апроч неабходных для нашага арганізму рэчываў, ня меў бы вялікай колькасьці непатрэбных і нават шкодных складнікаў?

Пры вызначэньні якасьці ежы чалавек найперш ацэньвае ейныя смакавыя якасьці й пажыўнасьць – як крыніцу энэргіі для арганізму. Калі пасьля ўжываньня якога-небудзь прадукту праз пэўны прамежак часу не назіралася пагаршэньня самаадчуваньня, ён лічыўся дабраякасным і цалкам добрым для нашага мэню. А вось ужо колькасьць ягонага спажываньня вызначалася асабістымі патрэбамі кожнага чалавека.



Апошнім часам увагу навукоўцаў і мэдыкаў усё больш і больш прыцягвае пытаньне ўплыву на наша здароўе пэўных рэчываў, прысутных у харчовых прадуктах, якія могуць неспрыяльна ўзьдзейнічаць пры доўгім спажываньні й выклікаць хранічныя атручваньні. Дарэчы, апошнія значна небясьпечнейшыя за вострыя атручваньні. Бо пры іх арганізм атручваецца паступова, захворваньне можа праявіцца празь месяцы й нават гады, калі ўжо надзвычай складана высьветліць прычыну захворваньня, а значыць, і вельмі складана яго лячыць.

Асноўныя групы прыродных атрутаў ці, як іх называюць, таксынаў ужо вылучаныя:
- антынутрыенты,
- алькалёіды,
- мэталы,
- грыбковыя атруты,
- бактэрыяльныя атруты.

Трэба адзначыць, што, кожны дзень прымаючы іх у ежу, мы звычайна не адчуваем іхнага адмоўнага ўплыву. Прычынаў таму некалькі. Адна з галоўных у тым, што ў арганізьме ёсьць шмат абарончых сыстэмаў, якія добра адаптаваны пад звыклую ежу. Напрыклад, нацыянальныя, мясцовыя дыеты фармаваліся ня гэтак пад уплывам звычаяў і традыцыяў насельніцтва, як у залежнасьці ад наяўнасьці ў пэўнай мясцовасьці нейкіх прадуктаў харчаваньня. І таму прысутнасьць натуральных атрутаў у мясцовай дыеце, ніжэйшая за пэўную канцэнтрацыю, не ўяўляе пагрозы для здароўя мясцовых жыхароў. Так, таксычнасьць бабоў фаба не небясьпечная для жыхароў Міжземнамор'я й Сярэдняга Ўсходу. Гэтыя бабы выкарыстоўваюцца ў ежу і ў чыстым выглядзе, і ў выглядзе дабаўкі да мукі, а таксама як замяняльнік кавы. На Ўкраіне, у Беларусі й Прыбалтыцы гэтая расьліна вырошчваецца як кармавая культура. У некаторых людзей у крыві можа адсутнічаць фэрмэнт, які абясшкоджвае ягонае атрутнае рэчыва. У выніку доўгага ўжываньня мяса-малочных прадуктаў з гэтых рэгіёнаў у людзей можа разьвіцца вострая гемалітычная анэмія – разбурэньне эрытрацытаў крыві.

Інтаксыкацыя можа наступіць ня толькі пры ўвядзеньні ў ежу новых прадуктаў, але й пры ўжываньні звыклых прадуктаў, апрацаваных нязвыклым чынам. Прыкладам могуць служыць прадукты харчаваньня, стэрылізаваныя з выкарыстаньнем гама-выпраменьваньня. Вядома, што гама-прамяні забіваюць усё жывое. У нашым выпадку яны забіваюць усе бактэрыі й мікраарганізмы, якія ёсьць у прадукце, і разам з тым прадукт захоўвае ўласьцівасьці й смак сырога. Але акрамя гэтага гама-прамяні мяняюць і ўвесь малекулярны склад прадукту. Вострага атручваньня можа й ня быць, але карысная ці шкодная такая ежа – на гэтае пытаньне адказу пакуль няма.

Трэба адзначыць, што колькасьць таксычных рэчываў у прадукце можа моцна зьмяняцца ў залежнасьці ад гатунку расьлінаў ці пароды жывёлы, умоваў вырошчваньня ці атрыманьня прадукту, а таксама ад спосабаў ягонага захаваньня ці кансэрваваньня. Акрамя таго, таксыны могуць утварацца ці назапашвацца ў працэсе росту ці высьпяваньня расьліны або жывёлы. Пры неспрыяльных умовах мікраарганізмы замаруджваюць альбо цалкам спыняюць свой рост і дзяленьне й пераходзяць у неактыўную форму ў выглядзе спораў. Споры ж надзвычай устойлівыя да зьменаў вонкавых умоваў і захоўваюць жыцьцядзейнасьць пры вельмі нізкіх тэмпэратурах, пры награваньні (у некаторых выпадках вышэй за 120°), пры высушваньні, дзеяньні агрэсіўных рэчываў і іншых неспрыяльных чыньнікаў. Калі яны трапляюць ў спрыяльны асяродак, споры хутка пераходзяць у актыўны стан і пачынаюць вылучаць прадукты сваёй жыцьцядзейнасьці, якія часта бываюць таксычнымі. Асноўныя пажыўныя рэчывы для мікраарганізмаў – розныя цукры й сьпірты.

Пасьля ўсяго сказанага пытаньне "ці можна атруціцца добрай, якаснай ежай?" не здаецца такім нечаканым ці неапраўданым. Праблема ў тым, што моцныя атруты з хуткім узьдзеяньнем выявіць лёгка, але цяжка ці практычна немагчыма выявіць рэчывы, што выклікаюць слабае хранічнае атручваньне. У гэтай сытуацыі істотна выпрацаваць агульны мэтадычны падыход да складаньня дыеты – такой, пры якой зьмяншалася б верагоднасьць хранічнага атручваньня ежай. Паспрабуем дапамагчы Вам у гэтай рэчы й даць неабходныя рэкамэндацыі.

Парады спэцыяліста

Не займайцеся адразу ж самалекаваньнем органу, у раёне якога ўзьнікла адчуваньне болю. Лепей зьвярніцеся да доктара – прычына захворваньня можа быць іншая.

Каб выключыць магчымасьць сыстэматычнага схаванага атручваньня прыроднымі харчовымі атрутамі, прааналізуйце сваю дыету за як мага большы пэрыяд часу: якія пераважна прадукты Вы елі, ці не было ў Вас атручваньняў і г. д.

Пры пераходзе на новую дыету паспрабуйце ацаніць верагоднасьць паступленьня новых натуральных атрутаў у арганізм. Праналізуйце ўплыў новай ежы на агульнае самаадчуваньне й на функцыянаваньне некаторых органаў.

Не зьмяняйце звыклага складу ежы й дзённы расклад ейнага спажываньня без асаблівае неабходнасьці, бо абарончыя сыстэмы арганізму найболей прыстасаваныя да звыклага рэжыму працы.

Не захапляйцеся спажываньнем сырой гародніны й садавіны; пракантраляваць наяўнасьць у іх натуральных атрутаў і антынутрыентаў вельмі складана. Цеплавая апрацоўка, квашаньне, саленьне звычайна робяць іх менш небясьпечнымі.

Пажыўная вартасьць бабовых пасьля цеплавой апрацоўкі ўзрастае – за кошт вызваленьня дадатковае колькасьці засвойвальных амінакіслотаў.

Не давайце дзецям многа гарбаты, кавы, какавы. Гэтыя напоі могуць замарудзіць іхны рост.

Харчовыя валокны, што знаходзяцца ў прадуктах у аптымальнай колькасьці, спрыяюць страваваньню, але іхны лішак можа прывесьці да страты арганізмам мінэральных соляў.

Гліказіды капусты зьніжаюць колькасьць ёду ў шчытападобнай залозе, тым самым яны спрыяюць разьвіцьцю вальляку, але стрымваюць разьвіцьцё ракавых захворваньняў.

Колькасьць гліказідаў у сьвежай капусьце можа перавышаць рэкамэндаваныя для бясьпечнага спажываньня ўзроўні.

Узровень колькасьці гліказідаў можа быць ацэнены паводле едкасьці ці пякучасьці – чым больш пякучасьці, тым больш гліказідаў.

Колькасьць гліказідаў у капусьце нашмат меншае пры варцы, шынкоўцы, квашаньні.

Пазьбягайце спажываньня хворай і пашкоджанай бульбы.

Горкі смак бульбы й пякота ў горле сьведчыць пра высокую колькасьць таксычных алькалёідаў.

Галаданьне падвышае засваеньне сьвінцу з вады.

Верагодная канцэнтрацыя сьвінцу ў прадуктах зьмяншаецца ў шэрагу: рыба, вотруб'е, мясныя субпрадукты, садавіна й гародніна, мяса, хлеб, масла, птушка, зеляніна, бульба, малако.

Дабаўкі да пітной вады вуглекіслага вапню й мононатрафасфату сутнасна паніжае засваеньне сьвінцу.

Найбольш распаўсюджаны шлях атручаньня з-за экалягічнага забруджваньня асяродзьдзя – праз спажываньне мясамалочных прадуктаў.

Увядзеньне ў ежу вітаміну С (да 100 мг/дзень) і фруктозы павялічвае засвойвальнасьць жалеза зь ежы ў некалькі разоў.

Аксаляты, фасфаты, таніны й харчовыя валокны, што прысутнічаюць у ежы, замаруджваюць засваеньне жалеза.

Пазьбягайце спажываньня хлеба, збожжавых, садавіны са сьлядамі плесьні. Мэханічнае выдаленьне пашкоджанае паверхні й цеплавая апрацоўка не даюць поўнай гарантыі зьнішчэньня грыбковых атрутаў.

Каб ня ўзьнікла бактэрыяльнага заражэньня, не дапускайце кантакту гатовых харчовых прадуктаў з сырым мясам і мяснымі паўфабрыкатамі.

Нельга ўжываць у ежу кансэрваваныя прадукты зь перавышаным тэрмінам захоўваньня, што захоўваюцца ў неадпаведных месцах у дэфармаваным, парушаным, іржавым пакунку.

Каб пры харчовых атручаньнях бактэрыяльнымі атрутамі выявіць папярэдні дыягназ, пачаць лекаваньне, неабходна ведаць, колькі дакладна часу мінула паміж прыёмам ежы й зьяўленьнем першых прыкметаў атручаньня, а таксама самі прыкметы.

Чым карацейшы пэрыяд праявы першых прыкметаў бактэрыяльнага харчовага атручаньня, тым меншы час выздараўленьня.

Доўгія схаваныя пэрыяды атручаньня (да сутак і болей) маюць на ўвазе найбольш цяжкія паражэньні арганізму й патрабуюць адразу ж інтэнсіўнага лекаваньня.

Гліказідамі багатыя расьліны сямейства крыжакветных – разнастайныя гатункі капусты, рэдзькаўка, рапс, хрэн, гарчыца. Ёсьць яны і ў такім распаўсюджаным пустазельлі, як сьвірэпка й стрэлкі, а таксама ў расьлінах дабародных – ландышах, наперстаўцы й іншых.

Вялікі матэрыял пра таксычнасьць і антыпажыўныя ўласьцівасьці гліказідаў назапашаны на прыкладзе харчаваньня жывёлаў. Так, прысутнасьць гліказідаў у рацыёне сьвіньняў прыводзіць да замаруджваньня росту й зьніжэньня рухавасьці жывёлаў. У птушкі назіраецца памяншэньне вагі бройлераў, зьніжэньне яйканоснасьці, павелічэньне ўнутраных органаў.

На прысутнасьць у харчаваньні гліказідаў рэагуе арганізм і жвачных жывёлаў – у іх малацэ ўтвараюцца вальляўтваральныя рэчывы. А таму што якасьць канчатковай прадукцыі жывёлагадоўлі мае непасрэднае дачыненьне да здароўя чалавека, то й наяўнасьць гліказідаў у корме жывёлы й птушкі ў ідэале не павінна перавышаць 5 мг/г.

Навукоўцамі дасьледаваўся ўплыў гліказідаў і ў лябараторных умовах. Гэтыя рэчывы былі ўведзеныя ў рацыён харчаваньня пацукоў. У тых жывёлаў, якія "зьелі" невялікую колькасьць гліказідаў, праз 90 дзён было адзначана замаруджваньне росту, а пацукі, якія атрымалі большую дозу, памерлі на 55-ы дзень. Пячонка, ныркі й шчытападобная залоза іх былі павялічаныя й мелі паталягічныя зьмены.

Прырода й ступень таксычнасьці гліказідаў харчовых расьлінаў сямейства крыжакветных такая, што яны практычна не выклікаюць вострых атручаньняў, але спрыяюць разьвіцьцю хранічных. Вядомы й той факт, што яны неспрыяльна ўплываюць на функцыю шчытападобнай залозы. Ёсьць зьвесткі, што прыём аднаго з гліказідаў капусты па 100 мг на дзень зьніжае колькасьць ёду ў шчытападобнай залозе, а спажываньне малака з колькасьцю гліказідаў да 100 мг/літар прыводзіць да разьвіцця вальляку.

Адным з найбольш распаўсюджаных і спажываных прадуктаў у многіх рэгіёнах Беларусі ёсьць капуста. Агульная колькасьць гліказідаў у сьвежай капусьце складае: белакачанная – 420-1560 мг/г, савойская – 1210-2960, чырвоная – 600-3900, квяцістая – 610-1140.

Праўда, колькасьць гліказідаў вызначаецца ня толькі гатункам, але й умовамі вырастаньня, хаця ўвогуле яна даволі стабільная. Колькасьць іхную можна вызначыць, ацаніўшы едкасьць ці пякучасьць смаку прадукту. Але, на шчасьце, колькасьць гэтага рэчыва значна скарачаецца пры кожным парушэньні цэласнасьці клетак, а абварка ці варка зьмяншаюць яе за кошт лугаваньня. Таму, каб атрымаць якасную ежу, капусту найлепш ужываць пасьля кулінарнай апрацоўкі. Спосабаў прыгатаваньня шмат: квашаньне, варка, смажаньне й нават проста шынкаваньне.

Зь іншага боку паказана станоўчае дзеяньне гліказідаў: шмат якія дасьледаваньні паказваюць на абарончыя ўласьцівасьці крыжакветных што да разьвіцьця ракавых захворваньняў.

Другая група роднасных гліказідам рэчываў – глікаалкалёіды – у вялікай колькасьці прысутнічаюць у бульбе. Сярэдняя іх канцэнтрацыя ў клубні 2,5-15 мг/100 г, але яна можа перавышаць і 20 мг/100 г. Алькалёіды канцэнтруюцца пераважна пад скуркай, а колькасьць іхная залежыць ад наступных чыньнікаў:
- умоваў вырошчваньня,
- узьдзеяньняў пры захоўваньні й транспартаваньні,
- спадчынных прыкметаў гатунку.

На колькасны склад алькалёідаў у бульбе ўплываюць мэханічныя й хімічныя ўзьдзеяньні на клубень, узровень захаваньня, сьвятло. Напрыклад, пашкоджаны клубень сынтэзуе алькалёіды, якіх не было ў пашкоджанай бульбе.

А вось цеплавая апрацоўка, на жаль, не зьніжае іхнае колькасьці. Вялікая колькасьць гэтага рэчыва надае прыгатаванай бульбе горкі прысмак, выклікае пякучку ў горле. Дазвольная мяжа канцэнтрацыі алькалёідаў у харчовай бульбе – 20 мг/100 г. Але бульба ўспрымаецца як горкая ўжо пры колькасьці 11 мг/100 г. Выпадкі атручаньня зьвязаныя з колькасьцю алькалёідаў 25-30 мг/100 г. Пры атручаньні гэтым рэчывам разьвіваецца дэпрэсія цэнтральнай нэрвовай сыстэмы, у страваваным тракце й на вочным дне назіраюцца судзінныя пашкоджаньні.

У гэтым выпадку ў якасьці станоўчага моманту можна прывесьці толькі тое, што алькалёіды бульбы кепска ўсмоктваюцца ў страваваным тракце й хутка выводзяцца з арганізму.

Нашая парада

Гліказіды капусты зьніжаюць колькасьць ёду ў шчытападобнай залозе, садзейнічаюць разьвіцьцю вальляку, але стрымваюць разьвіцьцё ракавых захворваньняў.

Колькасьць гліказідаў у сьвежай капусьце можа перавышаць рэкамэндаваныя ўзроўні бясьпекі.

Узровень гліказідаў можна вызначыць паводле едкасьці ці пякучасьці смаку: чым большая пякучасьць, тым болей гліказідаў.

Колькасьць гліказідаў у капусьце зьніжаецца пры варцы, шынкоўцы, квашанньні.

Пазьбягайце выкарыстоўваць у ежу хворую й пашкоджаную бульбу!

Горкі смак бульбы й пякучасьць у горле сьведчаць пра высокую колькасьць таксычных алькалёідаў.

Міжнародная сыстэма гатэляў

Гэты матэрыял адрасаваны тым, хто мяркуе карыстацца паслугамі гатэляў за мяжой. Зьвесткі, зь якімі мы Вас азнаёмім, базуюцца на досьведзе 133 тысячаў кліентаў, якія даслалі свае водгукі пра гатэльнае абслугоўваньне ў спажывецкую арганізацыю ЗША.

Чатыры катэгорыі

Добры гатэль павінен зьніжаць цяжкасьці вандраваньня, а не падвышаць іх. Гэта зразумела ўсім. Рэгістрацыя павінна быць хуткай, нумар – ціхім, чыстым і сьветлым, ложак – зручным. Неабходна, каб у ванным пакоі была дастатковая колькасьць ручнікоў і мыла, а тэмпэратура ў нумары лёгка рэгулявалася. Пэрсанал павінен быць уважлівым і гасьцінным... І ўсё гэта пажадана было б мець за памяркоўную плату.

У цяперашнім рэйтынгу гатэлі падзяляюцца на чатыры катэгорыі: танныя, у якіх кліенты плоцяць прыкладна $42 за суткі; гатэлі з памяркоўнай аплатай – прыкладна $59 за суткі; дарагія – прыкладна $84, і шыкоўныя – болей за $100.

У гатэльнай індустрыі адсутнічаюць стандарты, што клясыфікуюць гатэлі. "Афіцыйны даведнік гатэляў", якім карыстаюцца агенты гатэльных службаў, пералічвае толькі дзесяць катэгорыяў нумароў – ад турыстычнае клясы да супэрлюксаў.

Што робіць гатэль добрым? На першае месца выпучаюцца дзьве ўмовы: ветлівы ўмелы пэрсанал і агульны стан самога гатэлю. Таксама адыгрывае ролю колькасьць і якасьць паслугаў, што прапануе той ці іншы гатэль. Больш за 40 працэнтаў кліентаў ацанілі на "выдатна" гатэлі Ritz-Carlton і Four Seasons, нягледзячы на высокія кошты – каля $150 за суткі. 66 працэнтаў кліентаў лічаць, што іх выдатна абслужылі ў гатэлях сеткі Homewood Suites, дзе нумар каштуе каля $75 за суткі. Каля паловы рэспандэнтаў, якія спыняліся ў менш дарагіх, але з добрай рэпутацыяй гатэлях, такіх як Fairfield Inn, Residence Inn, Signature Inn і Hampton Inn, таксама ацанілі іх на "выдатна".

Па чым нумары?

Кліенты канстатавалі, што болей чым у трох чвэрцях выпадкаў яны атрымвалі скідку на замове нумару. Каля паловы пражываньняў прыпадала на так званыя "карпаратыўныя" кошты, ці са скідкамі праз такія арганізацыі, як "Амэрыканская асацыяцыя аўтаматараў" ці "Амэрыканская асацыяцыя пэнсіянэраў". Да арганізацыяў, што забясьпечваюць сваім чальцам скідкі за пражываньне ў гатэлях, належаць таксама прафэсійныя асацыяцыі, прафсаюзы й царкоўныя аб'яднаньні.

Але гэтая інфармацыя наўрад ці дапаможа нашым турыстам за мяжой. Затое вось што ім неабходна ведаць. У большасьці гатэляў ёсьць так званыя "разарылаўкі" – надрукаваныя сьпісы з коштамі за гатэльныя нумары. Як цэтлік на новенькай аўтамашыне, яны паказваюць кошты, якія наўрад ці хто-небудзь плаціў? Навошта ж тады іх усталёўваюць? Уладар аднаго гатэлю, што ўваходзіць у шырокавядомую сетку, падзяліўся: "Дзіўна, колькі людзей настолькі наіўныя, што гатовыя заплаціць першую ж названую суму – вось чаму існуюць такія цэньнікі". У ягоным гатэлі такіх недасьведчаных пастаяльцаў каля 15-20%.

Каб мець уяўленьне пра тыя скідкі, якія можна атрымаць, і прааналізаваць, як залежыць кошт нумару ад спосабу ягонай замовы, было праверана трыццаць гатэляў самых розных катэгорыяў у Лёс-Анджэлесе, Чыкага і Нью-Ёрку. Інфармацыя пра кошты бралася з трох крыніцаў: у офісе кожнай гатэльнае сеткі, непасрэдна ў гатэлі, а таксама ў агентаў гатэльных службаў.

Структура коштаў у гатэлі Chicago Hilton & Towers – велізарным шыкоўным гатэлі ў цэнтры гораду – тыповая. Праз тэлефон нацыянальнай гатэльнае сеткі Hilton кошт называюць $230 за стандартны нумар за суботні дзень у чэрвені. Паводле "спэцыяльных" коштаў можна атрымаць нумар за $109. Непасрэдна ў гатэлі прапануюць стандартны нумар за $190. Ці ёсьць "спэцыяльныя" кошты? Так, нестандартны нумар на "адміністратыўным" паверсе будзе каштаваць $149. Калі ёсьць магчымасьць выкарыстаць папулярную праграму скідак Entertainment Publications, то стандартны пакой будзе каштаваць $150, а нестандартны – $135. Гатэльны ж агент прапануўаў "карпаратыўны" кошт у памеры $165 за стандартны нумар і $105 за нестандартны. Такім чынам, можна заплаціць ад 105 да 230 даляраў за адзін і той жа пакой у адзін і той жа дзень.

У больш танных гатэлях разыходжаньне ў коштах не такое вялікае. Напрыклад, нумар у гатэлі Comfort Inn у Нью-Джэрсі ацэньваўся ў 55, 50 і 35 даляраў. У гэтым выпадку самы нізкі кошт прапанаваў гатэльны агент. У дасьледаваных гатэлях можна зьбіць кошт у сярэднім на 44% ад максымальнага.

Нашая парада

Добры гатэльны агент можа зьнізіць Вашыя выдаткі. Добрасумленны агент праверыць расцэнкі з дапамогаю кампутарнай сыстэмы замовы нумароў, а потым зьвяжацца непасрэдна з гатэлем, каб упэўніцца ў адсутнасьці больш танных нумароў. Аднак толькі тры агенты зь дзесяці, да якіх зьвярталіся ў працэсе дасьледаваньня, патурбаваліся пра гэта. Ні ў водным з трыццаці гатэляў ні словам не абмовіліся пра дадатковыя выдаткі больш за названыя кошты. Гэта вялікі недахоп у такім месцы, як Нью-Ёрк, бо дадатковыя выдаткі складаюць 19-25% за нумар коштам больш за $100 – звычайнага пачатковага кошту для гэтага гораду. Значныя выдаткі і ў гатэлях іншых гарадоў, напрыклад, 14,9% у Чыкага і 14% – у Лёс-Анджэлесе.

Калі Вы замаўляеце нумар самастойна, а не праз гатэльнага агента, пацікаўцеся ў гатэлі пра іншыя тыпы пакояў, якія каштуюць меней. Шмат гатэляў устапёўваюць кошты, зыходзячы з кошту на "лепшыя" нумары. Але звычайна "стандартныя" нумары нічым ад іх не адрозьніваюцца, хаця могуць знаходзіцца на ніжніх паверхах ці мець кепскі выгляд з вакна. У шмат якіх гатэлях старой пабудовы ёсьць нумары зь нязручным плянаваньнем ці меншых памераў, разьмешчаныя ў канцы калідораў ці побач зь ліфтам. Гэтыя пакоі часта каштуюць меней, што адпавядае іхнай якасьці.

Ад танных да шыкоўных

Больш за палову гатэльных сетак, згаданых у рэйтынгу, прызначаюць $60 і меней за суткі. У 1980 годзе гатэльная індустрыя мела каля 160 тысячаў нумароў з памяркоўным коштам, цяпер такіх нумароў больш за мільён, гэта значыць каля траціны ад агульнага кошту гатэльных нумароў у ЗША.

Да 1980 году толькі нямногія зь недарагіх гатэляў былі зьвязаныя з гатэльнымі сеткамі. Некаторыя зь іх былі цудоўна абсталяваныя й квітнелі, але ўсё ж пашарпаная мэбля, нязручныя ложкі й анучы замест ручнікоў былі звычайнаю зьявай. У апошнія гады гэтыя ўстановы былі пераважна выцесьненыя гатэльнымі сеткамі, якія ўключаюць танныя, чыстыя, сучасныя гатэлі для турыстаў, якія дбаюць пра свой бюджэт.

Танныя гатэльныя сеткі, якія найбольш спадабаліся кліентам, як, прыкладам, Fairfield Inn і Budgetel наўрад ці можна назваць "апошнім сховішчам". У іх, праўда, няма рэстарацыяў, затое нумары вельмі сьветлыя й добра абсталяваныя. Так, у Fairfield Inn, гатэлі, які знаходзіцца побач зь міжнародным аэрапортам імя Брэдлі ў Хартфардзе (штат Канэктыкут), вельмі невялікія нумары прадумана абсталяваныя: тэлевізар з дыстанцыйным кіраваньнем, кандыцыянэр, стол. Тут Вам дазволяць бясплатна патэлефанаваць і дадуць бясплатнае стандартнае сьнеданьне. У гатэлі ёсьць таксама адкрыты басэйн з падагрэвам. У разьмешчаным побач гатэлі Butgetel басэйну няма, але бясплатнае сьнеданьне падаецца непасрэдна ў нумар. Нумары ў абодвух гатэлях каштуюць $40 за суткі.

Самыя дарагія гатэлі, адзначаныя ў рэйтынгу як "шыкоўныя", даюць кліентам дадатковыя паслугі, але й каштуюць даражэй. Нумары ў гатэлі Four Seasons у цэнтры Філядэльфіі абсталяваныя мэбляй пад антыкварыят. У распараджэньні кліента – футравыя падушкі, вялізныя ручнікі, некалькі гатункаў шампуняў і мыла, тэлефон у ванным пакоі, міні-бар, і ў дадатак да ўсяго Вас будуць абслугоўваць прыязна й бяз "збояў". Тут добра адпачываць зь дзецьмі. Малодшаму пакаленьню забясьпечана бясплатнае печыва й малако (ці безалькагольныя напоі й пап-корн), відэазапісы й займальныя гульні – і ўсё гэта з дастаўкай у нумар. Можна карыстацца паслугамі няні ці адправіць дзяцей плюхацца ў крытым басэйне, пакуль маці робіць манікюр.

Гатэлі з коштам нумару каля $100 за суткі, такія, як Stouffer, Hyatt Regency і Westin, не прапануюць такога ўзроўню паслугаў. Напрыклад, Hyatt Regency ў Дэнвэры мае прасторныя, утульныя нумары, але нічога такога, што можна знайсьці ў гатэлях, якія каштуюць удвая меней. Гатэль Westin, разьмешчаны побач зь міжнародным аэрапортам у Лёс-Анджэлесе, таксама не вылучаецца чымсьці асаблівым. Асноўнае адрозьненьне гэтых гатэляў ад гатэляў Fairfield Inn і Budgetel (апроч кошту $50 за суткі) – наяўнасьць вялікага холу, залаў для паседжаньняў, стаянкі з аховай і абслугоўваньне ў нумары.

Гора-гатэлі

Гатэлі сеткі Scottish Inns здолелі неяк не задаволіць 37 працэнтаў кліентаў – гэта найгоршы паказьнік у рэйтынгу. Гатэлі HoJo Inn, Rodeway, Park Inn International і Ramada пакінулі незадаволенымі агульным коштам 25 працэнтаў пастаяльцаў. Параўноўвалася, як часта кліенты сутыкаліся з такімі праблемамі, як непрыбраны пакой ці складанасьці з рэгуляваньнем тэмпэратуры ў нумары. Крыху болей за 40 працэнтаў пастаяльцаў гатэляў Scottish Inn паведамілі пра непрыемнасьці, што ўзьніклі падчас іхнага пражываньня. Тое самае адзначае амаль траціна тых, хто спыняўся ў гатэлях Park Inn, HoJo Inn і Motel 6, тымчасам як у гатэлях з высокім рэйтынгам, напрыклад, Ritz-Carlton, Four Seasons і Harrah такія факты вельмі рэдкія – зь імі сутыкнулася меней за 8 працэнтаў пастаяльцаў.

Напрыклад, у гатэлі HoJo Inn на поўдні штату Нью-Джэрсі кандыцыянэр у нумары так лязгатаў, што яго давялося выключыць, а сядушка ў прыбіральні была прапаленая цыгарэтамі – і гэта ў нумары для тых, хто ня паліць! Ліфт у будынку даводзілася браць з боем, што прымушала пастаяльцаў падымацца з рэчамі ў руках на тры песьвічныя пралёты. А вось у нумары гатэлю Motel 6 можа быць зламаны ложак, у Econo Lodge – адсырэлы ванны пакой, у Best Western – кепскае асьвятленьне, а ў Days Inn Вам можа нагрубіць адміністратар.

Акрамя таго, удзельнікі апытаньня часта скардзіліся на дарагоўлю тэлефоннага абслугоўваньня ў гатэлях. Многія гатэлі ўсталёўваюць плату ў 75 цэнтаў, ці каля таго за мясцовы выклік і сапраўды разаральныя дадатковыя расцэнкі на міжгароднія замовы. Так, замова, зробленая праз тэлефаніста гатэля, часта абыходзіцца на 100-200 працэнтаў даражэй. Каб пазьбегнуць такога махлярства, даведайцеся сьпярша пра існыя кошты.

Выбар гатэлю

Калі Вы ня маеце недахопу грошай, то, згодна з дасьледаваньнем, гатэлі Ritz-Carlton і Four Seasons Вам павінныя спадабацца.

Тым ня менш, Вам зусім ня трэба плаціць максымальна. Калі Вы шукаеце добры гатэльны нумар без залішняй раскошы –выбірайце ўважліва! Многія гатэльныя сеткі, што атрымалі высокую ацэнку ў рэйтынгу, даюць нумары коштам ніжэй за $60. Гэта Signature Inn, Hampton Inn, Fairfield Inn і Budgetel. У большасьці гэтых адносна танных гатэляў Вы ня зможаце паабедаць, але гэта можна зрабіць у рэстарацыі, якая звычайна разьмешчана побач.

Гатэль з поўным абслугоўваньнем і рэстарацыяй Вы можаце выбраць сярод Stouffer, Marriott, Doubletree, Wyndham ці Courtyard by Marriott.

Кліенты высока ацанілі гатэлі, якія маюць нумары з усімі зручнасьцямі. Некаторыя з гэтых гатэляў, але ня ўсе, прапануюць абслугоўваньне ў рэстарацыі і ў нумары. Астатнія даюць магчымасьць прыгатаваць ежу ў нумары. Самыя папулярныя гатэлі – Homewood Suites, Residence Inn, Embassy Suites і Guest Quarters Suites.

Нягледзячы на тое, што большасьць гатэляў мае на сваіх шыльдах назвы вялікіх нацыянальных сетак, некаторыя гатэлі знаходзяцца ў руках прыватных гаспадароў. Некаторыя гатэльныя сеткі болей зацікаўлены ў паляпшэньні якасьці абслугоўваньня, а некаторыя – меней, таму канкрэтна выбраны Вамі гатэль можа стацца горшым ці лепшым, чым пазначана ў рэйтынгу. Аднак Вашыя шанцы на задавальняльнае пражываньне павялічацца, калі Вы будзеце прытрымвацца гатэляў, разьмешчаных у верхніх радках рэйтынгу кожнае катэгорыі.

Здымаем... кватэру.
Гатэлі з нумарамі кватэрнага тыпу

Рэспандэнты высока ацанілі гатэлі, у якіх ёсьць нумары, упадкаваныя на прынцып кватэраў. У іх ліку: Homewood Suites, Residence Inn, Embassy Suites, Guest Quartes Suites і Crown Sterling. Гэтыя гатэлі прапануюць нумары, якія складаюцца з гасьцёўні, спальні, а зрэдку – і месца для прыгатаваньня ежы. Такога кшталту гатэлі адкрылі больш за дзясятак нацыянальных гатэльных сетак, уключна з такімі, як Comfort, Hilton, Marriott і Radisson. Дзякуючы вялікай колькасьці такіх гатэляў на гатэльным рынку, у іх звычайна можна зьняць "кватэру" за той самы кошт, за які ў звычайным гатэлі Вы зьняліб толькі пакой. Напрыклад, у гатэлі Embassy Suites у аэрапорце імя О'Хары ў Чыкага нумар зь некалькімі пакоямі можна зьняць за той самы кошт, што й аднапакаёвы такой самай якасьці ў гатэлі, які разьмешчаны побач.

Гатэлі сеткі Homewood Suites, што знаходзяцца на верхняй пазыцыі паводле паказьніка якасьці абслугоўваньня, – самыя папулярныя. У гатэлі Homewood Suites побач з паркам Сьвет Ўолта Дысней ў Арлянда можна зьняць прасторнае памяшканьне са спальняй і добра абсталяванаю кухняй, абедзенным сталом, двума тэлевізарамі, вялікім ванным пакоем, які мае памяшканьне для пераапрананьня, і рассоўнай канапай у гасьцёўні. І гэта ўсё – $70 за суткі.

Аднак некаторыя гатэлі маюць уласнае вызначэньне слова "кватэра". Напрыклад, у гатэлі Quality Suites побач з паркам Дысней – гэта стандартны гатэльны нумар зь нізкаю сьценкай, што адзьдзяляе невялікую прастору з канапай. Так што, перш чым замаўляць нумар, патрабуйце апісаньня "кватэры".

Дзьве трэція кліентаў, якія спыняюцца ў нумарах гатэляў сеткі Homewood Suites далі ім выдатную ацэнку. Гэта найлепшы паказьнік у дасьледаваньні.

Ці бясьпечны Ваш гатэль?

Пра бясьпеку ў гатэлі шмат можна сказаць ужо паводле ключоў ад нумару. Найлепшая сыстэма бясьпекі кліентаў выкарыстоўвае электронныя замкі з ключамі-карткамі, код на якіх можна мяняць пры заезьдзе кожнага новага пастаяльца. Мэталёвыя ключы, што адчыняюць звычайныя замкі з ручкамі, даюць меншую бясьпеку, асабліва калі на іх пазначаны нумар пакою.

Яшчэ менш надзейныя ключы зь бірулькамі, на якіх пазначаныя назва гатэлю й нумар пакою. Нагул, у 15% выпадках кліенты ацанілі бясьпеку гатэляў, у якіх яны спыняліся, як блізкую да незадавальняльнай. Каля 2% удзельнікаў апытаньня паведамілі, што не адчувалі сябе ў бясьпецы падчас пражываньня. Кіраўніцтва гатэляў турбуе гэтая праблема. Адной з прычынаў ёсьць вялікі штрафы за парушэньне закону ў гатэлі. Дасьледаваньне паказала, што ў сярэднім пакараньне адміністарцыі за сьмерць у гатэлі з-за недастаковага забесьпячэньня бясьпекі дасягае 2,2 мільёнаў даляраў; сярэдні штраф за згвалтаваньне – 1,8 мільёнаў даляраў. Менавіта таму на нядаўнім кангрэсе працаўнікоў гатэльнай індустрыі кампаніі, што гандлююць прыладамі для забесьпячэньня бясьпекі, зрабілі добры бізнэс.

"Пастаяльцы напалоханыя злачыннасьцю, а людзі, што напалоханы, не вандруюць, – кажа Энтані Г.Маршал, дэкан Школы гатэльнага мэнэджмэнту пры Фларыдзкам універсытэце. – Гатэльная індустрыя нарэшце дарасла да разуменьня таго, што грошы, выдаткаваныя на бясьпеку, – добрае укладаньне".

Нашая парада

Перш чым пасяліцца, зрабіце праверку гатэля на бясьпеку. У некаторых гатэлях праверка магчымая яшчэ да рэгістрацыі.

Дзьверы ў нумар павінны мець засаўку знутры й вочка.

Засаўкі павінны быць і на ўсіх дзьвярах, што вядуць у сумежныя нумары.

На вокнах, даступных звонку, павінны стаяць моцныя запоры, жалюзі ці краты.

У залях гатэлю не павінна быць закуткаў ці іншых месцаў, дзе мог бы схавацца зламысьнік.

Калідоры павінны быць добра асьветленыя.

Яшчэ лепей, калі дзьверы на калідор таксама зачыняюцца на замок.

Ключы ад нумароў не павінны вісець на дошцы ні ў пакаёўкі, ні ў адміністратара.

У гатэлі, што шчыруе пра бясьпеку сваіх кліентаў, Вам ніколі не назавуць ні прозьвішча пастаяльца, ні нумара займанага ім пакою.

Калі Вы знаходзіцеся ў нумары, ніколі не адчыняйце дзьверы нікому са староньніх, нават службоўцам гатэля, папярэдне не праверыўшы праз тэлефон – ці пасылала адміністрацыя да Вас каго-небудзь.

Калі Вы адчуваеце неспакой у пэўным нумары, без ваганьняў папрасіце перасяліць Вас у іншы.

Электронныя кодавыя замкі з ключом-карткай забясьпечваюць большую бясьпеку, чым звычайныя ключы ад нумароў, бо код можна мяняць для кожнага новага пастаяльца.

Рэйтынгі гатэляў *(паводле катэгорыяў) — паводле памяншэньня якасьці абслугоўваньня*

Шыкоўныя. У гэтэлях гэтай катэгорыі чакайце: прасторны, добра абсталяваны нумар; адна ці болей рэстарацыяў; абслугоўваньне ў нумары; стаянка з аховай; кансьерж; кошт — ад $100 і больш за суткі

Гатэльныя сеткі	*Ацэнка абслугоўваньня* 0 20 40 60 80 100	*Кошт, $ (за суткі)*	*Ацэнка*	*Пэрсанал*	*Стан гатэлю*	*Тэлефон*
Ritz-Carlto		150	★	★	★	800 241-3333
Four Seasons		150	☆	★	★	800 332-3442
Stouffer		110	O	★	★	800 468-3571
Hyatt Regency		110	O	☆	☆	800 233-1234
Westinn		110	O	☆	☆	800 228-3000
Loews		115	O	☆	☆	800 233-6397
Hyatt		100	O	☆	☆	800 233-1234
Omni		95	O	O	O	800 843-6664

Дарагія. У гатэлях гэтай катэгорыі чакайце: большую частку паслугаў, што ёсьць у шыкоўных гатэлях; кошт пражываньня — ад $65 да $90 за суткі.

Гатэльныя сеткі	*Ацэнка абслугоўваньня* 0 20 40 60 80 100	*Кошт, $ (за суткі)*	*Ацэнка*	*Пэрсанал*	*Стан гатэлю*	*Тэлефон*
Harrah's [1]		65	★	☆	☆	800 427-7247
Embassy Suites		90	★	☆	☆	800 362-2779
Guest Quartes Suites		90	☆	☆	☆	800 424-2900
Crown Sterling Suites		90	☆	O	O	800 433-4600
Marriott		90	O	☆	☆	800 228-929)
Doubletree		80	O	O	☆	800 528-0444
Wyndham		79	O	O	☆	800 996-3426
Hilton		90	O	O	O	800 445-8667
Holiday Inn		84	O	O	O	800 465-4329
Crowne Plaza Sheraton		85	O	O	O	800 325-3535
Ramada		90	O	O	O	800 228-9898
Renaissanse [2] Radisson		76	O	O	O	800 333-3333

[1]) гатэлі сеткі Harrah's маюць казыно, што абумоўлівае вялікі раскід у кошце
[2]) перайменаваны ў Renaissance Hotel

Памяркоўныя. У гатэлях гэтай катэгорыі чакайце: стандартныя нумары; адсутнасьць рэстарацыі й абслугоўваньня ў нумары, але разьмешчана рэстарацыя, якая не належыць гатэлю; тыповыя кошты — ад 65 да 90$ за суткі.

Гатэльныя сеткі	*Ацэнка абслугоўваньня* 0 20 40 60 80 100	*Кошт, $ (за суткі)*	*Ацэнка*	*Пэрсанал*	*Стан гатэлю*	*Тэлефон*
Homewood Suites		75	★	☆	★	800 225-5466
Residence Inn		79	★	☆	☆	800 331-3131
Signature Inn		50	★	O	☆	800 822-5252
Hampton Inn		50	★	O	☆	800 426-7866
Drury Inn		50	☆	O	O	800 325-8300
Courtyard by Marriott		65	O	O	☆	800 321-2211
Shoney's Inn		43	O	O	O	800 222-2222
Outrigger		90	☆	O	O	800 462-6262
Red Lion		75	O	O	O	800 547-8010
La Quanta		50	O	O	O	800 531-5900
Shilo Inn		60	O	O	O	800 222-2244
Holiday Inn Express		50	O	O	O	800 465-4329
Comfort		45	O	O	O	800 228-5150
Best Western		50	O	●	●	800 528-1234
Clarion		69	O	O	O	800 252-7466
Quality		50	O	●	●	800 221-2222
Holiday Inn		60	●	●	●	800 465-4329
Park Inn International		59	O	●	●	800 437-7275
Howard Johnson		50	●	●	●	800 654-2000
Ramada		55	●	●	●	800 228-2828

Танныя. У гатэлях гэтай катэгорыі чакайце: нумар з розна.стылёвай мэбляй, адсутнасьць рэстарацыі й абслугоўваньня ў нумары; тыповыя кошты — ніжэй за $50

Гатэльныя сеткі	*Ацэнка абслугоўваньня* 0 20 40 60 80 100	*Кошт, $ (за суткі)*	*Ацэнка*	*Пэрсанал*	*Стан гатэлю*	*Тэлефон*
Fairfield Inn		42	★	O	O	800 228-2800
Budgetel		40	☆	O	O	800 428-3438
Cross Country Inn		40	☆	O	O	800 621-1429
Super 8 Motel		40	O	●	O	800 848-8888
Red Roof Inn		40	O	●	O	800 843-7663
Susse Chalet		50	O	●	●	800 258-1980
Knights Inn		38	O	●	●	800 722-7220
Travelodge		48	O	●	●	800 255-3050
Days Inn		45	●	●	●	800 325-2525
Econo Lodge		40	●	●	●	800 446-6900
Motel 6		32	O	●	●	800 891-6161
Rodeway Inn		45	●	●	●	800 228-2000
HoJo Inn		49	●	●	●	800 446-4656
Scottish Inns		34	●	●	●	800 251-1952

Умоўныя пазначэньні: лепш ★ ☆ O ● горш

ВЫШЭЙШЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ.

Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт інфарматыкі й радыёэлектронікі

Адрэса: 220027, Менск, вул. П.Броўкі, 6, тэл. 39-88-15 (прыёмная камісія), 39-89-58 (падрыхтоўчыя курсы), 39-89-09, 39-89-49, 39-88-07 (канцылярыя), факс: 31-09-14.
E-mail: cit@ micro.rei.minsk.by
Рэктар: Ілын Віктар Макаравіч, кандыдат тэхнічных навук, прафэсар (32-04-51).
Прыём:

Факультэт кампутарнага праектаваньня (32-24-69)

Спэцыяльнасьць	*Спэцыялізацыя*	*Кваліфікацыя*
электронна-аптычнае апаратабудаваньне	электронныя й эліённыя тэхналёгіі ў электронна-аптычным апаратабудаваньні	інжынэр электроннае тэхнікі
мэдычная электроніка		інжынэр электроннае тэхнікі
праектаваньне й вытворчасьць радыёэлектронных сродкаў	праектаваньне радыёэлектронных сродкаў і сыстэмаў кіраваньня; кампутарнае праектаваньне радыёэлектронных сродкаў; праектаваньне, вытворчасьць і тэхнічнае абслугоўваньне радыёэлектронных сродкаў; тэхналёгія мікраэлектроннага абсталяваньня; мікрапрацэсарныя тэхналягічныя сыстэмы	радыёінжынэр-канструктар ці радыёінжынэр-тэхноляг
праектаваньне й тэхналёгія электронных вылічальных сродкаў		радыёінжынэр-канструктар ці радыёінжынэр-тэхноляг

Факультэт інфармацыйных тэхналёгіяў і кіраваньня (32-71-26)

Спэцыяльнасьць	*Спэцыялізацыя*	*Кваліфікацыя*
аўтаматызаваныя сыстэмы апрацоўкі інфармацыі	аўтаматызаваныя сыстэмы апрацоўкі й адлюстраваньня інфармацыі	інжынэр-сыстэматэхнік
аўтаматычнае кіраваньне ў тэхнічных сыстэмах	элемэнты й мэханізмы аўтаматыкі; сыстэмы аўтаматычнага кіраваньня; сыстэмы праграмнага кіраваньня; кампутарнае праектаваньне сыстэмаў кіраваньня	інжынэр аўтаматычнага кіраваньня

Факультэт радыётэхнікі й электронікі (32-71-51)

Спэцыяльнасьць	*Спэцыялізацыя*	*Кваліфікацыя*
мікраэлектроніка	распрацоўка й вытворчасьць мікраэлектронных мэханізмаў і сытэмаў	інжынэр электроннае тэхнікі
радыётэхніка		радыёінжынэр
радыётэхнічныя сыстэмы		інжынэр радыёсыстэмаў
тэхналёгія, эксплюатацыя й рамонт радыёабсталяваньня	эксплюатацыя авіяцыйнага радыёабсталяваньня	радыёінжынэр

Факультэт кампутарных сыстэмаў і сетак (32-42-85)

Спэцыяльнасьць	*Спэцыялізацыя*	*Кваліфікацыя*
праграмнае забесьпячэньне інфармацыйных тэхналёгіяў	праграмнае забесьпячэньне вылічальнае тэхнікі й аўтаматызаваных сыстэмаў; банкаўскія кампутарныя сыстэмы	інжынэр-сыстэматэхнік ці інжынэр-праграміст
вылічальныя машыны, сыстэмы, сеткі	праектаваньне й выкарыстаньне лякальных вылічальных сетак; сыстэмы аўтаматызаванага праектаваньня вылічальных машынаў	інжынэр-сыстэматэхнік
штучны інтэлект		інжынэр-праграміст

Факультэт тэлекамунікацыяў (32-38-65)

Спэцыяльнасьць	*Спэцыялізацыя*	*Кваліфікацыя*
тэлекамунікацыйныя сыстэмы	сыстэмы аўтаматычнай камунікацыі; шматканальныя сыстэмы тэлекамунікацыяў; радыёсувязь, радыёперадаваньне й тэлебачаньне; аптычныя сыстэмы перадачы й апрацоўкі інфармацыі; сеткі й мэханізмы тэлекамунікацыяў	інжынэр тэлекамукацыяў

Эканамічны факультэт (39-84-32)

Спэцыяльнасьць	*Спэцыялізацыя*	*Кваліфікацыя*
эканоміка й кіраваньне прадпрыемствам (фірмай)		інжынэр-эканаміст
эканамічная інфарматыка	арганізацыя аўтаматызаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі	інжынэр-эканаміст

Уступныя іспыты: матэматыка (пісьмова), фізыка (пісьмова), беларуская (расейская) мова й літаратура (твор).
Адукацыйная база: сярэдняя ці сярэдняя спэцыяльная адукацыя.
Форма навучаньня: дзённая (дз), вечаровая (в) і завочная (з).
Тэрмін навучаньня: 5 гадоў (дз), 6 гадоў (з).
Ільготнае паступленьне:
– на вечаровую форму навучаньня залічваюцца асобы, якія пасьпяхова прайшлі сумоўе, без абмежаваньня месцаў (прыём неабмежаваны).
– па-за кантрольнай колькасьцю на вечаровую й завочную форму навучаньня прымаюцца выпускнікі сярэдніх школаў, якія не прайшлі конкурс на дзённую форму навучаньня, з абавязковым потым працаўладкаваньнем паводле спэцыяльнасьці не пазьней, чым праз 4 месяцы;
– мэдалісты могуць вызваляцца ад здаваньня ўступных іспытаў паводле вынікаў сумоўя;
– сумоўе падзіцца ў матэматыцы й фізыцы не пазьней за два дні да першага іспыту (вынікі сумоўя абвяшчаюцца паступоўцам не пазьней, чым наступнага дня).

Прыём дакумэнтаў: з 26 чэрвеня да 15 ліпеня (дз); з 26 да 9 жніўня (в/з).
Здаваньне іспытаў: з 16 ліпеня (дз); з 10 жніўня (з); з 11 жніўня (в).
Неабходныя дакумэнты:
– заява на імя рэктара;
– дакумэнт аб сярэдняй адукацыі (арыгінал) ці копія дыплёму;
– мэдычная даведка формы 086/У;
– выпіска з працоўнае кніжкі (для завочнае формы навучаньня);
– 6 фотакартак памерам 3х4 см;
– пашпарт (паказваецца асабіста).
Платнае навучаньне:
Маецца магчымасьць атрымаць адукацыю платна тым, хто здаў уступныя іспыты, але не прайшоў конкурс.
Прыблізны кошт навучаньня: 900 тыс. руб. за месяц (дз); 8,1 мінімальнага заробку за сэмэстар (з).
Падрыхтоўчыя курсы:
– ёсьць падрыхтоўчае аддзяленьне;
– пяцімесячныя падрыхтоўчыя курсы з 1 лютага (кошт – 450 тыс. руб.).

Вышэйшы каледж сувязі

Адрэса: 220114, Менск, Старабарысаўскі тракт, 8, корп. 2, тэл. 32-45-72 (прыёмная камісія), 64-74-87 (падрыхтоўчыя курсы), 64-95-94, 32-43-81, факс: 64-10-68.
Рэктар: Баркун Міхаіл Андрэевіч, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт (64-44-14).
Прыём:
На факультэце сярэдняй спэцыяльнай адукацыі (Менск) і ў філіі каледжа (Віцебск) ажыццяўляецца навучаньне на базе сярэдняй агульнай адукацыі на спэцыяльнасьцях:

Спэцыяльнасьць	*Кваліфікацыя*	*Тэрмін навучаньня*
аўтаматычныя сыстэмы камунікацыі	тэхнік тэлекамунікацыяў	2 гады 8 мес., 3 гады 4 мес. (завочна)
шматканальныя сыстэмы тэлекамунікацыяў	тэхнік тэлекамунікацыяў	2 гады 8 мес. (навочна), 3 гады 4 мес. (завочна)
радыёсувязь, радыёперадаваньне й тэлебачаньне	тэхнік тэлекамунікацыяў	2 гады 8 мес. (навочна), 3 гады 4 мес. (завочна)
паштовая сувязь	тэхнік паштовае сувязі	1 год 10 мес. (навочна й завочна)
бугальтарскі ўлік, аналіз і аўдыт	бугальтар	1 год 10 мес. (навочна), 2 гады 7 мес. (завочна)

Выпускнікі факультэту сярэдняй спэцыяльнай адукацыі могуць працягваць навучаньне на факультэце вышэйшай адукацыі на спэцыяльнасьцях:

Спэцыяльнасьць	*Кваліфікацыя*	*Тэрмін навучаньня*
тэхнічная эксплюатацыя сыстэмаў і сетак электрасувязі	інжынэр тэлекамунікацыяў	3 гады 2 мес. (навочна), 3 гады 10 мес. (завочна)
паштовая сувязь	інжынэр сувязі	2 гады 8 мес. (навочна), 3 гады 10 мес. (завочна)
эканоміка й кіраваньне прадпрыемствам сувязі	інжынэр-эканаміст	3 гады 2 мес. (навочна), 3 гады 10 мес. (завочна)
маркетынг у галіне сувязі	мэнэджэр	3 гады 2 мес. (навочна), 3 гады 10 мес. (завочна)

Адукацыйная база: сярэдняя адукацыя.
Форма навучаньня: дзённая (дз), завочная (з).
Прыём дакумэнтаў: з 26 чэрвеня да 15 ліпеня (дз), з 20 чэрвеня да 22 ліпеня (з).
Здаваньне іспытаў: ліпень-жнівень.
Неабходныя дакумэнты:
– заява на імя рэктара;
– дакумэнт аб сярэдняй адукацыі (арыгінал);
– накіраваньне прадпрыемства ці арганізацыі (для завочнага навучаньня);
– мэдычная даведка формы 086/У;
– выпіска з працоўнае кніжкі (для завочнае формы навучаньня);
– 6 фотакартак памерам 3х4 см;
– пашпарт (паказваецца асабіста).
Платнае навучаньне:
Маецца магчымасьць атрымаць адукацыю платна тым, хто здаў уступныя іспыты, але не прайшоў конкурс.
Прыблізны кошт навучаньня: 900 тыс. руб. за месяц (дз); 8,1 мінімальнага заробку за сэмэстар (з).
Падрыхтоўчыя курсы:
– ёсьць падрыхтоўчае аддзяленьне;
– пяцімесячныя падрыхтоўчыя курсы з 1 лютага (кошт

Менскі дзяржаўны вышэйшы лётна-тэхнічны каледж

Адрэса: 220096, Менск, вул. Убарэвіча, 77, тэл. 40-62-57, 41-46-44.
Рэктар: Сідаровіч Мікалай Андрэевіч (41-66-32).
Прыём:

Спэцыяльнасьць	*Спэцыялізацыя*	*Кваліфікацыя*
тэхнічная эксплюатацыя паветранага транспарту	тэхнічная эксплюатацыя авіяцыйных вылічальных і інфармацыйных комплексаў аэрапортаў	тэхнік-электронік авіяцыйных вылічальных і інфармацыйных комплексаў аэрапортаў
—"—	тэхнічная эксплюатацыя радыёэлектронных комплексаў самалётаў	тэхнік-радыёэлектронік радыёэлектронных комплексаў самалётаў
—"—	тэхнічная эксплюатацыя бартавых пілятажна-навігацыйных і энэргетычных комплексаў самалётаў	авіяцыйны тэхнік-электронік бартавых пілятажна-навігацыйных і энэргетычных комплексаў самалётаў
—"—	тэхнічная эксплюатацыя радыётэхнічных комплексаў забесьпячэньня палётаў	тэхнік-радыёэлектронік наземных радыётэхнічных комплексаў забесьпячэньня палётаў
тэхнічная экспэртыза лётных апаратаў і авіярухавікоў		тэхнік-мэханік лётных апаратаў і авіярухавікоў
арганізацыя руху й кіраваньне на траспарце	кіраваньне рухам на паветраным транспарце	дыспэтчар кіраваньня паветраным рухам (пасьля 1-га ўзроўню); інжынэр кіраваньня рухам на паветраным транспарце (пасьля 1-га й 2-га ўзроўняў)

Уступныя іспыты: матэматыка (вусна), расейская мова й літаратура (пісьмова).
Форма навучаньня: дзённая.
Тэрмін навучаньня: 3 гады 10 месяцаў.
Прыём дакумэнтаў: з 1 ліпеня.
Здаваньне іспытаў: з 15 ліпеня.
Залічэньне: да 20 жніўня.
Неабходныя дакумэнты:
– заява;
– дакумэнт аб сярэдняй адукацыі (арыгінал);
– мэдычная даведка формы 086/У;
– 4 фотакартак памерам 3х4 см;
– пашпарт (паказваецца асабіста).
Дадатак:
– абітурыенты праходзяць мэдычную камісію ў каледжы;
– навучэнцы знаходзяцца на поўным дзяржаўным утрыманьні.

Менскі дзяржаўны вышэйшы радыётэхнічны каледж

Адрэса: 220005, Менск, пр. Ф.Скарыны, 62, тэл. 32-01-62, 32-44-25, факс: 31-89-45.
Рэктар: Цыральчук Мікалай Андрэевіч, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт (32-62-85).
Прыём:

На аснове базавай адукацыі (9 клясаў):

Спэцыяльнасьць	*Спэцыялізацыя*	*Кваліфікацыя*
вытворчасьць радыёэлектронных сродкаў (дз)		радыётэхнік
эксплюатацыя й рамонт радыёабсталяваньня (дз)	эксплюатацыя й рамонт побытавай радыёэлектратэхнікі	радыётэхнік
вытворчасьць электронных вылічальных сродкаў (дз)	эксплюатацыя й тэхнічнае забесьпячэньне электронных вылічальных сродкаў	тэхнік-электронік
мікраэлектроніка		тэхнік-тэхноляг
праграмнае забесьпячэньне інфармацыйных тэхналёгіяў (дз)	праграмнае забесьпячэньне сыстэмаў апрацоўкі матэматычнай інфармацыі	матэматык-праграміст
—"—	праграмнае забесьпячэньне сыстэмаў апрацоўкі эканамічнай і справавой інфармацыі	праграміст-бугальтар-рэфэрэнт
прафэсійнае навучаньне (дз)		радыёінжынэр-пэдагог

На аснове агульнай сярэдняй адукацыі (11 клясаў):

Спэцыяльнасьць	*Спэцыялізацыя*	*Кваліфікацыя*
вытворчасьць радыёэлектронных сродкаў (дз/з)		радыётэхнік
эксплюатацыя й рамонт радыёабсталяваньня (дз/з)	эксплюатацыя й рамонт побытавай радыёэлектратэхнікі	радыётэхнік
праграмнае забесьпячэньне інфармацыйных тэхналёгіяў (дз)	праграмнае забесьпячэньне сыстэмаў апрацоўкі матэматычнай інфармацыі	матэматык-праграміст
—"—	праграмнае забесьпячэньне сыстэмаў апрацоўкі эканамічнай і справавой інфармацыі	праграміст-бугальтар-рэфэрэнт
камэрцыйная дзейнасьць (дз/з)	камэрцыйная дзейнасьць на рынку радыёэлектронных тавараў і паслугаў	камэрсант
прафэсійнае навучаньне (дз/з)		радыёінжынэр-пэдагог

Заўвагі да табліцаў:
Прыём на спэцыяльнасьць прафэсійнае навучаньне ажыццяўляецца зь ліку навучэнцаў каледжу другога ўзроўню (дз) і на базе сярэдняй спэцыяльнай адукацыі (з).
Падрыхтоўка спэцыялістаў у каледжы ажыццяўляецца на 3-х узроўнях у адпаведнасьці са схемай



1 узровень – падрыхтоўка асобаў зь сярэднеспэцыяльнай адукацыяй.
2 узровень – падрыхтоўка асобаў з паглыбленай сярэднеспэцыяльнай адукацыяй, з базавымі прадметамі вышэйшай навучальнай установы.
3 узровень – падрыхтоўка асобаў з вышэйшай адукацыяй на спэцыяльнасьці прафэсійнае навучаньне з кваліфікацыяй радыёінжынэр-пэдагог.
Адбор на другі ўзровень адбываецца пасьля заканчэньня 2-га курсу першага ўзроўню. Адбор на трэці ўзровень ажыццяўляецца пасьля заканчэньня 3-га курсу другога ўзроўню.
На кваліфікацыі праграміст-бугальтар-рэфэрэнт і камэрсант падрыхтоўка адбываецца толькі на першым ўзроўні, на кваліфікацыі матэматык-праграміст – на першым і другім узроўнях.
Уступныя іспыты: матэматыка (вусна); беларуская (расейская) мова (дыктоўка).
Форма навучаньня: дзённая (дз) і завочная (з).
Ільготнае паступленьне:
Пры наяўнасьці конкурсу сярод мэдалістаў робіцца адзін іспыт – матэматыка (вусна). Пры атрыманьні выдатнай адзнакі яны залічваюцца ў каледж.
Паводле вынікаў сумоўя на завочную форму навучаньня залічваюцца:
– асобы, якія скончылі сярэднюю школу ці прафэсійна-тэхнічную вучэльню на базе няпоўнай сярэдняй адукацыі з адзнакамі "4" і "5", прафэсійна-тэхнічныя вучэльні на базе сярэдняй адукацыі з адзнакай, калі яны паступаюць у каледж на блізкую спэцыяльнасьць і працуюць паводле абранае спэцыяльнасьці;
– вайскоўцы на працягу 3-х гадоў пасьля звальненьня ў запас;
– жонкі вайскоўцаў;
– інваліды 1 і 2 групаў;
– беспрацоўныя жанчыны зь дзецьмі да 3-х гадоў.
Платнае навучаньне:
Маецца магчымасьць атрымаць адукацыю платна асобам, якія здалі ўступныя іспыты, але не прайшлі конкурс.
Прыблізны кошт навучаньня: 4 мінімальныя заробкі за месяц.
Тэрмін навучаньня: 4-6 гадоў у залежнасьці ад узроўню навучаньня.
Прыём дакумэнтаў: з 1 чэрвеня да 31 ліпеня (дз), з 3 траўня да 10 жніўня (з).
Здаваньне іспытаў: з 1 да 20 жніўня (дз); з 10 да 20 жніўня (з).
Залічэньне: да 30 жніўня.
Неабходныя дакумэнты:
– заява;
– дакумэнт аб базавай сярэдняй адукацыі (арыгінал);
– накіраваньне, а пасьля залічэньня ў каледж індывідуальная замова прадпрыемстваў ці арганізацыяў, якія маюць патрэбу ў падрыхтоўцы спэцыялістаў;
– мэдычная даведка формы 086/У (у даведцы абавязкова падаецца колераўспрыманьне й вастрыня зроку – вастрыня зроку павінна быць не ніжэйшай за 0,8 для найлепшага вока і 0,5 для найгоршага з карэкцыяй да 4Д, для спэцыяльнасьці мікраэлектроніка – 1,0);
– выпіска з працоўнае кніжкі, пацьверджаная адміністрацыяй (для тых, хто мае стаж працы ці для завочнае формы навучаньня);
– 4 фотакарткі памерам 3х4 см;
– пашпарт (паказваецца асабіста).
Падрыхтоўчыя курсы: ёсьць (32-27-61).

НОВЫЯ КНІП, ПРЫСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Беларуская Энцыкляпэдыя: У 18 т. Том 1: А - Аршын - Менск: БелЭн, 1996. - 552 с. Наклад 10.000. ISBN985-11-0036-6 (Т. 1). ISBN985-11-0035-8.
Пачатак 18-тамовай Універсальнай Беларускай Энцыкляпэдыі. Асноўны інфармацыйны блёк у гэтым томе падрыхтаваны яшчэ за рэдактарствам Барыса Сачанкі.

Лепешаў І.Я., Якалцэвіч М.А. Слоўнік беларускіх прыказак: Даведнік. - Менск: БелЭн, 1996. - 352 с. ISBN 985-11-0046-3. 6000 ас. Апісваецца й тлумачыцца тысяча найбольш ужывальных прыказак, даецца іх сытуатыўная ды стылёвая характарыстыка.

Скрыжалі «Спадчыны»: Альманах. Вып. 2 - Менск: Выдавецтва клюбу «Спадчына», 1996. - 240 с. ISBN 985-6007-16-X Новы тып выданьняў для Беларусі - клюбнае выданьне. Са сваімі спэцыфічнымі тэмамі, сваімі недахопамі, са сваімі бясспрэчнымі посьпехамі.

Апошні зборнік

З глыбі вякоў. Наш край: Гісторыка-культуралягічны зборнік. Выпуск I. — Менск: Навука і тэхніка, 1996. — 288 с., іл. 500 ас. ISBN 5-343-01480-1.

Аматары айчыннай даўніны нарэшце пабачылі працяг шматабяцальнае сэрыі зборнікаў пад назвай «З глыбі вякоў. Наш край». Нагадаем, што першая кніжка выйшла ажно ў 1992 г. і ня мела ніякага нумару. Сёлета выйшла другая кніжка, якая задала чытачам загадку: як высьвятляецца, менавіта яна — гэта выпуск першы. Як і чатыры гады назад, выдаўцы зноў абяцаюць ператварыць праект у штогоднік. Цяпер гэта гучыць сумна. Уражвае і наклад кнігі: першай выйшла 5000 асобнікаў, другой («першай») — 500. Аматары матэматыкі лёгка падлічаць, калі выйдзе трэці выпуск «штогодніка» і які ён будзе мець наклад.

Цяпер пра зьмест. Выданьне трымаецца на вельмі высокім прафэсійным узроўні, пры гэтым беларускія гісторыкі, здаецца, навучыліся пісаць ня толькі для калегаў, але і для паспалітага чытача. Гэтую кнігу людзі прачытаюць ня толькі з карысьцю, але і з цікавасьцю. На першае месца выдаўцы паставілі артыкул В.Насевіча і М.Сьпірыдонава пра землі «Русі» ў складзе ВКЛ у XVI ст. Іх выснова мае вялікае навуковае значэньне — паводле дакумэнтальнага масіву, Русьсю ў тыя часы зваліся землі толькі Ўсходняе Беларусі, прыкладна да лініі Браслаў — Менск — Глуск — Мазыр. Астатнія дзьве гістарычныя вобласьці Беларусі зваліся на той час «Літва» і «Палесьсе». Цікава і тое, што ў актавым матэрыяле XVI ст. назва «Белая Русь» сустрэлася толькі аднойчы. У XVII ст. яна выкарыстоўваецца ўжо досыць шырока.

Шэраг артыкулаў зборніка прысьвечаны гісторыі матэрыяльнай культуры: маёліцы XVI-XVIII ст. (І.Ганецкая), кафляным печам XIV ст. (А.Дзярновіч), шкларобству Магілёўшчыны (А.Сташкевіч). Аўтару апошняга артыкула, на жаль, не ўдалося адшукаць новых зьвестак пра шкларобства ў параўнаньні зь вядомай кнігай І.Мялешкі. Звесткі пра тое, што магілёўскія купцы скрынямі вазілі ў Маскву люстраное шкло, сьведчаць зусім не пра мясцовую вытворчасьць такога тавару.

Шмат артыкулаў зборніка прысьвечана публікацыям матэрыялаў з археалягічных раскопак (Т.Бубенька, Н.Здановіч, М.Крывальцэвіч). Некаторыя артыкулы ўводзяць у навуковы ўжытак новыя арыгінальныя матэрыялы: «слупавыя» пахаваньні радзімічаў (А.Макушнікаў), пячаткі ВКЛ XIV-XV ст. з выявамі вершнікаў, якія паслужылі крыніцай для рэканструкцыі ўзбраеньня (Ю.Бохан). Ёсьць артыкулы, прысьвечаныя асобным археалягічным помнікам: гарадзішчу каля в. Горы (А.Мяцельскі, М.Ткачоў), тарфянікавай стаянцы Заценьне (М.Чарняўскі), Крэўскаму замку (А.Трусаў), Лаўрышаўскаму манастыру (А.Краўцэвіч), Гальшанскаму кляштару (В.Кукуня, А.Кушнярэвіч), позьнефэадальнаму паселішчу каля в. Сямёнавічы (В.Шаблюк). Зьмешаныя працы з пэўным абагульненьнем археалягічнага матэрыялу, прысьвечаныя культуры штрыхаванай керамікі (А.Мядзьведзеў) і падводнай археалёгіі (С.Каблоў).

Як бачым, у кнізе пераважаюць археалягічныя працы, таму падзагаловак «Гістарычна-культуралягічны зборнік» наводзіць на думку: што разумеюць складальнікі пад культуралёгіяй? Больш пасаваў бы падзагаловак «Гістарычна-археалягічны зборнік», але такі ўжо выдаецца энтузіястамі Інстытуту гісторыі Акадэміі Навук. Дарэчы, некалькі разоў на год.

Як пэўная экзотыка выглядаюць у канцы кнігі вялікія рэзюмэ артыкулаў на расейскай мове. Гэта крок назад (на ўсход?) ад першага выпуску, дзе рэзюмэ былі таксама і па-ангельску.

Валеры Пазьнякоў

Кніга — поштай

На складзе Фонду "Наша Ніва" маюцца кнігі:

1. Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы. — Менск: Сучасная літаратура, 1995. — 310 с.
Кнігі новае сэрыі "Сучасная літаратура" разьлічаныя на поўную самаакупнасьць. Займальныя сюжэты, даваральны тон, даступнасьць — характарыстыкі гэтае сэрыі.
41.000 БРБ

2. Адам Глёбус. Скрыжаваньне. — Менск: БАДППР — "Ковчег", 1993. — 46 с.
Апошні зборнік вершаў Адама Глёбуса. Многія з гэтых тэкстаў сталі агульнавядомымі песьнямі, многія перакладаліся на розныя мовы.
7.000 БРБ

3. Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі. — Менск: БФС — 1995. — 272 с.
Кніга прысьвечана шматлікім трансфармацыям нацыяналізму ў нашым стагодзьдзі, параўнаньню яго з такімі ідэалёгіямі "выратаваньня сьвету", як камунізм, фашызм, расізм.
20.000 БРБ

4.Джын Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку. — Менск: БФС — "Кліч", 1995. — 312 с.
Псыхалінгвістыка — новая галіна ведаў. Даследаваньне прысьвечанае аналізу таго, што ў нашай мове ёсьць вынікам навучаньня, а што мае біялягічныя перадумовы.
20.000 БРБ

5. Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны. — Вільня, 1994. — 192 с.
Гісторыя ахвярнага каханьня набожнай жанчыны і безнадзейна хворага мужчыны. Яна — дачка віленскага купца немца Юліяна Мэнке, ён — беларускі палітык і антыквар Іван Луцкевіч.
29.000 БРБ

6. Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчынскі / Пераклад з польскай. — Вільня-Менск: "Наша Ніва" — "Мастацкая Літаратура", 1994. — 93 с.
Клясык польскай паэзіі Баляслаў Лесьмян (1878-1937) стварае маляўнічы й зваблівы сьвет інтымных перажываньняў чалавека.
17.000 БРБ

7. Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША. — Менск, 1993. — 352 с.
У кнізе беларускага эміграцыйнага дасьледніка ўсебакова разглядаецца гісторыя і сёньняшні дзень беларускай дыяспары ў Злучаных Штатах Амэрыкі.
29.000 БРБ

8. Беларускі рак-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс"). — Менск: "Ковчег", 1994. — 64 с.
7.000 БРБ



Каб атрымаць патрэбную Вам кнігу, трэба пералічыць пазначаную суму грошай на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. Не забудзьцеся падаць свой адрас.

1. Калосьсе, №1-1993. — 60 с.
У нумары зьмешчаныя творы Юрася Пацюпы, Леры Сом, Ігара Сідарука, Алеся Аркуша, Юрыя Гуменюка, Кастуся Гаманца і іншых, успаміны Андрэя Чэмера і Анатоля Іверса пра віленскае "Калосьсе" 30-х гадоў і ягонага рэдактара Янку Шутовіча.
10.000 БРБ

2. Калосьсе №2-3-1995. — 144 с.
Творы Хведара Ніцкі, Славаміра Адамовіча, Вінцэся Мудрова, Ігара Сідарука, Алены Шаціла, Васіля Кроквы, першая кніга "псыхадзічнага" рамана Юрыя Гуменюка "Апосталы Нірваны".
25.000 БРБ

3. Вінцэсь Мудроў. Жанчыны ля басэйна. — Менск: Мастацкая літаратура, 1992. — 160 с.
Першы зборнік прозы аднаго з "дыназаўраў" сучаснага беларускага андэграўнду.
15.000 БРБ

4. Юры Гумянюк. Твар Тутанхамона. — Полацак: Полацкае ляда, 1994. — 52 с.
Другі паэтычны зборнік паэта-постмадэрніста. Вершы: "Прагулянка маркіза дэ Сада", "Гарэлкі поўны капялюш", "Фанэра над Парыжам", "Сьлімакі" ды іншыя.
10.000 БРБ

5. Алесь Аркуш. Разьвітаньне з Танталам. — Полацак: Полацкае ляда, 1994. — 54 с.
Зборнік вершаў, пострамантызм, "нешта больш салодкае за Рай і страшнейшае за Пекла — блуканьне па кругах уласнае душы. Самастойна. Без Вэргілія" (Алена Шаціла).
10.000 БРБ

6. Ігар Сідарук. Саната Арганата. — Полацак: Полацкае ляда, 1994. — 64 с.
Ненармаваная лексыка, жудасныя сюжэты, "любошчы".
10.000 БРБ

7. Лявон Вольскі. Калідор. — Полацак: Полацкае ляда, 1993. —38 с.
Зборнік паэзіі, які вядомы паэт-рокер напісаў у адзінаццаці інастасях.
10.000 БРБ

Каб атрымаць патрэбную Вам кнігу, пералічыце названую суму грошай на адрас: Алесь Козік, Наваполацак-11, п/с 36. Не забудзьце падаць свой адрас.

На складзе Фонду "Наша Ніва" ёсьць на продаж касэты:



1. НОВАЕ НЕБА. Сон у трамваі: Сон у трамваі; Выбар; А ты забудзь маё імя; Жахлівая прыгажосьць; Дом; Калыханка; Таму што;Той, хто стаіць у мяне за плячыма.
2. НОВАЕ НЕБА. Go home (1995): Прэзыдэнт, ідзі дамоў; Дакраніся да вады; Падае сьнег; Крот-2; Электарат; Цемра; Выгнаны сын; Канцэрт у Westclub 7 сакавіка 1995 г. (жывы гук).
3. КРАМА. Хворы на Rock-n-Roll: Бяжы, хлопец; Здраднік; Хворы на рок-н-рол; Выпі са мной да дна; Чыкага найтс; Каханьне а шостай гадзіне; Стэфка; Мне мой сябра сказаў; Новая кроў; Будзь разам з намі.
4. N.R.M. LaLaLaLa (1995): Белыя лебедзі; Нацыя; Дарога; Мітусьня; Не ходзіце ў цёмны лес (Зомбі); Бацька; Трактар; Дзе тое слова; Дайце; Бывай; Лалалала; Халі-галі.
Пятніца 11.00 Размаўляючы з Амэрыкай. У фокусе Амэрыка. Асновы кіраваньня. Навука. Агляд лістоў. 12.00 Усходні мэрыдыян. 16.00 Радыёаб'ектыў. 19.00 Паўтор з 12.00. 20.00 Так кажуць у Амэрыцы. Маладзёжная праграма. Для жанчын. Мэдыцына. 21.00 Падзеі і роздум 22.00 Так кажуць у Амэрыцы. Маладзёжная праграма. Для жанчын. Мэдыцына. 23.00 Паўтор з 12.00. 04.00 Ранішняя праграма. 06.00-06.30 Паўтор з 05.00.

Радыё "Нямецкая хваля"



Панядзелак 23.00 Навіны. Агляд сусьветнага друку. Культура сёньня. Занятак нямецкае, курс 3. 23.50 Афіша тыдня. 02.00 Навіны. Занятак нямецкае, курс 1. Парад зорак. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Рэлігія і царква. Трыбуна. Музыка: джаз. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Рэлігія і царква. Трыбуна. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Аўторак 23.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Рэлігія і царква. Трыбуна. Музыка: джаз. 06.50 Інфармацыя пра парадачы. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. Трыбуна. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Эўропа і эўрапейцы. Культура сёньня. Музыка: клясыка. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. Трыбуна. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Эўропа і эўрапейцы. Культура сёньня. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Серада 23.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Эўропа і эўрапейцы. Культура сёньня. Музыка: клясыка. 06.50 Інфармацыя пра перадачы. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. Эўропа і эўрапейцы. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Рынак і чалавек. Чытальная заля. Музыка: фанатэка. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. Эўропа і эўрапейцы. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Рынак і чалавек. Чытальная заля. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Чацьвер 23.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Рынак і чалавек. Чытальная заля. Музыка: фанатэка. 06.50 Інфармацыя пра перадачы. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. Рынак і чалавек. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Нямеччына зь першых рук. Масты. Паштовая скрыня. Народныя мэлёдыі. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. Рынак і чалавек. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Нямеччына зь першых рук. Масты. Паштовая скрыня. Народныя мэлёдыі. 06.50 Інфармацыя пра перадачы. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. Нямеччына зь першых рук. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Дыскусійны клюб. Музыка: топ-хітс. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёкроніка. Нямеччына зь першых рук. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Занятак нямецкае, курс 1. Народныя мэлёдыі. Афіша тыдня. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Субота 23.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Дыскусійны клюб. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Дыскусійны клюб. Музыка: топ-хітс. 06.50 Інфармацыя пра перадачы. 18.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Дыскусійны клюб. Масты. Паштовая скрыня. 19.00 Навіны. Агляд сусьветнага друку. Ліст з Парыжу/ Бэрліну. Парад зорак. 20.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Дыскусійны клюб. Масты. 21.00 Навіны. Агляд сусьветнага друку. Ліст з Парыжу/Бэрліну. Афіша тыдня. Занятак нямецкае, курс 1. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Нядзеля 23.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Кроніка тыдня. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Кроніка тыдня. Ліст з Парыжу/ Бэрліну. Афіша тыдня. 18.00 Навіны. Агляд сусьветнага друку. Занятак нямецкае, курс 3. Парад зорак. 19.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Кроніка тыдня. Музыка: топ-хітс. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Ліст з Парыжу/Бэрліну. Афіша тыдня. Культура сёньня. Чытальная заля. 21.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Рэлігія і царква. Занятак нямецкае, курс 3. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Схема перадаваньня НХ

Менскі час	Частоты ў кілягерцах (КХ)			
23.00-23.50	5925	5980	6000	7130 7235
02.00-02.50	5925	6035	7285	9815 9865
06.00-06.50	6055	7120	7285	9690
18.00-19.55	5945	5980	6010	7145 9715
20.00-21.30	5945	5980	6010	7145 9715
20.00-21.50	5980	6010	7145	9715

"Міжнароднае радыё Карэі"



Тматычны расклад з 1 красавіка 1996 г.

Перадачы на расейскай мове

Працягласць:

00-10 Навіны Панядзелак, аўторак, серада, чацьвер, пятніца, субота, нядзеля

10-15 Камэнтар (усе дні, апроч нядзелі). Нядзеля —Творчасьць сучасных карэйскіх пісьменьнікаў.

15-35 Сэул сёньня (панядзелак — чацьвер). Пятніца — Занятак карэйскае мовы. Субота — На шляху да зьяднаньня. Нядзеля —Творчасьць сучасных нямецкіх пісьменьнікаў.

35-40 Эканамічная кроніка (панядзелак — пятніца). Субота — У сьвеце паўднёва-карэйскае музыкі. Нядзеля — Паштовая скрыня.

40-45 Панядзелак — Карэйцы пра сябе і сьвет. Аўторак — Спадчына карэйскай культуры. Серада — Насустрач наступнаму стагодзьдзю. Чацьвер — Вандраваньні па новай Карэі. Пятніца — Прыгажосьць родных сьпеваў. Субота — У сьвеце паўднёва-карэйскае музыкі. Нядзеля — Паштовая скрыня.

55-60 Карэя: краіна й людзі (панядзелак — пятніца). Субота — У сьвеце паўднёва-карэйскае музыкі. Нядзеля — Паштовая скрыня.

Час	Частоты (кГц)	Хвалі (м)
1.00 - 2.00	1170,5975, 6135, 7275	50,21; 48,90; 41,24
19.00 - 20.00	6480,15335	46,29;19,56
22.00 - 23.00	5975	50,21

Нашыя перадачы вядуцца 10,5 гадзінаў на дзень на 21 частаце (20 — на кароткіх і 1 — на сярэдніх хвалях).

Радыё Швэцыі

Radio Sweden

Па расейску

Перадачы "Радыё Швэцыі" на расейскай мове рэтрансьлююцца болей чым 20-ю радыёстанцыямі Расеі, Украіны, Беларусі, Эстоніі, Латвіі і Літвы.

Час грынвіцкі

Эўропа

1500 КВ 6000(49М) + СВ 1179(254М) + Спадарожнік
1800 КВ 6200(46М) + 6065(49М) + СВ 1179(254М) + Спадарожнік
2030 КВ 7230(41М) + 6065(49М) + СВ 1179(254М) + Спадарожнік

Частоты:

Europa/Afrika/Mellanostern
(tidsuppgifter avser svensk tid=CET)
Vardagar
1645-1700 Eko KV 6065+6000**+MV 1179
Lordag
1645-1700 Eko KV 6065+6000**+MV 1179
Sondag
1645-1700 Eko KV 6065+6000**+MV 1179
** speciellt rictad mot Ryssland
English
UTC/GMT

Прыём праз спадарожнік. Europe

1715 SAT+SW 1179
1830 SAT+SW 6065+9655+7240+MV 1179
2130 SW 6065+7230+MV 1179
2230 SW 6065+MV 1179
2330 MW 1179

In FM quality on satellite in Europe via Radio Sweden's own channels on ASTRA and TELE-X.
And at 2100 UTC on WRN's English channel:
11.538 GHz (MTV-Europe), audio 7.38 MHz.

Радыё Ватыкан

Менскі час	Праграма	Дыяпазон
05.30	Расейская	5880-ВС/49м, 6185-ВС/49м, 7365-CD/41м
06.00	Украінская	5880-ВС/49м, 6185-ВС/49м
06.20	Беларуская	4015-В/75м, 6185-В/49м
06.40	Літоўская	4015-В/75м, 6185-В/49м
07.00	Латыская	4015-В/75м, 6185-В/49м
09.15	Украінская	9660-С/31м, 11740-С/25м
15.00	Расейская	11740-ВС/25м, 15570-ВС/19м
19.10	Расейская	5880-ВС/49м, 6185-ВС/49м, 7365-CD/41м
19.40	Украінская	5880-ВС/49м, 6185-ВС/49м
20.00	Беларуская	4015-В/75м, 6185-В/49м
20.20	Літоўская	4015-В/75м, 6185-В/49м
20.40	Латыская	4015-В/75м, 6185-В/49м
23.00	Расейская	6065-ВС/49м, 7310-ВС/41м.

Беларуская Рэдакцыя Польскага Радыё

14.30 (панядзелак), 18.30 (нядзеля) Беларускі літаратурны рух у Польшчы — гутарка Алеся Барскага.

16.30 (панядзелак), 14.30 (аўторак) Агляд тыднёвіка "НІВА".

18.30 (панядзелак), 16.30 (нядзеля) Разважаньні пра мову — што думаюць слухачы наконт месца беларускае мовы ў сьвеце і ейнае будучыні.

19.00 (панядзелак), 17.00 (нядзеля) Канцэрт віншаваньняў, дзе кожны слухач зможа перадаць пажаданьні сваім блізкім і знаёмым, каханай і каханаму — усім.

18.30 (аўторак), 14.30 (серада) Эканамічны блёк — бізнэс, банкі, Варшаўская Акцыянэрная Біржа, курсы валютаў, эканамічнае супрацоўніцтва Польшчы і Беларусі.

16.30 (аўторак), 18.30 (пятніца) Хроніка спорту, усякая ўсячына.

16.30 (серада), 14.30 (чацьвер) Культурныя актуальнасьці — тэатральныя прэм'еры, выставы, сустрэчы з польскімі і беларускімі мастакамі, кіно, кнігі.

18.30 (серада) "Пад знакамі Арла і Пагоні" — гістарычная гутарка.

18.30 (чацьвер) Гісторыя беларускае мовы.

18.30 (чацьвер), 14.30 (пятніца) Навуковатэхнічная перадача — досьледы знакамітых навукоўцаў, тэхнічныя "разыначкі", недаступнае. **16.30 (пятніца), 14.30 (субота)** Госьць тыдня. **18.30 (субота), 14.30 (нядзеля)** Гутаркі Сакрата Яновіча "Ад Бібліі да беларускае літаратуры". **16.30, 19.00 (субота)** Рэдакцыйная пошта — адказы на лісты нашых слухачоў. **14.30 (нядзеля)** Рэлігійныя гутаркі айца Ўладзімера Месюка. Усё гэта пераплецена цікаваю музыкай: як клясычнаю, гэтак і лёгкаю.

19.00 (серада) Агляд Czasopisu i Przegl□du Prawos□awnego (кожны трэці тыдзень месяца)

Трансьлююцца:

а 14.30 на кароткіх хвалях 41,18 м і 50,04 м (адпаведныя частоты 7285 і 5995 кГц), а 16.30 на кароткіх хвалях 41,27 м і 49,22 м (а.ч. 7270, 6095 кГц), а 18.30 на кароткіх хвалях 49,22 м (а.ч. 6095 кГц).

ICI PARIS ГАВОРЫЦЬ ПАРЫЖ

Праграмы Міжнароднага Французскага радыё можна слухаць: у Парыжы і ягоных прадмесьцях: з 20 да 21 гадзіны паводле мясцовага часу на частаце 738 кГц. Па ўсім сьвеце: з 16 да 17 гадзіны паводле менскага часу на частотах 11 670 кГц, 15 605 кГц і 15 155 кГц (19 м), з 21 да 22 гадзіны паводле менскага часу на частотах 5 900 кГц (49 м) і 7 350 кГц.

Штодзённа: Навіны, Факты і думкі, Агляд французскіх газэтаў.

Панядзелак: Навука і тэхніка (апошнія дасягненьні й тэхнічныя дасьледаваньні), (з штодзённага жыцьця сярэдняга француза).

Аўторак: Эканамічны кур'ер (бізнэс, фінансы, эканоміка ў Францыі), Жыцьцё ідэяў (філязофія, сацыялёгія, рэлігія ў найноўшых публікацыях).

Серада: Паштовая скрыня (адказы на лісты слухачоў), Мэдыцына (апошнія адкрыцьці й дасьледаваньні на Захадзе), аповеды пра расейскую эміграцыю.

Чацьвер: Літаратурнае скрыжаваньне (французскія пісьменьнікі "ўчора" і "сёньня", Францыя як месца сустрэчы розных літаратураў), Знакамітыя людзі Францыі (гісторыя Францыі ў біяграфіях).

Пятніца: Шпацыр па Францыі (забаўляльнае радыёпадарожжа ў найцікавейшыя куткі краіны), Курс французскае мовы.

Субота: Праграма на замовы (адказы на допісы слухачоў), Кінапанарама (агляд навінаў экрану), Курс французскае мовы (паўтор праграмы).

Нядзеля: Агляд французскіх тыднёвікаў, Культурная панарама (жыцьцё французскіх музэяў і тэатраў), Нядзельны канцэрт.

РАДЫЁ 101,2

Інфармацыйныя перадачы:

7.00 - 8.00 – Раніцні інфармацыйна-музычны канал 08.05 Навіны 08.30 - 8.40 Дайджэст прэсы 8.45 - 8.50 – Бізнэс-агляд 9.00 - 9.05 – Навіны 9.45 - 9.50 – Выпуск курсу валютаў у банках г. Менску, 10.00 - 10.05 Замежныя навіны 11.00 - 11.05 Навіны 12.00 - 12.05 Сусьветныя навіны Бі-Бі-Сі 13.00 - 13.05 Беларускія і замежныя навіны 13.30 - 13.35 – Гарадзкі экспрэс 14.00 - 14.05 – Навіны Беларусі (БЕЛТА, БелаПАН) 15.00 - 15.05 – Навіны 16.00 - 16.05 Замежныя навіны 16.15 - 16.45 – Ліцэнзійныя музычныя праграмы Бі-Бі-Сі 17.00 -17.05 – Навіны 17.30 - 18.00 – Праграма Беларускае службы Польскага радыё 18.00 - 18.05 – Навіны 19.00 - 19.07 – Навіны Расейскай службы "Нямецкай хвалі" 20.00 – Заканчэньне працы

Аўтарскія праграмы:

10.30 - 11.00 – "Мамзэль", праграма для жанчынаў (нядзеля) 11.15 -11.45 – "Бізнэс-актуаліі", аналітычная праграма (серада, пятніца) 11.15 - 12.00 – "NRJ", перадача пра французскую музыку (нядзеля) 12.15 - 12.45 – "Музыка тоўстых", джазавая праграма (аўторак) 12.30 - 12.50 – "Паехалі!", аўта-праграма (чацьвер, субота) 13.15 - 13.40 – "Ad okulus", навіны відэарынку (нядзеля) 14.30 - 15.00 – "T.V. Dance", танцавальная праграма (нядзеля) 15.15 - 15.50 – "Waka-Jawaka", музычная праграма (чацьвер) 15.30 - 15.45 – "ПраРок", музычная перадача (серада) 19.10 - 20.00 – "Незабыўнае", мэлёдыі мінулых гадоў (нядзеля) 19.25 - 19.55 – "Парад зорак", музычная праграма "Нямецкай хвалі" (субота)

BBC Хвалевы расклад расейскае службы BBC

Менскі час

05.30-06.30	М	49	49	41	41	25
	кГц	5875	6010	7030	7320	11845
09.00-09.15	М	41	31	25	25	19
	кГц	7210	9635	1680	11845	15325
11.00-11.15	М	31	25	22	19	16
	кГц	9750	11680	13745	15325	17750
12.50-13.00	М	25	22	19	16	16
	кГц	11805	13745	15325	17695	17750
13.00-13.15	М	25	22	19	16	16
	кГц	11805	13745	15325	17695	17750
15.00-16.00	М	25	22	19	19	16
	кГц	11845	13745	15260	15325	17695
18.00-20.00	М	31	31	25	22	22
	кГц	9635	9825	11845	12040	13745
20.00-21.00	М	41	31	31	25	22
	кГц	7120	9835	9825	11845	12040
21.00-23.30	М	19	31	31	31	25
	кГц	5990	6010	9635	9825	11845

Панядзелак 05.30-06.30 Праграма "Брыфінг". Апошнія паведамленьні. Ангельская ў радыё. 09.00-09.15 Апошнія паведамленьні. 11.00-11.15 Інфармацыйная праграма. 13.00-13.15 Да гэтае гадзіны. 15.00-16.00 Апошнія паведамленьні. Радыёкроніка апошніх падзеяў "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Праграма рок-музыкі. 18.00-19.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Радыёагляд "Уэст-Энд". 19.00-20.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 20.00-21.00 Апошнія паведамленьні. Радыюс. Кароткая зборка навінаў. Музычная студыя. 21.00-22.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Тэматычная перадача. 22.00-23.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 23.00-23.30 Апошнія паведамленьні. Радыёкроніка "Гледзячы зь Лёндану".

Аўторак 05.30-06.30 Праграма "Брыфінг". Апошнія паведамленьні. Ангельская ў радыё. 09.00-09.15 Апошнія паведамленьні. 11.00-11.15 Інфармацыйная праграма. 13.00-13.15 Да гэтае гадзіны. 15.00-16.00 Апошнія паведамленьні. Радыёкроніка "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Радыёагляд "Уэст-Энд". 18.00-19.00 Апошнія паведамленьні "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Тэматычная перадача. 19.00-20.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 20.00-21.00 Апошнія паведамленьні. "Радыюс". Кароткая зборка навінаў. "Паварот Вінта". "Кнігарня" (раз на месяц) 21.00-22.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. "Парадыгма". "Ваша здароўе" (раз на месяц). 22.00-23.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 23.00-23.30 Апошнія паведамленьні. Радыёкроніка "Гледзячы зь Лёндану".

Серада 05.30-06.30 Праграма "Брыфінг". Апошнія паведамленьні. Ангельская ў радыё. 09.00-09.15 Апошнія паведамленьні. 11.00-11.15 Інфармацыйная праграма. 13.00-13.15 Да гэтае гадзіны. 15.00-16.00 Апошнія паведамленьні. Радыёкроніка апошніх падзеяў "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Тэматычная парадача. 18.00-19.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. "Парадыгма". "Ваша здароўе" (раз на месяц) 19.00-20.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 20.00-21.00 Апошнія паведамленьні. "Радыюс". Кароткая зборка навінаў. Джаз. 21.00-22.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Радыёчасопіс пра жыцьцё ў Вялікабрытаніі. 22.00-23.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 23.00-23.30 Апошнія паведамленьні. Радыёкроніка "Гледзячы зь Лёндану".

Чацьвер 05.30-06.30 Праграма "Брыфінг". Апошнія паведамленьні. Ангельская ў радыё. 09.00-09.15 Апошнія паведамленьні. 11.00-11.15 Інфармацыйная праграма. 13.00-13.15 Да гэтае гадзіны. 15.00-16.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. "Парадыгма". "Ваша здароўе" (раз на месяц). 18.00-19.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Радыёчасопіс пра жыцьцё ў Вялікабрытаніі. 19.00-20.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 20.00-21.00 Апошнія паведамленьні. "Радыюс". Кароткая зборка навінаў. Тэматычная перадача. 21.00-22.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. "Сёньня ў фокусе". 22.00-23.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 23.00-23.30 Апошнія паведамленьні. Радыёкроніка "Гледзячы зь Лёндану".

Пятніца 05.30-06.30 Праграма "Брыфінг". Апошнія паведамленьні. Ангельская ў радыё. 09.00-09.15 Апошнія паведамленьні. 11.00-11.15 Інфармацыйная праграма. 13.00-13.15 Да гэтае гадзіны. 15.00-16.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Радыёчасопіс пра жыцьцё ў Вялікабрытаніі. 18.00-19.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. "Сёньня ў фокусе". 19.00-20.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 20.00-21.00 Апошнія паведамленьні. "Радыюс". Кароткая зборка навінаў. Музычная студыя. 21.00-22.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. "Паварот Вінта". "Кнігарня" (раз на месяц). 22.00-23.00 Апошнія паведамленьні. Радыёгазэта "Аргумэнт". Ангельская ў радыё. 23.00-23.30 Апошнія паведамленьні. Праграма рок-музыкі.

Субота 05.30-06.30 Праграма "Брыфінг". Апошнія паведамленьні. Ангельская ў радыё. 09.00-09.15 Апошнія паведамленьні. 11.00-11.15 Інфармацыйная праграма. 13.00-13.15 Да гэтае гадзіны. 15.00-16.00 Апошнія паведамленьні. Радыёкроніка апошніх падзеяў "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. "Сёньня ў фокусе". 18.00-19.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. "Паварот Вінта". "Кнігарня" (раз на месяц). 19.00-20.00 Апошнія паведамленьні. "Уік-Энд". 20.00-21.00 Апошнія паведамленьні. Тыднёвік "Радыюс". Кароткая зборка навінаў. Праграма рок-музыкі. 21.00-22.00 Апошнія паведамленьні. "Гле- дзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Радыёчасопіс "Уваскрашэньне". 22.00-23.00 Апошнія паведамленьні. "Севазварот". 23.00-23.30 Апошнія паведамленьні. Джаз.

Нядзеля 05.30-06.30 Праграма "Брыфінг". Апошнія паведамленьні. Ангельская ў радыё. 12.30-13.00 Радыёчасопіс "Уваскрашэньне". 09.00-09.15 Апошнія паведамленьні. 11.00-11.15 Інфармацыйная праграма. 13.00-13.15 Да гэтае гадзіны. 15.00-16.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. "Паварот Вінта". "Кнігарня" (раз на месяц). 18.00-19.00 Апошнія паведамленьні. Радыёкроніка апошніх падзеяў "Гледзячы зь Лёндану". Радыёчасопіс "Уваскрашэньне". 19.00-20.00 Апошнія паведамленьні. "Севазварот". 20.00-21.00 Апошнія паведамленьні. "Уік-Энд". 21.00-22.00 Апошнія паведамленьні. "Гледзячы зь Лёндану". Кароткая зборка навінаў. Радыёагляд "Уэст-Энд". 22.00-23.00 Апошнія паведамленьні. Тыднёвік "Радыюс" Джаз. 23.00-23.30 Апошнія паведамленьні. Музычная студыя.

МОЎНЫЯ ЗНОСІНЫ Й СУМЯШЧАЛЬНАСЬЦЬ

Азнаёмцеся з характарыстыкамі людзей, якія адрозьніваюцца манераю размаўляць. Псыхолягі вылучаюць сем такіх характарыстыкаў (тыпаў). Вызначце свой (жонкі ці мужа) тып маўленьня.

Тып 1. Гаворыць ціха, без эмацыйнай выразнасьці. Тэмп мовы крыху зьніжаны. Рэдка бывае ініцыятарам гутаркі. Пэсыміст у меркаваньнях.

Тып 2. Гаворыць ціха, з эмацыйным ажыўленьнем і доляй какецтва. Настойлівы ў сьцьвярджэньнях свайго гледзішча і схільны мець яго на кожны выпадак. Калі-нікалі ў коле блізкіх людзей "павышае голас". Цягнецца да крытычнага зьместу размовы.

Тып 3. Гаворыць гучна, эмацыйна, бяз выяўленай тэатральнасьці. Тэмп маўленьня памяркоўны. У размове ўважлівы й чульлівы. Справядлівы й аб'ектыўны ў меркаваньнях. Ня любіць пустых размоваў.

Тып 4. Гаворыць хутчэй ціха. Не саромеецца й актыўна ідзе на кантакт. Пачцівы, уважлівы і саступальны. Эмацыйнае тло размовы станоўчае. Тэмп мовы памяркоўны.

Тып 5. Гаворыць ціха. Тэмп маўленьня зьніжаны, словы не акцэнтуюцца. Не пазьбягае размоваў, але часьцей бывае пасіўным слухачом, рэдка адстойвае свой пункт гледжаньня. Ня схільны раздражняцца й сыходзіць у сябе.

Тып 6. Болей любіць казаць, чым слухаць. Мова тэатральная, мяняецца ад шэпту да крыку, суправаджаецца багатай мімікай. Некаторыя словы й фразы акцэнтуюцца.

Тып 7. Гаворыць павольна, разьмерана, упэўненым тонам, акцэнтуючы некаторыя словы, са стрыманай тэатральнасьцю.

Усё гэта адпавядае наступным рысам характару:

Тып 1. Крыўдлівы, малаактыўны, уразьлівы. Працаздольнасьць зьніжаная. Чульлівы, сарамлівы, спачувальны. Добра падначальваецца. Акуратны й выканальны працаўнік, схільны да "самакапаньня" й самаабвінавачваньня. Надзейны й верны сябра. Уважлівы сужэнец і бацька (сужэнка й маці). Кепскі "здабытчык". У сяброўстве сумяшчальны з тыпамі 1, 4, 6, 7. У сямейным жыцьці жанчына гэтага тыпу сумяшчальная з тыпам 2, 3, 4, а ў мужчыны праблемы з усімі тыпамі жанчынаў.

Тып 2. Крыўдлівы, агрэсіўны, капрызьлівы, эгаіст. Падкрэсьлена акуратны. Мае завышаныя патрабаваньні да сябе й навакольных. Цяжка пагаджаецца й саступае. Мае добрую інтуіцыю. Памяркоўна працаздольны. Дробязны й звадны. Любіць абмяркоўваць і пляткарыць. Зь першага знаёмства падкупляе абыходлівасьцю, але паступова становіцца цынічным і грубым. Мужчыны гэтага тыпу цалкам несумяшчальныя з тыпамі жанчынаў 1, 3 і 4. Жанчыны больш сумяшчальныя ў сямейным жыцьці з тыпамі мужчынаў 3, 4, у меншай ступені — з тыпамі 6, 7.

Тып 3. Грунтоўны й надзейны ў працы, адпачынку, сямейным жыцьці й сяброўстве. Кантактны, разумны, самастойны, працалюбны, ініцыятыўны, спраўны. Уважлівы муж і бацька. Клапатлівая маці й жонка. Мужчына — добры "здабытчык". Сумяшчальны з усімі тыпамі жанчынаў, найбольшая сумяшчальнасьць з жанчынамі тыпаў 2, 6. Жанчыны гэтага тыпу добра сумяшчальныя ў сямейным жыцьці з мужчынамі тыпаў 2, 3, 4 і 7, найбольш сумяшчальныя з тыпам 6. У сяброўстве сумяшчальныя з кожным тыпам — як мужчыны, гэтак і жанчыны.

Тып 4. Спажывец. Паводзіны найперш вызначаюцца жаданьнямі, а не абавязкам. Няздольны быць лідарам у сям'і й на працы. Добры выканаўца чужой волі, калі яна накіраваная на задавальненьне ягоных патрэбаў. Выканальны, працаздольны, безыніцыятыўны. Крыху прымітыўны ў гутарцы. Лёгка паддаецца іншаму ўплыву. Жанчына — добрая маці й клапатлівая жонка. Мужчына — пасрэдны муж. Сумяшчыльны ў калектыве з усімі тыпамі. Сямейным жыцьцём часта незадаволены, бо няздольны й не імкнецца выконваць сацыяльную ролю сужэнца-лідара й не адчувае ў гэтым патрэбы. Мужчыны сумяшчальныя ў сям'і з жанчынамі тыпаў 1, 3, 4. Жанчыны маюць шырокую сумяшчальнасьць.

Тып 5. Сумны ў размовах. Актыўнасьць зьніжана. Надзейны спадарожнік ў жыцьці. Працаздольны, уважлівы, нясьпешны. Сумяшчальнасьць з тыпамі 2, 6.

Тып 6. Эгаіст. Агрэсіўны. Лёгка паддаецца на правакацыю. Любіць спрачацца. Заўсёды стаіць на сваім. Ня любіць і ня можа падначальвацца, з кіраўніцтвам заўсёды мае нацягнутыя адносіны. Моцна арыентаваны на лідарства, адчувае ўнутраны камфорт толькі ў ролі кіраўніка. У іншай ролі актыўна імкнецца стварыць групоўку і стаць ейным нефармальным лідарам. Мае добрую інтуіцыю. Суб'ектыўны ў меркаваньнях. Актыўна імкнецца арганізаваць сваё жыцьцё й жыцьцё блізкіх паводле свайго, часта суб'ектыўнага й далёка не найлепшага, з улікам рэальных абставінаў, пляну.

Гэты тып цалкам несумяшчальны ў сямейным жыцьці з да сябе падобнымі. Жанчыны сумяшчальныя з мужчынамі тыпаў 3 і 4, пры гэтым шлюб з мужчынам тыпу 4 прыносіць вялікую сацыяльную незадаволенасьць, небясьпечны абгрунтаваным пачуцьцём рэўнасьці. Мужчыны гэтага тыпу сумяшчальныя з жанчынамі тыпаў 1, 2, 3 і 4. Любіць усё сваё, уключна з домам і дзецьмі. Унутры сям'і можа быць грубым, але грудзьмі абараняе яе ад вонкавага атачэньня. Таксама ў калектыве можа плесьці інтрыгі, але актыўна абараняе й адстойвае яго ад вонкавага атачэньня. Любіць справы, якія патрабуюць ініцыятывы, самастойнасьці й рашучасьці. Неэканомны характар. Пераважна абыякава ставіцца да свайго здароўя.

Тып 7. Надзелены несьвядома маскаванай агрэсіўнасьцю, зацятасьцю, падазронасьцю. Цяжкадум, працаздольны, калі ня трэба пераключаць увагу. Падладкоўваецца да абставінаў, мяняючы іх, а не сябе й свае паводзіны. Устойлівы ў сваіх звычках і зь цяжкасьцю адмаўляецца ад іх. Настойлівы, дзеля дасягненьня мэты выкарыстоўвае ўсе сродкі, ні перад чым не спыняецца. Наравісты муж, суровы бацька, "халодная" жонка, патрабавальная маці. Сумяшчальнасьць у сямейным жыцьці з усімі тыпамі, акрамя 6.

У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 – 9):

Кошты на менскіх рынках: Камароўка (ІНФАРМАТАР №1, 7); Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФАРМАТАР №2, 8); Аўтарынак (ІНФАРМАТАР №3); Кошты на кампакт-дыскі (ІНФАРМАТАР №4); Кошты на кватэры ў Менску (ІНФАРМАТАР №5); Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФАРМАТАР №6); Кошты на кампутары. Менск (ІНФАРМАТАР №9).

Транспарт: Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФАРМАТАР №1); Расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФАРМАТАР №2); Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФАРМАТАР №3); Расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФАРМАТАР №5).

Адукацыя: Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФАРМАТАР №1); Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФАРМАТАР №2); Дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФАРМАТАР №3-4); ВНУ. Акадэміі (ІНФАРМАТАР №8-9).

Біржа працы: Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФАРМАТАР №1- 9).

Адпачынак: Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФАРМАТАР № 1-9); Тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФАРМАТАР №1- 9).

Спажывец: Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краінаў блізкага і далёкага замежжа (ІНФАРМАТАР №2); Твае правы, пасажыр (ІНФАРМАТАР №2); Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спэцыяльнае маркаваньне (ІНФАРМАТАР №3); Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФАРМАТАР №4); Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФАРМАТАР №5); Пра новыя даляры. Праўда пра цыгарэты. Штрыхавы код — як яго расшыфраваць (ІНФАРМАТАР №6); Як выбіраць абутак (ІНФАРМАТАР №7).

Здароўе: Перш чым зьвяртацца да лекара. Як кінуць паліць. (ІНФАРМАТАР №4).

Гаспадарка: Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлікі на вопратцы. (ІНФАРМАТАР №5); ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФАРМАТАР №6); Як мыць і чысьціць посуд. Калі заліла кватэру... (ІНФАРМАТАР №8); Як пабудаваць садовы домок. Дом і дзялянка (ІНФАРМАТАР №9).

Грамафон: Старонка вершаванага радка (ІНФАРМАТАР №6, 8).

Харчаваньне: Якую гарбату мы п'ем. Пра часнык (ІНФАРМАТАР №7).

Спорт: Вынікі спаборніцтваў і інш. (ІНФАРМАТАР №7, 9).

Бібліятэка: Новыя паступленьні ў кнігарні. Рэцэнзіі (ІНФАРМАТАР №9).

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ:

Рынак: Новыя кошты на розныя тавары.

Адукацыя: Адукацыя ў Беларусі (працяг). Пасьлядыплёмнае навучаньне ў ЗША.

Спажывец: Пазначэньні на электрапрыборах.

Спорт: Вынікі спаборніцтваў і інш.

Гаспадарка: Карысныя гаспадарчыя парады.

Грамафон: Новыя твары нашых чытачоў.

Адвакат: Міжнародныя нормы правоў чалавека.



— Ты зноў карысталася маім ласьёнам ад аблысенія?

ПРЭФЭРАНС

ЗАНЯТАК 10

(Працяг. Пачатак у N 9)



Возьмем іншы прыклад. Гулец У прызначыў "сем жалудоў". Гульцы Пн і Пд віставалі. У выніку разгульваньня гулец У ўзяў восем, гулец Пн дзьве, гулец Пд ніводнае біткі. Запісы будуць: У — 4 балы ў кулю, Пн — 8 балаў у вісты на гульца У (дзьве біткі па чатыры балы за бітку), Пд ніякіх запісаў ня робіць.



У тых выпадках, калі віставальнікі "сыходзяць" на шасьцёрнай ці сямёрнай, калі Вы памятаеце, прызнаецца без разгульваньня, што прызначальнік гульні ўзяў абвешчанае, а той, хто сышоў — дзьве біткі пры шасьцёрнай, адну пры сямёрнай. Напрыклад, гулец Пн абвясьціў "сем вінаў". Гулец Пд "сышоў за адну". Запісваюць: Пн — 4 у кулю, Пд — 4 вісты (адна бітка) на гульца Пн.



Цяпер разгледзім тыя выпадкі, калі той, хто гуляе, не бярэ абвешчанага. Дапусьцім, гулец Пн абвясьціў "шэсьць вінаў". Як Вы памятаеце, такое абвяшчэньне лічыцца аўтаматычна завіставаным. У выніку разгульваньня гулец Пн узяў чатыры біткі. Гулец У — адну, гулец З — пяць. Значыць, прызначэнец гульні недабраў дзьве біткі. У гару ён (гулец Пн) піша 2 х 2 = 4 балы. Астатнія гульцы незалежна ад таго, віставалі яны ці не, пішуць дадаткова на "таго, хто сеў" штрафныя балы за "няўзяцьце" — колькасьць недабраных гульцом бітак, памножаную на кошт гульні. Такім чынам, гулец У запіша 1 х 2 = 2 — за адну ўзятую бітку, плюс 2 х 2 = 4 — за дзьве "недабраныя" гульцом Пн. Агулам у вісты на гульца Пн ён запіша 2 + 4 = 6 балаў. Звычайна для простасьці гульцы дадаюць да ўзятых бітак недабранае абвяшчальнікам гульні і вынік памнажаюць на кошт гульні. Напрыклад, гулец З лічыць:

5 (узята бітак) + 2 (недабрана Пн) = 7

7 х 2 = 14

У віставы запіс на Пн ён запіша 14 балаў. Той, хто сядзіць на прыкупе, — у нашым выпадку Пд — ня ўзяў ніводнае біткі (што й ня дзіўна), але піша 2 х 2 = 4 балы на Пн за "няўзяцьце". Такім чынам, запіс пасьля гэтай гульні будзе:



Іншы прыклад: Гулец Пд абвясьціў "дзевяць чырваў". Гульцы У і З абвясьцілі "віст". У выніку разгульваньня гулец Пд узяў сем бітак, гулец З — тры. Запісы будуць наступныя: гулец Пд за няўзяцьце дзьвюх бітак — 2 х 8 = 16 у гару. Гулец З (3 + 2) х 8 = 40 вістаў на гульца Пд за тры біткі й "няўзяцьце". Гулец У 2 х 8 = 16 вістаў на гульца Пд за "няўзяцьце". Запіс будзе мець выгляд:

Працяг у наступным нумары

ШАХМАТЫ



4п. Чорныя пачынаюць і ставяць мат за 2 хады.



4п. Чорныя пачынаюць і перамагаюць.

2п. Белыя перамагаюць.

5п. Белыя перамагаюць.

3п. Чорныя пачынаюць і перамагаюць.



6п. Белыя перамагаюць.

Адказы ў наступным нумары

АДКАЗЫ НА ПАПЯРЭДНІЯ ЗАДАНЬНІ

Шахматы

Тлумачэньні:

Кароль — **Кр**;
Гетман (Фэрзь) — **Г**;
Вежа (Тура) — **Вж**;
Вышнік (Слон) — **В**;
Конь — **К**.

1п. 1. Г:h6+!! Кр:h6 2. Вж:d6+ Г:d6 3. Kf5+.

2п. 1. Вжс8+! Вж:с8 2. Го7+!! Кр:а7 3. bcK+!, і белыя перамагаюць.

3п. 1. Вжg4+! fg 2. Гg5+ Крh8 3. Гh6! Чорныя здаліся.

4п. 1. Kh6+ Крh8 2. Г:е5! Г:е5 3. К:f7+! Чорныя здаліся.

5п. 1. Ке6! Kf6 2. Г:f8+! Вж:f8 3. Kh6X.

6п. 1. В:f7!! Вж:f7 2. Kce5 Kc6 3. Вж:с6 bc 4. Kg5 Be7 5. Ke:f7 Крf8 6. e5 Kd5 7. Гf3 Крg8 8. Вж:d5! Вg4 9. Ге4 В:g5 10. К:g5 Гh5 11. Вжd4. Чорныя здаліся.

Забаўкі

1. 76 **2.** 3. **3.** 89

ЗАБАЎКІ

Задача 1

Устаўце фігуру, якой не стае



Задача 2

Падстаўце літары, якіх бракуе

Г Й Й ?
Е Ж Н ?

Задача 3

HOLY адносіцца да **SLOB**, як **LOW** адносіцца да **?**
ONE GLOW OLD BOW SOW

Адказы ў наступным нумары

Працяг са стар. 4

кітайцы пасьпяхова падрабляюць даляры ЗША. Летась у самім Кітаі было сканфіскавана фальшывых купюраў амаль на 13 млн. даляраў. Спэцыялісты зьдзіўляюцца высокаму тэхнічнаму ўзроўню падробак. Дарэчы, кітайцы падрабляюць ня толькі грошы. Карыстаючыся вялікай любоўю амэрыканцаў да дыназаўраў, яны выраблюць яйкі вымерлых пачвараў і прапануюць іх амэрыканскім турыстам. Амэрыканцы плоцяць за гліняныя «яйкі» шалёныя грошы.

АМЭРЫКАНСКАЕ СЬМЕЦЬЦЕ. Як бы ў помсту кітайцам за падробкі ды музычна-кампутарнае пірацтва амэрыканцы пачалі завальваць Кітай рознага роду сьмецьцем. На мінулым тыдні побач з Пэкінам было выяўлена блізу 650 тонаў мэдычных адыходаў. Старыя пластыкавыя пакеты, пустыя бутэлькі, выкарыстаныя мэдыцынскія шпрыцы, парваныя гумовыя пальчаткі ды невядомы белы парашок. Як высьветлілася, гэты «падарунак» быў завезены з Каліфорніі. Паводле апошніх зьвестак, толькі з 1990 г. з ЗША ў Кітай было перапраўлена ды закапана больш за 127 тонаў рознага заморскага сьмецьця.

ЧЫП У ГРУДЗІ. У Вялікабрытаніі вырашылі зашываць кампутарныя чыпы проста ў грудзі. Тысячы жанчынаў па ўсёй краіне, імкнучыся прыпадобніцца тэлевізійным сэкс-бомбам, нарошчваюць грудзі, імплянтуючы сыліконавыя пракладкі. Праблема толькі ў тым, што іх трэба мяняць кожныя 10-15 гадоў. А для гэтага трэба запісваць, калі, як, дзе й хто іх устаўляў. Мэдычныя карткі часта губляюцца, а пацыенткі проста забываюцца своечасова зьвярнуцца да лекара. Таму вырашылі зашываць «мэдычныя карткі» проста ў грудзі разам з сыліконавымі пракладкамі.

АТРУТЧЫКІ-АМАТАРЫ. У амэрыканскім горадзе Сан-Бэрнардына былі арыштаваныя дзьве шасьцікляcьніцы. Як паведамляе агенцтва Reuter, яны абвінавачваюцца ў спробе атруціць сваю школьную настаўніцу. Стаміўшыся ад пастаянных спагнаньняў за сваю слабую вучобу, дзяўчынкі падсыпалі арсэніку ў кубак, зь ягога на працягу ўроку настаўніца звычайна піла ліманад. Забойства не атрымалася толькі таму, што адзін хлопчык, даведаўшыся пра замах, пасьпеў папярэдзіць настаўніцу, якая выклікала паліцыю. У якасьці саўдзельнікаў былі затрыманыя й два аднаклясьнікі, што схавалі скрынку з-пад атруты.

АТРУТЧЫКІ-ПРАФЭСІЯНАЛЫ. У г.Чалябінску, што ў Расеі, была затрыманая група злачынцаў, якая займалася вырабам ды продажам цыяністага калію, выбуханкі ды наркотыкаў. Як паведамляе газэта «Известия», у складзе групы быў адзін зь нядаўніх выпускнікоў Чалябінскага ўнівэрсытэту, вядомы як вялікі аматар розных хімічных экспэрымэнтаў. Вытворчасьцю яду ён вырашыў заняцца пасьля таго, як адзін знаёмец прапанаваў яму вырабіць партыю цыяніду. На працягу вечароў спэц «захімічыў» болей за 200 ампулаў па 500 міліграмаў цыяністага калію. Гэтага было б дастаткова для забойства 400 чалавек. Тавар ён зьбіраўся прадаць за 1800 даляраў. Пры вобыску ў падпольнай лябараторыі апроч атруты знайшлі выбуховыя рэчывы для вырабу дэтанатараў, кампанэнты для вытворчасьці хуткіх ядаў, выбуханкі ды наркотыкаў.

ТУТ ВАМ НЕ ПЕРАМОЎНЫ ПУНКТ. Дасягненьні тэхнікі ды агульны высокі ўзровень жыцьця дазваляе простаму студэнту Кембрыдзкага ўнівэрсытэту мець ўласны сотавы тэлефон. Зь імі студэнтаў можна ўбачыць паўсюдна. У тым ліку ва ўнівэрсытэцкай бібліятэцы. Але пастаяннае трымценьне тэлефонных сыгналаў ды перамовы дзясяткаў чалавек стварылі задужа шумную для храму кнігі атмасфэру. Чытальная заля пачала нагадваць грамадзкі пункт для тэлефонных перамоваў. Тыя студэнты, якія прыходзілі сюды, каб спакойна пазаймацца, пачалі скардзіцца на немагчымасьць плённай вучобы. Таму ўнівэрсытэцкае начальства забаранiла карыстацца пераноснымі тэлефонамі ў бібліятэцы. Студэнты павінныя выключаць іх пры ўваходзе.

Мода

«7+»

У Віленскім тэатры опэры й балету адбыўся чарговы, пяты паказ мадэляў групы «7+», якая аб'ядноўвае маладых мадэльераў Вільні й тых, што да іх далучыліся сёлета з Коўна і Клайпеды. Гэты традыцыйны агляд маладое моды прайшоў пад патранажам газэты «Diena».

Першы дзень паказу распачаў са сваёй новай калекцыяй «Вітамін С» літоўскі мэтар моды Ёзас Статкявічус. Найлепшыя балтыйскія мадэлькі Рэната й Меда разыгралі кароткую й красамоўную мізансцэну, а пасьля быў роўны й рэспэктабэльны працяг у духу нэаклясычных алегорыяў. Калекцыю закончыла белая вясельная сукня, якую дэманстравала Раса Кукенітэ, «Міс Літва-92». Дарэчы, і летась калекцыя Статкявічуса была завершана вясельнаю сукняй, праўда, нашмат больш шыкоўнай, аздобленай страўсавым пер'ем.

Пасьля была нізка калекцыяў самых маладых. Найбольшае ўражаньне пакінула Юратэ Прулітэ з Коўна. Яе калекцыя ўяўляе сабою фэерыю бязважкага ядвабу, зьверху да нізу расьпісанага кабалістычнымі арнамэнтамі. Трэба заўважыць, што сёлета вялікую ўвагу мадэльеры надалі музычнаму суправаджэньню выхадаў: ад тэхна да «Шчаўкунка» Чайкоўскага.

Другі дзень пачаўся з калекцыяў салёну «Дэкаданс» Далі Кярнагене й Віліі Тубайтэ-Маршалік, агульны стрыжань якіх — элегантнасьць, шарм рэспэкту, адзежа для тых, хто хоча выглядаць як, напрыклад, Дэнёв.

Салён JU-TE, прадстаўлены быў калекцыяй Юратэ Куртінене. У праспэкце яна прадстаўлена ляканічна — неагрэсіўная.

Найбольш «прасунутай» выглядала калекцыя Ліны Маркунене — надзвычай высакароднае спалучэньне чырвонага й белага зь лёгкім налётам эратычнага рамантызму, выдатна прадэманстраванае мадэлькаю Ялантай Размене.

Другі дзень скончыўся трыюмфам тандэму Юліі Жыленене й Сэржа Ганджумяна. Бясспрэчнае іхнае лідарства было забясьпечанае найперш камэрцыйна апрабаванымі мадэлямі ў духу «стрыманага ўрбанізму», дзе відавочны люксусовы элемент заважаны даступнымі матэрыяламі й ляканізмам абрысаў. Не ў малой ступені посьпеху садзейнічалі й мадэлькі (толькі прафэсійныя), і поўнае супадзеньне з музычным рытмам.

Сэрж Ганджумян — наш добры знаёмец, сябра рэдакцыі «НН». Чатыры гады таму ён эміграваў у Літву з Карабаху, пасьля скончыў (напалову экстэрнам) Віленскую Акадэмію Мастацтваў з найвышэйшым (!) балам сярод сакурсьнікаў. Пазалетась Сэрж ужо перамог у конкурсе «7+», на той раз шчодра спансаваным Coca-Cola'й, мэнэджэры якой прысутнічалі на паказе й набылі некалькі рэчаў Ганджумяна. З тых часоў Сэрж працуе разам зь Юляй, у іх свая, добра вядомая фірма, поўная загрузка індывідуальнымі замовамі.

У апошні дзень дэманстрацыі пачаліся з гумарэскі Юргіты Бружайтэ, якая летась адзеньнем распавядала пра харватаў. Сёлета яна прадэманстравала сваё ўяўленьне пра літоўскіх «дзецюкоў».

На зьмену спэцыфічнаму гумару прыйшла спэцыфічная эротыка.

Калекцыя Рыты Казюкайтэ маланкаю аголеных грудзей апякла стомленых гледачоў. Хоць відовішча й прыцягнула здаровую ўвагу здаровай часткі гледачоў, аднак уражаньня пра дызайн адзежы не пакінула.

Салён «Vija» Юраты Шлікавене ізноў ўзьняў дыялёг на высокую ноту камэрцыйнае, спраўджанае моды. І вядома, — Сандра Страўкайтэ. Алюзіі на кітайшчыну й тэктанічны авангард Татліна былі ўмела агучаныя саўндтрэкам да «Дванаццаці крэслаў» — савецкага кінашэдэўру.

Для паказу Сандры была задзейнічаная вялікая група дэманстрантаў (і прафэсіяналаў і аматараў). Складаны кантэкст шоў, дзе «савецкасьць» прасякаецца каталёнскай пякучай містыкай і кітайскаю разважлівасьцю, так захапіў ўдзельнікаў, што яны йгралі з поўнаю самаадданчай. Дадам, што на наступны дзень Сандра Страўкайтэ адляцела з пэрсанальным шоў у Маскву.

Калекцыя Аляксандра Пагрэбнага і Віды Сіманавічутэ завершыла Тыдзень Моды. 60 мадэляў у чатырох частках! Дакладна падабраныя мадэлькі, дакладна крочучы пад ненавязьлівы рытм салённага лёгкага джазу, прадэманстравалі клясычны дызайн... і дэманстрацыю. Аглядальнікі хорам прадбачаць камэрцыйны посьпех гэтае пары.

Сяргей Харэўскі

P.S. Указам прэзыдэнта краіны Бразаўскаса за асаблівыя заслугі перад Літвою і ўклад у разьвіцьцё культуры Сэрж Ганджумян атрымаў права на літоўскае грамадзянства.

Сэрж Ганджумян з мадэлькамі. Фота Дзяніса Раманюка

КАЛЯНДАР

ЧАС НЯМІРЫЧА

Сёлета спаўняецца 380 гадоў з моманту найфантастычнага «подзьвігу» ў гісторыі шляхты Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. У 1616 годзе ў Львове славуты сярод месьцічаў праз сваё разгульнае жыцьцё й бязьмерную адвагу ў баёх за Айчыну шляхціц Самойла Нямірыч пасярод белага дня на Ратушным пляцы згвалтаваў маладзенькую разносчыцу аладкаў, пры гэтым адбіваючыся шабляй ад ДВАНАЦЦАЦІ жаўнераў, што кінуліся бараніць дзяўчыну.

У гэтай гісторыі ўражвае не цынізм Нямірыча і нават ня колькасьць абаронцаў, ад якіх ён здолеў адбіцца падчас злачынства. Усё гэта, безумоўна, вартае занясеньня ў кнігу рэкордаў Гінэса. Але сам факт стварэньня й культываваньня гэтай і іншых падобных легендаў аб Самойле Нямірычы вымагае пільнай увагі да сябе. Ён становіцца больш зразумелы, калі прыгадаць, што Львоў быў збудаваны ў 1254 годзе адмыслова як шлюбны падарунак князю Льву ад свайго бацькі князя Данілы Галіцкага: горад заможных радавітых піякаў і ваяроў. Горад шляхты.

Бадай, на сёньняшні дзень постаць Самойлы Нямірыча — найбольш поўнае ўвасабленьне вобразу сярэдневечнага паспалітага шляхціца. Гэты вобраз — парадаксальнае спалучэньне адданага служэньня Бацькаўшчыне і даведзенага да ўзроўню культу ігнараваньня грамадзкіх законаў. Ён яшчэ раз падкрэсьлівае тэзу аб тым, што Рэч Паспалітая загінула праз свой занадта прагрэсіўны для таго часу дзяржаўны лад, які дазваляў разгарнуцца шляхецкаму індывідуалізму, і як вынік — прававому нігілізму, на поўную моц. Гэтае парадаксальнае спалучэньне — наша гістарычная спадчына, якая лучыць беларускае Адраджэньне з польскім і часткова ўкраінскім.

Не адмаўляючы таго, што няма беларусам бліжэйшага паводле мовы й гістарычнага лёсу народу чым украінцы, трэба зазначыць, што ўкраінскі нацыянальны міт, украінскі гераічны эпас базуюцца на гісторыі казацтва, у той час як мы спрабуем стварыць свой на супрацьлеглым: не было для казака большага ворага чым польскае й НАША шляхецкае войска. У гэтым кантэксьце Галічына знаходзіцца ў вельмі адмысловым становішчы. З аднога боку, цяжка знайсьці больш шчырых абаронцаў Украіны, чым галічаны, з другога, яны маюць антыказацкую шляхецкую гістарычную памяць. (Рэестравае казацтва, да якога спрычыніліся львавяны, — від шляхты, паколькі першапачатковы сэнс слова «казак» супярэчыць якім-кольвек рэестрам.) Галіччына — гэта мост, які лучыць дзьве гістарычныя памяці нашых народаў — «шляхецкую» й «простую».

Для любога сёньняшняга маладога беларускага нацыяналіста Львоў — найбліжшы сымбаль змаганьня за незалежнасьць, гэтак як для кубанскага казака Запарожжа — больш за Маскву ці Ноўгарад. На момант акупацыі Расейскай Імпэрыяй Рэчы Паспалітай тэрыторыя сучаснай Беларусі мела насельніцтва, якое на адну пятую складалася з шляхты. Прыблізна столькі ж сёньня выступае за незалежнасьць краіны. Астатнія больш падобныя да тых магілёўскіх месьцічаў, якія на пачатку Маскоўскай вайны (1654-1667) з радасьцю расчынілі гарадзкую браму перад маскоўскім войскам, а пасьля, пратрываўшы дзесяць гадоў, дашчэнту выразалі ўвесь гарнізон.

Самойла Нямірыч застаўся ў народнай памяці як станоўчая асоба. У якасьці пакараньня за свой жахлівы ўчынак ён правёў колькі гадоў у затачэньні ў вежы, а пасьля ахвяраваў сваю маёмасьць на карысьць простых львавянаў і пастрыгся ў манахі. Сёньняшняя Галічына непераможная празь людзей, падобных на Нямірыча. Поўна, 380 гадоў таму ён адчуў, што мусіць прынесьці ў ахвяру сваю душу, пайсьці на цяжкі грэх, бо гэта была ТАЯ дзяўчына. Празь ЯЕ прадоўжыўся моцны духам род Самойлы Нямірыча. У гэтым ён падобны да галоўнага героя ўкраінскай нацыянальнай гісторыі гвалтаўніка Рагнеды Ўладзімера Хрысьціцеля. Беларускія нацыянальныя героі ня маюць такога досьведу. І гэта добра. Праблема ня ў гэтым. Праблема ў шляхетнасьці шляхціцаў. Яны так і не навучыліся змагацца супраць дзікуноў: немагчыма ісьці з рапірай супраць каменнай доўбні.

Галоўны адмоўны бок сьведамасьці нашых продкаў-шляхціцаў — ўнутраную разасобленасьць — мы ўжо выявілі дастаткова. Цяпер мусім выявіць станоўчую — еднасьць перад агульным ворагам. Як старажытныя грэкі, якія падчас уварваньня войскаў з усходу, нягледзячы на сваю малалікасьць, «закатвалі рукавы» й спакойна перамагалі. А абыякавым да свайго лёсу беларусам хочацца пажадаць аднаго: калі вы ўжо паўтараеце прыклад магілёўскіх месьцічаў часоў Маскоўскай вайны, не чакайце, як яны, цэлых дзесяць гадоў.

Час ідзе.

Севярын Квяткоўскі

НАША НІВА 27 траўня 1996 № 11(49)

Першая беларуская гісторыя мастацтваў

Працяг. Пачатак на стар.3

Вацлаў Арэшка

НАЖНІЦАМІ ПА МАСТАЦТВАХ

Адразу ж зьдзіўляе структура дапаможніка. Чаму беларускае мастацтва ўзьнікае толькі недзе за мастацтвам Адраджэньня і дзеля чаго паміж мастацтвам Сярэднявечча і Адраджэньнем устаўлена яшчэ і асобнае «старажытнарускае мастацтва», а затым паміж «заходняй Эўропай XVIII ст.» і «мастацтвам Беларусі XVIII ст.» – «мастацтва Расеі XVIII ст.». Хіба ў сьвеце акрамя агульнасусьветнага існуе яшчэ й нейкае асаблівае «рускае мастацтва»? Ці для нашай мастацкай традыцыі творы, скажам, Вішнякова ды Аргунова маюць некаторы адметны, таямнічы сэнс?

Атрымваецца, што для нас павінна існаваць як быццам тры асноўныя плыні – расейскае, беларускае і замежнае мастацтва. Гэтак пытаньне кампазыцыі пераходзіць у пытаньне канцэпцыі.

Наступнае пытаньне – мова. Зразумела, нельга чакаць ад «дапушчанага Міністэрствам адукацыі і навукі» выданьня нармальнай беларушчыны. Але «вароты багіні Іштар», «абарончая аснашчанасць», «кутныя вежы» і шмат яшчэ чаго выкрывае падрадкоўны пераклад з расейскае.

Праглядаю разьдзелы, прысьвечаныя Беларусі. «... Вялікае княства Літоўскае (утворана ў 1230 г.)» (С.180). Прызнаюся, ня ведаў гэтае дакладнай даты, няма яе нават і ў «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі»... А чаму гэтак сьціпла пададзены такі важны помнік, як Полацкая Сафія – паўтары абзацы ўсяго і ня слоўца нават пра ідэялягічны сэнс, пра сымболіку хрысьціянскага храма?.. Гартаю далей і не разумею, чаму амаль нідзе не згадана, дзе захоўваецца той ці іншы помнік, існуе ці загінуў, альбо «пераехаў»... А вось – пра Грунвальдзкую бітву, дзе дзейнічалі «... войскі Польскага каралеўства і вялікага княства Літоўскага, а таксама наёмныя чэскія, украінскія, рускія атрады і татарская коньніца...» (С.193)... Не зьвяртаючы ўвагі на «руска-польскую вайну 1659 г.» (С.196) і іншыя «дробязі», спынюся на ілюстрацыі «Пакланеньне вешчуноў. Абраз з Дрысьвят. 1514» (С.208). На суседняй старонцы 209 ён ужо называецца «Пакланеньне трох каралёў»...

У разьдзеле «Беларуская графіка XIV-XVI ст.» чытаю: «Ад 6 жніўня 1517 г., часу, калі выйшла першая ў славянскім сьвеце кніга Францыска Скарыны, вядзецца адлік важных працэсаў і зьмен у культуры і мастацтве Беларусі.» (С.213). Сэнс выказваньня даволі цьмяны. Па-першае, можа сапраўды да 6-га жніўня і зьменаў ня было, і працэсы ня йшлі? Па-другое, ніяк не разабрацца мне з гэтым «славянскім сьветам», – калі маецца на ўвазе праваслаўе, дык праваслаўныя кірылічныя кнігі друкавалі нашмат раней і сэрбы ў Вэнэцыі і Фіёль у Кракаве, а пра каталіцкія выданьні лацінкай я ўжо не кажу. Калі ж гэта пра нешта іншае, СССР ці «Сообщество», то тады ўвогуле ўзьнікае падазрэньне, што Скарына свае першыя кніжкі друкаваў не ў «славянскім сьвеце», а ў нейкім, магчыма, іншым.

У кнізе старанна абмінаюцца віленскія помнікі: і готыкі, і рэнэсансу, і барока – усе, апроч аднаго толькі жанру нагробнай пластыкі. Чамусьці для аўтара дапаможніка надмагільлі Гаштальда ды Льва Сапегі цікавейшыя за Вострую Браму, Сьвятую Ганну ці касьцёл Пятра і Паўла...

XVII ст., сармацкі партрэт – ізноў загадкі. Чытаем: «... фігура Катажыны напаўзаслонена постацьцю Марыі. Кіруючыся рэалістычнымі традыцыямі флямандзкай мастацкай школы, І.Шрэтар імкнецца даць псыхалягічную характарыстыку сваіх гераіняў. У вобразах няма той заглыбленасьці, што характэрная для традыцый пашыранага ў XVII ст. параднага партрэту» (С.290). Калі нават прыняць тое, што Шрэтар сапраўды імкнецца даць псыхалягічную характарыстыку, што даволі спрэчна для сармацкага партрэта, дык усё адно, калі кажуць «заглыбленасьць», звычайна й маюць на ўвазе складаную псыхалягічную трактоўку вобраза. Нарэшце, каб разабрацца, пачынаю шукаць крыніцы. Вось спасылка ў бібліяграфіі: «У аснову кнігі пакладзены наступныя выданні: Всеобщая история искусств (Т.1-4, М., 1956-1963); Гісторыя беларускага мастацтва (Т.1-3, Мн., 1987-1989)»... і гэтак далей (С.397). Адкрываю другі том Гісторыі беларускага мастацтва і чытаю на старонцы 55: «фігура Катажыны напаўзаслонена постацьцю Марыі... Кіруючыся рэалістычнымі традыцыямі гэтай школы, Шрэтар імкнецца даць псыхалягічную характарыстыку сваіх гераіняў. У вобразах няма той заглыбленасьці ў сябе, што характэрная для традыцыйнага параднага партрэту». Вось яна разгадка – проста аўтар дапаможніка няўдала чыкнуў нажніцамі!

Чытаю далей: «... пліта, пастаўленая ў 1643 г. у памяць аб Яне Рудаміне Дусяцкім, кашталяне навагрудскім, які загінуў у баях з туркамі» (С.294). Правяраем. 75-я старонка «Гісторыі беларускага мастацтва»: ... пліце, пастаўленай у 1643 г. у памяць суседзяў і братоў Яна Рудаміна Дусяцкага... якія загінулі пад Хоцімам у баі з туркамі». Ну, невялікая памылка: усё адно Ян памёр, як і брат ягоны – Ежы Рудаміна, па якім і смуткаваў стары гусарскі харунжы...

Безумоўна, цікавая й сьвежая думка выказана на старонцы 305: «Вядомасьць беларускіх разьбяроў была вельмі вялікай. Іх запрашалі ў Рускую дзяржаву для выканання адказных работ. Асаблівае пашырэньне гэтая зьява набывае ў сярэдзіне – другой палове XVII ст., чаму спрыялі ня вельмі добрыя ўмовы (?! –В.А.) для рамесьніцка-мастацкай дзейнасьці на Беларусі. Разьбяры зь Беларусі працавалі ў Іверскім манастыры на Валдаі, Нова-Іерусалімскім манастыры на Істры, Новадзявочым манастыры ў Маскве, над упрыгожваньнем Каломенскага палаца пад Масквой. Іх дзейнасць аказала вялікі ўплыў на рускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва».

Хай прабачыць чытач за працяглую цытату, але яна спадабалася мне сваёй актуальнасьцю ў сьвятле палітычнай сытуацыі. А для аўтара гэта напэўна асабліва блізкая тэма, бо ён не аднойчы зьвяртаецца да яе: «Няспынныя ваенныя дзеяньні, разбурэньні значна памяншаюць будаўніцтва, прымушаюць майстроў пакідаць радзіму, ад'яжджаць у Рускую дзяржаву... Найбольшую вядомасьць беларускім майстрам прынесла будаўніцтва царскага Каломенскага палаца, іканастасы для Данскога, Сімянаўскага, Новаіерусалімскага, Валдайска-Іверскага, Сьвенскага і Новадзявочага манастыроў» (С.296). Заінтрыгаваны гэтакай папулярнасьцю нашых майстроў ды іхным уплывам на вялікую рускую культуру, вяртаюся да старонак, што прысьвечаны XVII ст. у Маскоўшчыне. Але, выбачайце, пра беларускі ўплыў там няма ані слоўца. Адзінае, што ўдалося адшукаць, гэта: «Развіццё рамёстваў, гандлю, пашырэньне сувязяў з дзяржавамі Захаду, натуральна, уплывалі на культуру Расіі...» (С.106). Баюся, гэта не пра нас... У чым жа справа? У тым, што гэты тэкст рэзаўся ўжо з маскоўскага падручніка.

Наступны прыпынак – старонка 346. «Найбольш значнай пабудовай зьяўляецца ўніяцкая царква Сьв. Сафіі ў Полацку (1738-1750). Гісторыя яе будаўніцтва і перабудоў завяршаецца менавіта Я.К.Глаўбіцам». Неяк не прынята ў нашым мастацтвазнаўстве так па-панібрацку пісаць пра нацыянальную сьвятыню. Зьвяртаюся да першакрыніцы: «Гісторыя беларускага мастацтва» (Т.2, С.229): «Найбольш значная яго пабудова – уніяцкая царква сьв. Сафіі ў Полацку... Старажытны праваслаўны Сафійскі сабор – гістарычны помнік Полацка...» і далей паўстаронкі пра ягонае значэньне і перабудову. Зноў нажніцы крыху падвялі. Замнога стрыганулі...

Яўген Шунейка

У КАНТЭКСЬЦЕ ЭЎРАПЕЙСКАГА І МЕСТАЧКОВАГА

Нарэшце выдавецтва «Беларусь» пасьля пяцігодкі дзяржаўнай незалежнасьці спарадзіла кнігу пра гісторыю мастацтва! Вось з чаго трэба было б пачынаць напачатку 90-х, а не зь ліквідацыі аддзелу мастацтваў, што выключыла зь дзяржаўнага пляну шмат падрыхтаваных альбомаў, манаграфіяў, каталёгаў. Дзякуючы фінансавай падтрымцы Фонду Сораса і актыўнасьці аўтара, вядомага віцебскага мастацтвазнаўца, які здолеў адчуць адпаведны момант і давесьці справу да канцавога выніку, ідэя ажыцьцявілася.

Полацкі Сафійскі сабор.

Б.Лазука невыпадкова звярнуўся да ідэі дапаможніка ў гісторыі мастацтваў, бо ён як выкладчык гэтага прадмету добра разумее, як хранічна не хапае новай інфармацыі ў гэтай неабсяжнай галіне ведаў. Старыя выданьні савецкага часу пра ўсеагульную гісторыю мастацтваў вельмі сухія і ідэалягізаваныя. Замежныя – недасяжныя за няведаньня моваў, на якіх існуе шмат сыстэматызаваных зьвестак у багата ілюстраваных фаліянтах ці больш кампактных даведніках, што ахопліваюць мастацкую гісторыю ад першабытных камянёў, да якіх дакраналася творчая рука краманьёнцаў, да апошніх твораў XX ст. у анты-традыцыйным кірунку. Таму першая кніга з гісторыі мастацтваў на роднай мове – карысны падарунак.

Але будзьма самакрытычныя. Радасьць набытку паступова суцішваецца, калі пачынаеш прагортваць старонкі. Быццам бы ўсё і адпавядае назову выданьня, але ёсьць пралікі. Мабыць сьпяшаліся тыя, хто рыхтаваў гэтую першую ластаўку. То раптам касьцёл Іль Джэзу з эпохі барока «пераскочыў» у эпоху Рэнэсансу, то Францыск I на вядомым партрэце пазірае ў адваротны бок – перавярнулі слайд... Можа хто й ня зьверне ўвагу, але каб толькі гэта выклікала усьмешку.

Увогуле вымалёўваецца не зусім збалянсаваная карціна. Рэпрадукцыі для такога кантэксту звычайна не адбіраюцца паводле прынцыпу сумяшчальнасьці, колераў і памераў, але – паводле эпахальнасьці, значнасьці, канкрэтнага месца ў гісторыі мастацтваў тых твораў і помнікаў, якія яны адлюстроўваюць. Ёсьць даўно вызначаныя Дваццатка, Трыццатка такіх шэдэўраў, якія нельга абмінаць. Аўтар жа абмінае...

Б.Лазука разглядае гісторыю мастацтваў не паводле стыляў, а паводле асобных краінаў, стагодзьдзяў. Памятаеце, у Грыбаедава, «Ах Франция, нет лучше в мире края...» Але ёсьць жа яшчэ й Чэхія, і Швэцыя, і Балгарыя, і іншыя краіны, якія таксама ўнесьлі свой уклад у разьвіцьцё эўрапейскага мастацтва. Няўжо і ў канцы XX ст. трэба карыстацца старымі меркамі. Маўляў, на Захадзе – Італія, на Ўсходзе – Расея. А калі каго не заўважылі – аўтар не вінаваты – «з прычыны недастаткова распрацаваных і вывучаных крыніц».

У гэтым выданьні ўпершыню беларускае мастацтва шырокім фронтам выйшла на міжнародную арэну. Паказалася з розных бакоў. Але крыху дзіўна, мяркуючы з храналёгіі: пасьля Францыі XVI ст. Толькі тады пачаўся першабытны лад на нашай зямлі, а калі нарэшце беларусы перажылі сваё XVI ст, то пачалося ў кнізе і мастацтва барока заходніх суседзяў, якіх ізноў напрыканцы «даганяюць» беларусы...

Хоць і недарэчы пра гэта казаць, але трэба. Задужа месца ў кнізе прысьвечана як Расеі, так і Беларусі. Яно б вока не рэзала, калі б ня той кур'ёзны дысбалянс. Напрыклад, гутарка пра мастацтва Францыі ці Англіі XVIII ст. вядзецца ў цэлым, а пра расейскае – дык тут і першая палова, і сярэдзіна, і другая палова XVIII ст. у асобных разьдзелах. А беларускае мастацтва ўвогуле разглядаецца ня толькі па стагодзьдзях, але й па відах. Вось і атрымваецца, што толькі ў беларусаў ёсьць дывановая кафля, мастацкае шкло, іканастасы і г.д.

Зусім не абавязкова дубляваць папярэднія выданьні пра беларускае мастацтва, але трэба ставіць новыя задачы: параўноўваць яго з творамі іншых краінаў і рэгіёнаў Эўропы. А то дзіўны дысбалянс працягваецца. Раней бачылі суседняе – ня ведалі свайго. Спрабуем бачыць сваё – ігнаруем тое, чаго нельга ня бачыць для стылёвага самавызначэньня. Варта было б для падмацаваньня прыкладаў візантыйскага, гатычнага, рэнэсансавага і іншых стыляў поруч з суседнімі даваць і беларускія матэрыялы. Карціна была б цэльная і больш канструктыўная.

Але гэткая кніга – першая. Таму раю ўсім набыць яе і чытаць. Акрамя карысьці нічога іншага яна не прынясе. І сам аўтар такі энэргічны і поўны задумаў, што сьледам за першай могуць зьяўляцца і наступныя яго працы, дзе ён можа ўлічыць недахопы і будзе трымацца вызначаных эўрапейскіх крытэрыяў – адбор галоўнага для карысьці агульнага.

Міхал Баразна

ЗЬНЕШНІ ВЫГЛЯД

Вокладка «Гісторыі мастацтваў» адразу ставіць гэтае выданьне ў шэраг даволі сур'ёзных, ды й таўшчыня блёку выклікае павагу аматара мастацтваў, асабліва калі кіраванцца непахіснай аксыёмай савецкай навуковасьці, што вартасьць гуманітарнай навукі вымяраецца кіляграмамі. Тэксты выглядаюць прыцягальнай і роўнай фактурай з датаў стварэньня помнікаў, назваў твораў і іх аўтараў і г.д. Нібыта, на першы погляд, усё выдатна. Але, праглядаючы ілюстратыўны матэрыял, пачынаеш забывацца, што ў Беларусі калісьці выдавалі аб'ёмістыя ілюстраваныя мастацкія кнігі і альбомы. Вядомыя «Іканастас Беларусі XV-XVIII ст.» і «Веткаўскі музэй» былі падрыхтаваныя яшчэ ў мінулым дзесяцігодзьдзі, а больш нічога сур'ёзнага апошнім часам не выдавалася.

На мой погляд, «Гісторыя мастацтваў» успрымаецца роўнай сярод сучасных аналягаў, пакуль не зазірнеш далей за тытул. Ані навучэнец, ані студэнт ня знойдуць у выданьні рэканструкцыі сабора Сьв. Сафіі ў Полацку XI ст., ёсьць толькі плян. Выкладчыку зноў давядзецца карыстаца самаробнымі адбіткамі і тлумачыць дзівакам, чаму сярод каляровых і чорна-белых карцінак няма нават дробнага малюнка першага мураванага помніка нашай краіны.

Мне здаецца, што ўвага аўтара і рэдакцыйнага калектыву павінна быць не дэкляратыўна ўсебаковай, а маштабна адлюстроўваць самыя высокія нацыянальныя прыярытэты. Ня ўсе чытачы далёка глыбяцца ў тэкставыя пошукі, таму нізка ілюстрацыяў павінна выглядаць кароткім і арыгінальным у форме канспэктам аўтарскай ідэі. Тым больш гэта важна ў такім выданьні, якое вымушае глядзець на мастацкую спадчыну Беларусі праз прызму шэдэўраў сусьветнай культуры. Між тым, замахнуўшыся на даволі высокі статус, выданьне загразла ў традыцыях савецкага правінцыяналізму, стаўшы чарговым «фардзонам» на беларускай цаліне канца стагодзьдзя. Можна доўга разглядаць бліскучыя ва ўсіх парамэтрах замежныя выданьні-аналягі, спасылацца на выкарыстаную літаратуру, але прафэсійнае майстэрства і разуменьне падбору ілюстратыўнага матэрыялу пра мастацтва прыходзіць толькі з практыкай і досьведам. На вялікі жаль, у краіне пэўныя прафэсійныя традыцыі не запатрабаваныя, забытыя.

Праўда, і раней мала хто з аўтараў сур'ёзна клапаціўся пра ілюстратыўны шэраг: выгляд здымкі, яе арыгінальнасьць, адпаведнасьць маштабаў, пасьлядоўнасьць, – усё гэта было нібы ў баку ад напісаньня рукапісу. Рабіўся стандартны кадраплян і хваляваў больш аб'ём, які ўплываў на суму ганарару. Добра, калі выдавецкія супрацоўнікі, фотамастакі надзеленыя прыродным пачуцьцём і прафэсійным досьведам. А калі не? Думаю, што многія аўтары, зьвязаныя з друкам, адзначаць тыповую рысу, калі прадстаўленыя здымкі без узгадненьня здымаюцца, альбо замяняюцца тым, што сам ніколі не адважваўся выкарыстаць.

Думаю, што ў гэтым выданьні мастацкае рэдагаваньне аказалася мэханістычным, як і само складань-не. Дый да болю надакучыла глядзець на адныя й тыя ж слайды архітэктуры, кафлі і г.д., якія дзесяцігодзьдзямі вандруюць з выданьня ў выданьне. Ня ведаю, калі зьявіцца магчымасьць карыстацца замежнымі фотаархівамі або самім здымаць для беларускіх выдавецтваў сусьветныя шэдэўры.

Збольшага выданьне сваім выглядам не адлюстроўвае сучасных падыходаў, і можна было абысьціся тэкставым беларускамоўным дадаткам да якога-небудзь іншага выданьня.

Алесь Шэд

Места над Продняй

Сьпёка й духота пакрысе адступілі. Сонца засталося ззаду. Роўна ды ўтульна гудзе рушту вялізнага Ikarus'а, але, калі прачнуўся, на сон ужо ня цягне. Зь цікаўнасьцю назіраю праз шыбы навакольле і лес па бакох ды празор шашы наперадзе. Амаль гадзіна як мінулі Доўск. Хутка й канец майму падарожжу, уборзе я пабачуся зь Ім, з маім настаўнікам і старым добрым прыяцелем і прамоўлю: «Як маесься, старэча?»...

Я тут не нарадзіўся, не вучыўся. Бацька мой маскаль. Дзед зь Пярмі, бабуля з Масквы. Рос я ў чыста расейскім Менску. Але ў мяне быў Ён. Была мая бабуля Сьцёпа, да якой я прыяжджаў з маленства «на папраўку». І дарма, што збольшага гадаваўся ў Менску — выхаваў мяне Ён. Таму, калі я атрымоўваў пашпарт, ваганьняў зь пятым радком не было. Апошнім часам я ўсё менш бываў тут, неўзабаве і зусім перастаў наведвацца. А потым памёрла бабуля...

Нарэшце, зьяўляюцца й першыя ягоныя адзнакі: завод жалезна-бэтонных вырабаў ды вялізны бэтонны слуп зь літарамі «Слаўгарад». Вось Ён, мой любы Прапойск, раскрываецца перада мной, бяжыць да мяне, вітаецца са мною. А я вітаюся зь ім.

Дарэчы, пра назву. Адвеку Прапойск быў Прапойскам, але ў 1945 годзе з цалкам уважлівых ды паважных прычынаў ды не бяз «просьбы працоўных» высокія маскоўскія «таварышчы» перайменавалі яго ў Слаўгарад. Слаўны, маўляў, горад. Рэч у тым, што за апошняй вайной пад Прапойскам сфармавалася савецкая дывізія, якой ну проста канечне было патрэбнае славутае найменьне. Такім чынам, шмат ёсьць местаў, што далі назовы дывізіям, але, здаецца, толькі адна дывізія дала назоў тысячагадоваму месту. Прапайчукі яшчэ не здагадаліся першымі ў Беларусі падтрымаць бальшавікоў. А то б звалося места Акцябарскі, а месьцічы — акцябратамі, ці акцябрыстамі, ці акцябранамі, ці яшчэ як.

Стары Маскоўска-Варшаўскі шлях неўзабаве пераходзіць у вызгібліві ланцуг цэнтральных вулкаў, што цягнуцца ўсьцяж усяго места ды за аўтастанцыяй зноў пераходзіць у шашу. Я заўжды еду да самае аўтастанцыі, хоць потым і даводзіцца ладна шыбаваць назад. Мінаю лячомніцу, могілкі, кірмаш, школу ды хаткі, хаткі, хаткі ў бязьмежным зялёным моры садоў, вышэй ад якіх узвышаюцца адно вярхоўкі царквы з званіцай на блакітным тле неба.

Неўзабаве выяжджаю на галоўны пляц. Уявіць сабе асяродак савецкае ўлады ў звычайным савецкім райцэнтры няцяжка: нязьменны гаёчак, паўз дарогу шыхтом універмаг, райвыканкам ды гасьцініца, непадалёк кінатэатар «Радзіма» ды будынак райкаму — апора камуністых у раёне. Усё як мае быць. Бабуля казвала маёй маці пра дэмакратычныя зьмены: «Што ты, доня, тыя камуністы з райкаму усе чыста сядзяць цяпер у райвыканкаме!» І, вядома ж, пасяродку — вялізманны пляц для дэманстрацыяў, на якім, хочаце верце, хочаце — не, няма й ніколі ня было, як, зрэшты, і ва ўсім Прапойску, помніка правадыру сусьветнага пралетарыяту.

Па пляцы шаша збочвае налева, але мне б можна было сыходзіць і тут — проста наперад цягнецца вулка, што вядзе ў, так бы мовіць, стары Прапойск, мой Прапойск. У празоры яна зьліваецца зь небам ды падаецца іначась за чэрыкаўскі гасьцінец. Насамрэч жа яна абрываецца ці ня проста ў Проню. І выпадала, што машыны на ўсёй хуткасьці адмячалі свае апошнія дваццаць мэтраў стромка далоў да Проні. Мала дапамагаў і знак «STOP», што паставілі тут па колькі гэткіх выпадках. Калі ж небарака ўчасна спыняўся, дык, напэўна, нядоўга лаяўся. Напэўна, ён проста змаўкаў, зачараваны, прыціснуты невымоўна пекным краявідам, якога вам, магчыма, і бачыць не даводзілася. Далавах, пад самым абрывам зьліваюцца срэбнаводная, чыстая, што крышталь, з скрозь пяшчаным дном Проня ды цёмны, самавіты, з хуткай плыньню ды вірамі, вельмі глыбокі тут Сож. А далей, амаль да далягляду — паплавы. На самым жа далягляндзе няпэўнай рысай сінее лес, перад якім, на беразе ледзь бачнага адсюль Сажа, прытулілася вёсачка Крымянка. Колькі разоў бачыў я ўсё гэта, а ўсё ня магу глядзець на гэты краявід спакойна. Цяпер тут зрабілі значна пахонейшы схіл, уладкавалі сюды аўтастаянку, карацей — мескі пляж. А на найнебясьпечнае месца прыцягнулі немаведама адкуль велічэзную марскую карцьвігу. Прапайчукі і тут не разгубіліся. На маўклівыя пытаньні ў вачох нетубыльцаў іранічна кажуць: «Дык марскі ж горад!»

А ля самога абрыву налева — мой родны Кухар, цяпер вуліца МЮД. Цяпер Кухар ужо ня той, што раней. Цяпер, прайшоўшы па ўсёй вуліцы, часьцяком і не сустрэнеш нікога. Старыя памёрлі, маладыя паразьехаліся хто куды, дамы прадалі. Цяпер тут шмат пабудавана новых хатаў ды жыве багата новых людзей. Вось, нарэшце, і яна, маленькая бурнатая хатка зь вялічэзным вязам у маленькім штахетніку. Так, цяпер хатка пустая, пусты маленькі гародзік зь яблынямі, сьлівамі, вішняй. Адно шуміць сваімі вялізамі-вязамі роў за гародам. Пуста. Хатка вымерла. Вымірае й Кухар. Яшчэ засталіся «аўтахтоны», але што тут будзе празь дзесяць гадоў?..

А што будзе з ўсім Прапойскам? Адзін Бог ведае. Чарнобыль зламаў тут жыцьцё. Прапойск ужо ня той. Гэта асабліва бачна таму, хто бачыў яго вясёлым ды здаровым. Розьніца страшэнная. Людзі, што цяпер жывуць тут — збольшага не прапайчукі. Гэта навакольныя вяскоўцы, якіх перасялілі сюды на месца тубыльцаў, што перасяліліся ў Менск, Магулёў (як кажуць прапайчукі), ды далей — у Амэрыку, Ізраіль. Да вайны Прапойск быў на тры чвэрці жыдоўскім мястэчкам. Пасьля вайны жыдоў значна паменела, і вось рэшткі зьехалі цяпер. Прапойск нібы кажа: «Мне блага, я хворы, я магу памерці». А можа, гэта я сумую па сваім страчаным назаўжды дзяцінстве?

Цікава, што амаль усе прозьвішчы гэнага краю — «маскоўскія». Клюевы, Кручковы, Ганчаровы, Авечкавы, Явульевы, Чачоравы, Бондаравы... і, вядома, мы, — Шэдавы, ці проста Шэды. Маіх родзічаў, Шэдавых у Прапойску процьма. Калісьці, яшчэ, мо, за Рэччу Паспалітай, прыйшлі Шэдавы з Маскоўшчыны ў Беларусь ды аселі трыма сем'мі на Прапойшчыне. Адна сям'я пасялілася ў самым Прапойску. І цяпер яны тут усталяваліся назаўсёды. Прынамсі, так падавалася...

... Я йду ва ўлюбёнае сваё месца, куды мяне заўжды цягне, калі трэба пабыць на самоце, падумаць, ці, наадварот, пазбавіцца ўсіх думак, што ціснуць сэрца. Я йду ў гай. Ён тут побач. Ён пакрывае замчышча ды ўсе навакольлі. Прывітаньне табе, гай. А ў адказ — адвечны спакой ды строгае, паважнае харство, якое парушае адно вецер у вярхоўках дубоў, вязаў, ліпаў. У гаі амаль нікога ніколі не бывае. Іншым разам робіцца на't трохі жудасна. І вось нарэшце па адзінай дарозе ўваходжу ў самае замчышча. З усіх бакоў тут стромкія схілы, а з усходу, з боку Сажа і зусім ужо прастападная Продня на дваццаць адзін мэтар. Адсюль зарэчанскі від края яшчэ прыгажэйшы. Тут і стаяў калісьці горад, замак, палац. Рэшткі палацу заставаліся амаль што да нашых дзён, але пасьля апошняе вайны замк, як звала яго бабуля, што пражыў татараў, казакаў, швэдаў, маскалёў ды немцаў, быў расьцягнуты тубыльцамі па цаглінах — трэ' было адбудоўвацца... Замка ў Прапойску ўжо няма...

Празь яругу перабіраюся да царквы Растава Багародзіцы, якую пабудавалі ў 1793 на загад Аляксандра Галіцына, што атрымаў гэтыя землі ад Кацярыны II. Царква ў стылі клясыцызму, што запанаваў у Беларусі разам з расейшчынай. Са схову бульбы гэны будынак зноў зрабіўся культавым храмам. Дарэчы, тутэйшы поп, айцец Міхал, — у цесных дачыненьнях з прапойскай радай БНФ. Гляджу я на вялікі гмах царквы ды думаю, што сюды больш пасавала б наша віленскае барока. А помнікі беларускай архітэктуры былі тут, інакш і быць не магло. Цяпер жа невядомае нават месца, дзе стаяў кляштар, вядомы тым, што менавіта там напрыканцы XV ст. памёр славуты цьверскі купец, вандроўца за тры моры Апанас Нікіцін.

Па старой памяці залязаю на званіцу, зь якой бачнае амаль што ўсё места. Бывала, малы залязаў сюды з прыяцелямі, сядзелі наверсе, гулялі ў карты ды баўбаталі аб усім.

Засталося наведаць апошняе, сумнае, месца — могілкі. Тут амаль што побач. Ад царквы дном яругі міма лазьні, потым уздым на гару ад Сажа — і вось яны. Вось і месца Шэдавых. А вось і зялёны крыж. Мой стрыечны дзядзька хоча ўборзе зрабіць на крыжы жалезную шыльду: Шэдава Сьцепаніда Пракопаўна, 1913-1993.

Ну, вось і ўсё. На аўтастанцыю трэ' йсьці праз усё места. Выходжу на шашу й бачу вялікі чырвоны IKARUS, што робіць канец у Менск. Гэта удача. Седакоў небагата. І апошні раз азіраючыся назад на Прапойск, з сумам разважаю, што істыя прапайчукі —іранічныя, вясёлыя, дасьціпныя. Без замаху аднак на дасьціпнасьць, сыходзяць бясьсьледна. Людзі ўжо іншыя, ужо нешта ў іх зламана й страчана назаўжды. І ці застанецца ў будучых геаграфічных мапах места Прапойскае?...

Немаведама да чаго прыгадваю, што рэчка Проня звалася раней Продня. Вядома, здаецца, чаму. І як Берасьце — места-над-Бугам, так, выходзіць Прапойск — места-над-Продняй. Места над продняй.

Севярын Квяткоўскі

У Бандэрштаце

Рок-н-рол — увасабленьне руху насуперак. Ён нараджаецца й паўнавартасна жыве ва ўмовах супрацьстаяньня — культурнага, сацыяльнага, нацыянальнага, палітычнага, маральна-этычнага ці якога іншага. Напрыканцы 80-ых ўсе гэтыя акалічнасьці вельмі ўдала сышліся ў адной кропцы — Львове, які прагрымчэў па усім былым «сэрусэру» (сэсэсэру, па-нашаму) сваімі рок-камандамі, найперш — «Братамі Гадзюкінымі». «Гады» скарылі слухачоў непаўторным спалучэньнем гратэскавага рытм-энд-блюзу зь неперайманальна «адмарожаным» вакалам лідара гурта Сяргея Кузьмінскага, які даносіў са сцэны вобразы навакольнага сьвету з гледзішча «простага западэнскага хлопца»: паваеннага хутараніна, рабочага, наркамана, гопніка і г.д. Разам з кіеўскімі «Воплямі Відаплясава» яны сфармавалі аблічча зьявы, якая завецца ўкраінскім рок-н-ролам...

Да Львова я ехаў з краіны, якая пачала перажываць рок-н-рольны рэнэсанс. У нас запанавалі такія грамадзка-культурныя ўмовы, у якіх нават абсалютна асацыяльная «хайрастая», «лысая» й іншая заангажаваная рок-н-ролам публіка пачала праяўляць грамадзкую рэфлексію, апазыцыяваць на культурным (і ня толькі) узроўні. Пра гэта сьведчаць папулярызацыя новых і адроджаных старых хітоў вядомых менскіх гуртоў: «Лукашенко», «Партызаны», «Беларусь убэр алес», «Прэзыдэнт, ідзі дамоў», «Я воль, май фюрэр»...

Першым, што я пачуў па прыездзе ў Львоў, была зьвестка пра поўны й канчатковы сыход «Братоў Гадзюкіных» у гісторыю. Другім — тое, што галіцкі рок-н-рол «жыве й перамагае». А паколькі «м'ечта зов'ёт м'еня впер'ёт», мы дамовіліся з мэнэджэрам гурта «Мэртвы Півэнь», аднога зь сёньняшніх улюбёнцаў львоўскай рок-публікі, аб сустрэчы для абмеркаваньня ваяжу гурта ў Менск.

«Стрілку заб'ілы» на «стомэтроўцы» ля помніка Шаўчэнку. Пакуль чакаў, паставіў свой подпіс у адозве за вызваленьне ўкраінскіх грамадзянаў, якія ўтрымоўваюцца ў менскай вязьніцы. Збор подпісаў зарганізаваны, натуральна, УНА-УНСО. Праз гэта прыгадаў дзьве гісторыі аб узаемадачыненьнях гэтай арганізацыі з украінскімі рокерамі.

Адна зь іх адбылася ў Кіеве. Сабраліся хлопцы зладзіць канцэрт. Ня тое каб вялікі — бяз спонсараў, рэклямы й г.д., — чыста для душы. Дамовіліся наконт залі, апарату й сьвятла... І вось, за суткі да канцэрту да іх прыйшлі мясцовыя «брыгадоўцы» й запатрабавалі «падатак» за правядзеньне камэрцыйнай, як яны меркавалі, дзейнасьці на іхнай тэрыторыі. А паколькі ў рокераў двух тысячаў даляраў не знайшлося, у іх «пазычылі» ўсю апаратуру. Хлопцы з роспачы ўзялі ды затэлефанавалі ў кіеўскую штаб-кватэру УНА-УНСО. Там толькі запыталі, якой моваю маюць сьпяваць выканаўцы, занатавалі каардынаты й паабяцалі разабрацца. На наступны дзень два збляднелыя «брыгадоўцы» ледзь не на каленах вярнулі арганізатарам канцэрту ўсё забранае. Перад сыходам яны змаглі адно вымавіць: «Хлопцы, мы ўсё разумеем, але навошта ж людзей забіваць?!»

Другая гісторыя зьвязаная зь львоўскай камандай «Плач Ерэміі». Яна ня скончаная дагэтуль. Лідар «Плачу» Тарас Чубай, сын рэпрэсаванага за савецкім часам вядомага ўкраінскага паэта Грыгорыя Чубая, узяў і сьцебануўся з украінскіх «урапатрыётаў». Адзін час ён жыў у кватэры, вокны якой выходзілі акурат на «стомэтроўку». Помнік Шаўчэнку натхніў яго на тэкст аб тым, што ён, Тарас, любіць Шаўчэнку, бо той Тарас, як ён, паэт, як ён, пясьняр, як ён, украінец, як ён, «я іх бін украінэць», «зік хайль, жыве Ўкраіна», «айм соры»... УНА-УНСО ўзяло й пакрыўдзілася, і абвясьціла «Плач Ерэміі» пэрсонай нон-грата ў

Працяг на старонцы 24

Адам Глёбус

Каралеўства Буды

ТАЙЛЯНДЗКІЯ ПАДАРОЖНЫЯ СЬПІСЫ

Працяг. Пачатак ў №10

Жоўтае і залатое...

Традыцыйна склалася: жоўтымі, залацістымі, залатымі робяцца купалы сабораў, кароны каралёў, сымбалі імпэрыяў, нацельныя крыжы і заручальныя пярсьцёнкі.

Асабліва мне вельмі імпануюць жоўтыя вочы гладка-чорнай коткі.

У Тайляндзе лёгка пераконваесься, твар у Буды і сапраўды залаты.

Сапраўдна-жоўты амлет, прыгатаваны зь цёмных сялянскіх яек, асабліва апэтытна выглядае на сіняй, шкляной, шырокай талерцы. Менавіта такіх талерак бракуе ў Тайляндзе.

Беларускія, красавіцкія, жоўтакрылыя матылькі вельмі сьвяточна глядзяцца над апошнімі лапікамі лясного сьнегу.

Кашуля выпадкова сустрэтага ў лесе раварыста мае даволі ветлівы выгляд, калі яна пяшчотна-жоўтая, амаль белая.

Жоўты — ідэальны колер апалае лістоты.

Залацісты мусібыць мураш, тады яго шкода забіць.

Сьпякотнае...

Выгляд пустой пяшчанай дарогі, якая ўздымаецца праз поле, на груд, да бляклага неба, утварае адчуваньне пякельнае сьпёкі. Наагул слова «пекла» звычайна вымаўляецца пасярод пыльнай дарогі.

Сьмешнае...

З чужых ўпэўненасьцяў і сур'ёзнасьцяў людзі любяць пасьмяцца. Усьміхаюцца й проста з чужога й чужых.

Усьмешка найлепшая абарона пры сустрэчы з малавядомым.

Стары чалавек любіць загадзя пакпіць з кепскай будучыні, нібыта гэтым ёй адгародзіцца ад немінучае катастрофы.

Вельмі непрыемна пачуць за сьпінаю перашэпты, перамовы й нарэшце пералівісты сьмех рэстарацыйных бангкоцкіх афіцыянтак, якія, адсьмяяўшыся, працягваюць цікаўна зіркаць у мой бок. Адкуль я мог ведаць, што суп будзе такі кіслы і адна лыжка перакрывіць мой твар да такой ступені, каб выклікаць сьмех афіцыянтак на цэлы вечар.

Наагул сьмех у далёкай краіне нараджае неадназначную рэакцыю, ня варта адразу да яго далучацца, зрэшты, гэтага не атрымаецца, каб і хацеў.

Вось чалавек, зь якім сустракаесься ў гатэльным ліфце, другі раз міжволі прымусіць дабразычліва ўсьміхнуцца, ён нібыта знаёмы, свой. А калі сустрэнеш трэці раз, дык вітаесься, і ён робіцца ледзь не сваяком.

Так атрымваецца, што беларус у Каралеўстве Тайлянд кожнаму расейцу сваяк. Расейцы самі так і гавораць, беларусы пасьміхаюцца, пагаджаюцца, хоць самі так ня думаюць, не гавораць і імкнуцца паціху перасяліцца ў гатэлі да чэхаў, палякаў, да немцаў, абы далей ад расейцаў.

Калі слухаеш размову двух пасрэдных літаратараў пра ўласную веліч, робіцца сьмешна. Толькі лепш тую ўсьмешку хаваць.

Далей будзе.

У Бандэрштаце

Працяг са стар.23

цяпер гурт ратуе толькі вялікая папулярнасьць.

У Менску немагчымая ні першая, ні другая гісторыі. Напэўна датуль, пакуль Францішак Скарына ня зьменіць «чорнага стода» перад Домам Ураду...

Львоў з падачы «Гадаў» мае сваю слэнгавую назву — Бандэрштат. У Львове я быў упершыню, таму моцна ўразіўся праз тое, што «гадаўскія» пэрсанажы: «чувакі», «наркаманы на гародзе» й іншыя «хлопцы з Бандэрштату» сапраўды існуюць тут, на гэтых старажытных вузенькіх вулках, што поўняцца цудоўнай «западэнскай» украінскай мовай і безьліччу сьмецьця. У Львове ўзьнікае ўражаньне, што ён палова на палову абітуецца гопнікамі й артыстамі. Непаўторныя панкавыя адценьні львоўскага рок-н-ролу не маглі ня ўзьнікнуць на гэтым кантрасьце, побач з той велізарнай гарою сьмецьця, якая, калі верыць самай папулярнай у горадзе газэце «ПостПоступ», сьмярдзіць ужо больш за год. Сьмярдзіць не абы дзе, а побач з мэрыяй, у цэнтры Старога гораду...

Але трэба зазначыць, што, нягледзячы на рэшткі савецкіх звычак, галічаны робяць кРокі разам з астатнім сьветам. А сьвет, як вядома, лагаднее, прынамсі, у той частцы, на якую хочацца зважаць з боку Львова. А гэта значыць, што ў прасторы сярэднеэўрапейскага міжмор'я цэнтрам сапраўднага супраціўнага рок-жыцьця робіцца Менск...

Урэшце, мы маем магчымасьць для параўнаньняў. Ужо цяпер слухачы менскага Радыё 101,2 час ад часу могуць знаёміцца зь некаторымі ўзорамі ўкраінскага рок-н-ролу. А неўзабаве Менск мусіць наведаць адзін зь лідараў львоўскога рок-клюбу — «Мэртвы Півэнь». Як бы там ні было, у Львове, у адрозьненьне ад Кіева, да Беларусі ўвогуле і да беларускай рок-музыкі, у прыватнасьці, вельмі вялікая цікавасьць. І ў аргкамітэце вядомага ўсеўкраінскага рок-фэстывалю «Альтэрнатыва», і на найпапулярным у Львове й Кіеве «Радыё Люкс» і ў іншых музычных асяродках у мяне вельмі прасілі запісы беларускіх выканаўцаў...

Бандэрштат — хітовая назва. Яна падкрэсьлівае прызнаньне. Па вяртаньні дадому я ўпэўніўся, што сапраўднае раскрыцьцё Менску жыхарамі й іншым сьветам яшчэ наперадзе. Але ўжо сёньня з упэўненасьцю можна сьцьвердзіць, што пры любых абставінах наш горад ня будзе звацца Лукасранскам.

пытайцеся ў шапіках "Белдруку" і ў прыватных распаўсюднікаў, а яшчэ лепш — выпісвайце

НЕЗАЛЕЖНЫ ТЫДНЁВІК
НАША НІВА



наш індэкс 63125
Падпіска праз недзяржаўную сетку дастаўкі — тэлефон 29-22-10 (Цыбульскі Леанід).

ФОТА-ЗАГАДКА

Гэтым разам мы падводзім вынікі конкурсу, які публікаваўся ў пяці ранейшых нумарах тыднёвіка. Галоўны сакрэт у тым, што конкурс быў прымеркаваны да 5-й гадавіны аднаўленьня «Нашае Нівы». Найбольш уважлівыя чытачы пра гэта здагадаліся, бо ўсе геаграфічныя кропкі, якія былі прадстаўленыя на фотаздымках, зьвязаныя з геаграфіяй дзейнасьці»НН».

1. Менск. Балюстрады парку імя Янкі Купалы з боку праспэкту Скарыны. Менавіта ў гэтым парку адбываліся першыя нарады калектыву, які ў траўні 1991 году склаў рэдакцыю «НН». У Менску «НН» друкавалася з 1992 году — №6,7,8,9 (Менская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка»), №10,11 (друкарня «Менскпраект»), з №12 за 1993 і да канца 1995 — у друкарні выдавецтва «Беларускі Дом Друку». З сакавіка 1996 году рэдакцыя «НН» разьмяшчаецца ў Менску, на вуліцы Пуліхава, у доме, дзе жылі Пімен Панчанка, Барыс Сачанка, Янка Брыль ды багата асобаў з палітычнае й культурнае намэнклятуры Беларусі мінулае эпохі.



2. Магілёў. Станіславаўскі касьцёл, былы касьцёл закону кармэлітаў, 1738-1788 г. Гэтаму касьцёлу, а дакладней рэстаўрацыі ягонага інтэр'еру, была прысьвечаная палеміка на старонках «НН» ў №8-9 і 11 за 1994 г. Магілёву быў прысьвечаны спэцыяльны нумар «НН», фундаваны магілёўскаю радаю БНФ, і невыпадкова, бо з Магілёву мы заўсёды адчувалі істотную інтэлектуальную ды фінансавую падтрымку. У Магілёве адбыліся дзьве прэзэнтацыі «НН» пры ўдзеле рэдакцыі і нашых аўтараў, наладжаныя Анатолем Фёдаравым. У Магілеве «НН» выходзіла ў 1991 годзе (друкарня МАУ — №2,3,4,5).

3. Вільня. Касьцёл Сьв. Кацярыны, 1619-1773 г., вуліца Віленская. Здымак гэтае бажніцы «НН» зьмяшчала ў N2, 1991. У двух кроках ад яе (дзе сёньня міжнародні перамоўны пункт і Міністэрства сувязі Летувы) быў дамок, дзе знаходзілася рэдакцыя «НН» у 1908-1910 г. Крыху далей на вуліцы — дом №14, дзе жыў Янка Купала ў 1914-1915, тутака ж месьцілася рэдакцыя «НН» у 1915 годзе, дзе быў зроблены апошні нумар купалаўскае «НН» (чытай «НН» №2, 1991). З 1991 да 1995 рэдакцыя «НН» разьмяшчалася на вуліцы Жыгімонтаў (Zygimantu, 12/2). Сёньня «НН» друкуецца ў друкарні «Lietuvos Rytas» у Вільні.



4. Баранавічы. Будынак на плошчы Леніна. У гэтым будынку разьмяшчаецца фотаатэлье, дзе былі зробленыя ілюстрацыі першага нумару адноўленае «НН». Насупраць, зьлева — друкарня, у якой 26 траўня 1991 году выйшаў першы нумар адноўленае «НН». У Баранавічах нарадзіўся і выдавец «НН» Павал Жук.

5. Віцебск. Беларускі тэатар імя Якуба Коласа. Тут у лістападзе 1992 году адбылася вечарына «НН», якую нападзіў Уладзімер Арлоў. «НН» двойчы рабіла сустрэчы ў Віцебску з чытачамі і сябрамі «НН». Фонд «НН» у Віцебску прадстаўляе Ларыса Міхневіч. Апошні візыт у Віцебск рэдакцыя «НН» зрабіла водным шляхам у жніўні 1995 году. Віцебску быў прысьвечаны №6 за 1995 год.

Мы атрымалі вялікую колькасьць водгукаў і допісаў з усіх канцоў краіны. Дзякуй ўсім! Нават Сяргей Навумчык на выгнаньні знайшоў хвіліну, каб патэлефанаваць з Варшавы і паведаміць разгадку. Аднак першы слушна і поўна на ўсе загадкі адказаў мянчук Аляксей Фралоў. Віншуем! Сярод фіналістаў таксама Андрэй Коржыч з Гомелю і Каваленка В.М. зь Менску. Рэдакцыя рыхтуе для пераможцаў абяцаныя прызы, пра якія мы паведамім у наступным нумары. Таксама ў наступным нумары мы надрукуем умовы чарговага конкурсу. Сачыце...

Здарэньні

У цемрадзі ночы

Два жыхары Літвы, што ехалі ў Менск на двух аўтамабілях, спыніліся пры кавярні непадалёк ад кальцавой дарогі для адпачынку. Але не пасьпелі яны выйсьці з машынаў, як да іх падскочылі чацьвёра ў масках зь пісталетамі ў руках. Яны абшукалі кожнага з замежных гасьцей, забралі паўтары тысячы даляраў, зьнялі новую скураную куртку ды залаты ланцужок. З машынаў павыцягвалі магнітолы ды аўтамабільны лядоўнік. Загрузілі бандыты гэта ўсё ў свайго «Жыгуля» ды зьніклі ў цемрадзі ночы.

Патрыёты

Паколькі Беларусь не бярэ з расейцаў платы за транзыт ды эксплюатацыю сваіх дарогаў, то гэтым вырашылі заняцца прыватныя асобы. Каб аднавіць, так бы мовіць, справядлівасьць. Калі жыхар Іжэўска ехаў Маскоўскай шашою, у яго каля вёскі Вялікая Ўхалода, што на Барысаўшчыне, сапсаваўся рухавік. Ён спыніў свайго «Жыгуля» ды заняўся рамонтам. Раптоўна да яго пад'ехаў «Опэль», зь якога выйшлі тры хлапцы. Яны запатрабавалі ў расейца 100 нямецкіх марак за эксплюатацыю беларускага ўчастка трасы. Словы расейца пра агульную мытную прастору, славянскую еднасьць ды «нуляві варыянт» не падзейнічалі. Давялося растраціцца. Неўзабаве міліцыя затрымала «падатковых інспэктараў», якія аказаліся студэнтамі зь Менску.

Трэба было таньней

У Віцебску супрацоўнікі КГБ затрымалі прафэсара, загадчыка катэдры тамтэйшай Акадэміі Вэтэрынарнай Мэдыцыны. Прычынай затрыманьня было тое, што прафэсар вымагаў хабар за добрыя адзнакі на іспытах. Ад двух студэнтаў, што ня здолелі своечасова пагасіць акадэмічную запазычанасьць за кожную пяцёрку ён запатрабаваў па 120 даляраў. Тыя палічылі, што кошт занадта высокі ды зьвярнуліся па дапамогу да «жалезных фэліксаў». Так, прынамсі, выглядае справа на паверхні. Але зыходзячы з досьведу падобных ранейшых выпадкаў у краіне, можна выказаць іншую вэрсію. Прафэсара проста падставілі, бо некаму спатрэбілася «хлебнае» месца, альбо ён проста не падзяліўся з кім трэба.

Начная перастрэлка

Жыхар Мсьціслаўя, нагледзеўшыся ў відэа танных заморскіх баявікоў ды расейскай чарнухі, адчуў сябе «крутым» і вырашыў патруляваць на вуліцах начнога места. Балазе меў самаробны малакалібравы пісталет. У адным месцы ён вырашыў паказаць сваю «круцізну» перад позьнімі мінакамі. Але побач апынуўся лейтэнант мясцовага райаддзелу міліцыі. Таму не спадабаўся самазваны канкурэнт і ён вырашыў яго затрымаць. Але «круты мужык», вырашыўшы, што ў лейтэнанта ў кабуры адно цыбуля на закуску, стралянуў, каб запалохаць, з свайго пугача. У адказ атрымаў дзьве кулі з сапраўднага табэльнага «Макара», якія патрапілі ў плячо ды паясьніцу. Нягледзячы на раненьні, «круты» здолеў уцячы. Быў падняты на трывогу ўвесь райаддзел міліцыі. Крывавы сьлед прывёў перасьледнікаў у лазьню, дзе хаваўся падстрэлены парушальнік.

Каратэ бандыту не перашкода

У Талачыне таксама былі ахвяры начнога прагляду «відзікаў». А 5-ай гадзіне раніцы, карыстаючыся тым, што міліцыя ўжо сьпіць пасьля начнога дзяжурства, а паспалітыя грамадзяне губляюць пільнасьць з прычыны таго, што нармальныя злодзеі звычайна нападаюць увечары ці ўначы, на «паляваньне» выйшлі тры маладзёны. Яны перанялі на вуліцы мінака ды, пагражаючы нажом, зьнялі зь яго джынсавую куртку, чаравікі ды забралі вацок з грашыма. На дапамогу пацярпеламу з крыкам «кія!» падскочыў менскі студэнт — знаўца ўсходніх адзінаборстваў. Рабаўнікі не спужаліся і, пакуль каратыст махаў нагамі перад носам аднаго з злачынцаў, другі хаўрусьнік усадзіў яму нож у сьпіну.

Далавіліся

Падчас чарговай праверкі на вадасховішчы Пціч рыбнагляд зьвярнуў увагу на занадта вялікую колькасьць рыбы, што плавала дагары пузам. А на бэразе сядзеў мужык з вудай ды сачком. Пры праверцы ў вуды замест лёскі аказаўся сталёвы дрот, што злучаўся з гэнэратарам высакавольтнага напружаньня. Тыповы прыклад электравуды. Інспэктары затрымалі браканьера ды ўважліва агледзелі ўсё навокал — ці не ўсплыло разам з рыбай колькі «вадалазаў». Бо пару тыдняў таму на Менскім моры ўжо патануў адзін браканьер, які рыбачыў сеткамі. Мо' таксама з электрычным ухілам.

Навасельле з праблемамі

Нядаўна жыхары вуліцы Маякоўскай, што ў Менску былі сьведкамі масавага перасяленьня міліцыянтаў Белпалка з вуліцы Грушаўскай на сваю новую базу побач з камвольным камбінатам. Па вуліцы адзін за адным праносіліся грузавікі з асабовым складам. Некаторыя мінакі ды пасажыры грамадзкага транспарту ажно казалі, што зноў ловяць БНФ. Але міліцыянты проста пераяжджалі. Прыехалі яны, пачалі разьмяшчацца на новым месцы, сьмецьце прыбіраць, дрэўцы садзіць. Але пры капаньні зямлі знайшлі шэсьць 100-мілімэтровых артылерыйскіх снарадаў часоў Другой сусьветнай. Сапэры вывезьлі ды абясшкодзілі іх, а празь дзень адкапалі яшчэ тры. Зьнішчылі й гэтыя. Упарадкаваньне новай базы давялося прыпыніць. Цяпер, пакуль усю тэрыторыю не перакапаюць, не супакояцца. ЦРУ, масоны ды амэрыканскія фонды ў тэракце не падазраюцца.

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5000 Нумар падпісаны ў друк 26.5.1996 Надрукавана ў ЗАТ "Lietuvos Rytas" (Вільня, праспэкт Гедыміна, 12а)